Дыферэнцыяваная аплата за электраэнергію пачне дзейнічаць не раней, чым у наступным годзе. Аднак ужо зараз можна вызначыць пэўныя пазіцыі бытавых прыбораў, якія дапамогуць дасягнуць эканоміі электрычнасці. СТАР 3

Акрамя гісторыі, асаблівым гонарам Навагрудчыны з'яўляюцца прамысловыя прадпрыемствы. Некаторыя з іх добра вядомыя не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. СТАР 4-5

Я шмат разоў бачыла і люблю мора. Люблю плыць адна і адчуваць еднасць з Сусветам. Такое магчыма толькі ў моры, калі вакол бязмежнасць і бясконцасць, і сам ты — частка гэтай бясконцасці. СТАР 7

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

15 ВЕРАСНЯ 2012 г. СУБОТА № 179 (27294) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

■ Ва ўрадзе

ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ ТРЭБА АЦЭНЬВАЦЬ ПА ЯКАСЦІ, А НЕ ПА КОЛЬКАСЦІ

Менавіта такі прынцып узялі на ўзбраенне ва ўрадзе датычна эканомікі. Яго агучыў прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч на ўчарашняй прэс-канферэнцыі. Зыходзячы са зместу адказаў кіраўніка ўрада на пытанні журналістаў, падобна на тое, што дзяржава пераходзіць да гульні амаль па выключна рынкавых правілах. Кагосьці, вядома, будуць падтрымліваць, але лёгкіх грошай больш не дадуць. Міхаіл Мясніковіч даволі даходліва гэта растлумачыў. Арыентацыя толькі на якасць. Ніякіх пагоняў за валавымі паказчыкамі...

ПРА СТАБІЛІЗАЦЫЮ І СУСВЕТНЫЯ ЗМЯНЕННІ

«Галоўнае, што мы стабілізавалі эканоміку на сучасных рынкавых прынцыпах як на валютным рынку, так і ў межах эканамічнага развіцця, — лічыць прэм'ер-міністр. — Разам з тым застаюцца яшчэ пэўныя пытанні, якія, безумоўна, хвалююць і ўладу, і простых людзей. І зараз трэба думаць пра будучыню, калі нейкі пункт незвароту ўжо пройдзены. Збалансаванае развіццё ў 2012 годзе і прагнозы на 2013 год даюць магчымасць казаць, што стабілізацыя забяспечана. І нам тут не патрэбны ніякія аванцюры. Аб усім гэтым урад днямі дакладваў Прэзідэнту».

ПРАГНОЗНЫЯ ПАКАЗЧЫКІ НА 2013 ГОД

«Яны вельмі высокія і вельмі складаныя. Запланавана ўвядзенне ў эксплуатацыю 6,5 млн кв. м жылля. Такія аб'ёмы не ўводзіліся нават у лепшыя гады.

СТАР 2

■ «Прамая лінія»

Усе пытанні грашова-крэдытнай палітыкі

19 верасня 2012 года з 11.00 да 12.00 у рэдакцыі нашай газеты адбудзецца «прамая лінія» з удзелам **старшыні праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь Надзеі Андрэеўны ЕРМАКОВАЙ.** Калі вас хвалююць пытанні стабільнасці курсу беларускага рубля, захавання ўласных зберажэнняў, працэнтаў па ўкладах і крэдытах і любыя іншыя аспекты грашова-крэдытнай палітыкі нашай краіны — тэлефануйце!

Задаць пытанне падчас «прамой лініі» можна будзе па тэлефонах **8 (017) 292 38 92 і 8 (017) 292 38 21.** Папярэднія пытанні дасылайце на электронны адрас рэдакцыі **info@zvyazda.minsk.by.**

ЛЕС — ГЭТА ЖЫЦЦЁ...

Лес — гэта храм: у ім ажываеш і мацнееш душою. Гэта здароўе і багацце краіны. А яшчэ — клопат і штодзённая амаль непрыкметная праца тысяч людзей, аб'яднаных высакароднай прафесіяй. Галоўны сэнс яе — берагчы і памнажаць гэты нацыянальны скарб.

З 1989 года працуе ў лясной гаспадарцы Рыгор Ліцвіненка (на фотаздымку ўнізе злева), з якіх апошнія чатыры з паловаю гады — галоўным ляснічым Мілашэвіцкага лясгаса Лельчыцкага раёна. У падначаленні гэтага спецыяліста 93 171 гектар лесу, у якім неабходна і праводзіць аднаўленчыя працы, і весці належную гаспадарчую работу, і выконваць функцыі аховы і абароны.

— Яшчэ ў школе я вырашыў стаць сапраўдным лесаводам і лічу, што мая мара збылася, — сказаў Рыгор Ліцвіненка. — Прыкладам выбару прафесіі быў мой тата, які працаваў у лясніцтве трактарыстам.

І жыхара вёскі Ясень Пружанскага раёна Сяргея Слабаду (на фота ўверсе злева) жыццёвая дарога таксама прывяла на службу лесу. Ды яшчэ якому. Цяпер Сяргей узначальвае адно з лясніцтваў Белавежскай пушчы, у якой ён працуе амаль 30 гадоў. Да гонару Сяргея лесаводам стала і яго старэйшая дачка.

А Уладзімір Ганчароў і Дзяніс Зайцаў (на фота справа) у пажаранебяспечны час патрулююць лясы Міншчыны, аглядаючы з борта верталёта болей за 531 тысячу гектараў ахоўнай плошчы. Яны працуюць пілотамі ў дзяржаўным прадпрыемстве «Беллесавія»: Уладзімір — пілот-назіральнік, Дзяніс — камандзір верталёта. Дзень работнікаў лесу — гэта таксама і іх свята.

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

ТОНКАСЦІ ТАНКА

Фота паэта 80-х гадоў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Беларускі савецкі паэт... Так гаварылі ў школе, калі мы праходзілі творчасць Максіма Танка. Але менавіта тады, вывучыўшы біяграфію самога Танка, я зразумела, што беларускія людзі дзеляцца на заходнікаў і ўсходнікаў. Нам, бярозаўскім школьнікам, якія хадзілі час ад часу прыбіраць вакол помніка ля былога адзінага канцлагера часоў Пілсудскага на тэрыторыі Заходняй Беларусі (траплялі сюды, адстойваючы права называцца беларусамі), сама яго біяграфія здавалася гераічнай. Таму верш пра родную мову хацелася ведаць бездакорна. Бо Танк — наш, хоць і з Мядзельшчыны, але заходнік! Гэта дзіўна, але нават яго дзень нараджэння (так супала!) — пачатак адліку яднання падзеленай у 1920-я гады паміж Польшчай і Саветамі Беларусі — 17 верасня. А ў нас у горадзе нават вуліца была такая. Вуліца асаблівага свята, якое падавалася як сцвярджэнне справядлівасці, але пры гэтым не было занесена ў лік дзяржаўных. І пра якое нават мясцовыя жыхары гаварылі неадназначна. Проста яны — заходнікі, якія маглі ўзгадваць пра тое, што мелі за польскім часам, і тут жа скрушна паскардзіцца, што выпала хадзіць у польскую школу. Сапраўды ж не зразумела: калі добрае жыццё абяцаюць, то чаму мова павінна быць чужая?..

Танк — заходнік. І гэтым тлумачыцца ўсё ў яго жыцці. І ў яго творчасці. Бо ці не самае каштоўнае ў ёй — прыгожая беларуская мова, за якую ён гатовы быў сядзець у вязніцах, цярпець пераследы і пакаранні.

Ён у гэтым быў ідэйны, прычым яшчэ з вучнёўства, калі ўдзельнічаў у забастоўцы супраць закрыцця беларускай гімназіі ў Радашковічах за польскім часам. Уявіце сабе такіх рашучых гімназістаў!.. А потым пайшло-паехала: Вільня, беларуская гімназія, Лукішкі, аднадумцы-беларусы, вобыскі, Лукішкі, аднадумцы-партыйцы, нелегальная літаратура, даносы, допыты... Паміж усімі гэтымі падзеямі яшчэ паўставалі вершы. Пісаў пра тое, што бачыў і чым захапляўся, пра тых, кім захапляўся, пра тое, што думаў-перадумаў падчас «адсідак». Адсюль — прысвячэнні Каліноўскаму, адсюль сапраўдная беларуская засяроджанасць на самым дарагім, адсюль лірызм, бо яго не трэба шукаць штучна, калі чалавек пакутуе насамрэч. А малады і апантаны ідэяй Яўген Скурко гатовы быў ісці да канца — да ажыццяўлення сваёй мэты. Адкінуўшы спакусу з'ехаць, як гэта зрабілі многія яго знаёмыя, сябры, паплечнікі, ён зрабіў свой выбар: застацца беларусам у Беларусі, абы яна была...

СТАР 6

■ Добрая навіна

З баракаў — у новы дом...

У новым віцебскім мікрараёне Білева, на вуліцы Багатырова, у новым доме ў ліку іншых справілі навасселле і гараджане, якія жылі раней доўгі час у дамах без камунальных выгод. Людзі пераехалі ў новы дом фактычна з «баракаў» на вуліцах Чапаева, Міра, дзе жылі дзясяткі гадоў. У гэтых дамах не было гарачай вады, прыбіральня — на вуліцы... Праблема вырашылася пры дапамозе губернатара Віцебскай вобласці, які ў свой час асабіста сустрэўся з жыхарамі праблемных дамоў.

— Такіх старых дамоў, як №№ 22, 24, 9, 11, 13, 15/2 па вуліцы Чапаева і №№ 3 і 5 па вуліцы Міра, у Віцебску больш за 350. У вашых васьмі разам узятых дамах жывуць 548 чалавек, сказаў тады губернатар Аляксандр Косінец, звяртаючыся да жыльцоў. — Мне даклалі, каб зняць праблему, трэба чакаць доўга — у перыяд да 2023 года. Але я упэўнены, што вырашэнне праблемы нельга зацягваць на такі доўгі тэрмін. У XXI стагоддзі ж жывём!

І вось навасселле. Цырымонія ганаровай перадачы дома ў эксплуатацыю адбылася з удзелам кіраўніцтва Віцебскага гарвыканкама. У новым 120-кватэрным доме 70 кватэр прадастаўлены менавіта перасяленцам з баракаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

У Беларусі цяпер выпускаюць ружовы фарфор

Посуд з гэтага каштоўнага матэрыялу пачалі вырабляць у Добрушы.

Ружовы фарфор вядомы перш за ўсё як візітная картка чэшскіх майстроў. Беларускі эквівалент, як абяцаюць вытворцы, зроблены па ўсіх правілах.

— Асаблівасць гэтага матэрыялу ў тым, што падчас вытворчасці пігмент дадаюць менавіта ў саму фарфоравую масу, — расказала карэспандэнту «Звязды» начальнік бюро маркетынгу закрытага акцыянернага таварыства «Добрушскі фарфаравы завод» Марына Зайцава. — Таму ружовы колер — гэта не дзякуючы вонкаваму пакрыццю. У Беларусі посуд з такога матэрыялу да гэтага часу не рабіў ніхто.

Добрушскі сервіз з руковага фарфору мае назву «Алена».

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

ISSN 1990 - 763X

Ігар БОКІЙ:

«МЯНЕ ЎРАЗІЛА СТАЎЛЕННЕ ДА ПАРАЛІМПІЙСКІХ ГУЛЬНЯЎ»

Беларускі плывец Ігар Бокій, які на сёлетняй Паралімпіядзе ў Лондане заваяваў пяць залатых медалёў і адно серабро, марыць выступіць з камандай здаровых спартсменаў. Пра гэта ён паведаміў на сустрэчы з журналістамі ў прэс-цэнтры БЕЛТА.

— Гэта былі спаборніцтвы высокага ўзроўню, дзе былі створаны ўсе ўмовы для спаборніцтваў і адпачынку, — расказаў Ігар Бокій. — І мяне ўразіла стаўленне да Паралімпіўскіх гульняў. Там людзі гэтым спортам цікавяцца не менш, чым Алімпійскімі гульнямі.

Як зазначыў трэнер Ігара Генадзь Вішнякоў, трыбуны падчас выступленняў яго падапечнага былі запоўнены поўнасцю. У Ігара з'явіліся свае прыхільнікі, якія не прапускалі нават познія спаборніцтвы. А старшыня Паралімпійскага камітэта Алег Шэпель паведаміў што беларускаму спартсмену ўжо паступілі прапановы выступаць за зборныя Расіі і Азербайджана. Сам Ігар Бокій кажа, што рашэнне гэтага пытання поўнасцю залежыць ад яго трэнера.

Таксама стала вядома, што ўдзельнікі сёлетніх Парралімпійскіх гульняў, якія заваявалі ў Лондане медалі, будуць забяспечаны на бліжэйшыя чатыры гады мясной прадукцыяй ад кампаніі «Белатміт».

— У нас ёсць дамоўленасць, што ўсе медалісты лонданскай Паралімпіяды будуць штомесяц на працягу чатырох гадоў атрымліваць па 10 кілаграмаў прадукцыі ад «Мясаграда», — паведаміў Алег Шэпель.

У цэлым ён зазначыў, што хацелася б большага двухбаковага супрацоўніцтва са спонсарамі, але аховотных пакуль што не так шмат, калі параўноўваць з Расіяй ці Украінай, дзе спонсарскае фінансаванне зусім на іншым узроўні. Гэта не адзіная праблема, якая існуе ў асяродку паралімпійскага руху. Недастача трэнерскіх кадраў тут таксама актуальная. У Міністэрстве спорту паралімпійскім рухам займаюцца толькі два дзяржаўныя трэнеры. Патэнцыял жа відавочны, калі нават глядзець на вынікі Паралімпіяды гэтага года, дзе беларуская каманда здабыла дзесяць узнагарод, сярод якіх тры сусветныя рэкорды плыўца Ігара Бокія.

Алена ДРАПКО.

КАРОТКА

Удзельная вага жанчын у структуры беспрацоўя на 1 верасня склала 49,6 працэнта (год таму яна складала 53,3 працэнта).

Галоўным прызам для пераможцаў турніру па футболе сярод аматарскіх школьных камандаў стане майстар-клас ад футбалістаў васьміразовага чэмпіёна Беларусі барысаўскага БАТЭ. Спаборніцтвы ахопяць усю Беларусь.

Колькасць зваротаў у Камітэт дзяржаўнага кантролю Беларусі ў 2012 годзе павялічылася на 12 працэнтаў. Традыцыйна людзей у першую чаргу хвалююць праблемы, звязаныя з будаўніцтвам жылля (парушэнне тэрмінаў уводу ў эксплуатацыю жылля, кошт будаўніцтва). Сёлета ўзрасла колькасць зваротаў па аперацыях з каштоўнымі паперамі, а таксама колькасць скаргаў на работу праваахоўных органаў.

Авіябомба стала прычынай эвакуацыі 37 чалавек з аднаго з будынкаў у Барысаве, паведамілі ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама. Як растлумачылі ва УУС, бомба ФАБ-50 часоў Вялікай Айчыннай вайны з узрывальнікам была знойдзена каля дома № 87 на вуліцы Гагарына пры правядзенні земляных работ.

ЦЫТАТА ДНЯ

Алег ВЯЛІЧКА, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі:

«Плануецца, што Палата прадстаўнікоў прыме на восеньскай сесіі ў першым чытанні праект закона «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей». Згодна з гэтым дакументам прапануецца павысіць памеры дапамогі па доглядзе дзяцей да трох гадоў. Яна будзе прывязана не да бюджэту пражытковага мінімуму, а да сярэднямесячнай зарплаты па краіне. На першае дзіця штомесячная дапамога да трох гадоў складзе 35% ад сярэдняй зарплаты, на другое і наступных — па 40%, а на дзіця-інваліда — 45%».

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 16°
Віцебск	+ 17°
Гомель	+ 20°
Гродна	+ 16°
Магілёў	+ 15°
Мінск	+ 16°

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 15.09.2012 г.

Долар ЗША	8400,00	▲
Еўра	10950,00	▲
Рас. руб.	272,50	▲
Укр. грыўня	1033,27	▼

Вашага меркавання чакаюць у Нацбанку

На афіцыйным сайце галоўнага банка краіны можна знайсці праект дзяржаўнай праграмы развіцця ў Рэспубліцы Беларусь сістэмы безнаяўных разлікаў па рознічных плацяжах з выкарыстаннем сучасных электронных плацежных інструментаў і сродкаў плацяжу на 2012—2015 гады, які вынеслі на грамадскае абмеркаванне.

Кожны можа пакінуць свае прапановы па праекце дакумента, які распрацаваны для забеспячэння шырокага карыстання сучаснымі электроннымі плацяжамі, павелічэння долі безнаяўных разлікаў у рознічным гандлі і іншых мэт. Разам з Нацбанкам над прававым актам працавалі міністэрствы гандлю, фінансаў, спорту і турызму, культуры і шмат іншых зацікаўленых міністэрстваў, ведамстваў і арганізацый. Адметнасцю дакумента з'яўляецца пераход сістэмы безнаяўных разлікаў па рознічных плацяжах на новы якасны ўзровень развіцця. Многія захады накіраваны на стымуляванне актыўнага выкарыстання электронных разлікаў.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

Сяджу на беразе Сцяпянскай воднай сістэмы на лавачцы. Трэба было пачакаць з паўгадзіны — вось і вырашыў пасядзець ды падыхаць свежым прахалодным паветрам. Праз некалькі хвілін падыходзяць да мяне хлопец з дзяўчынай і пытаюцца, ці можна сесці.

— Калі ласка, — адказваю і стаўлю свой партфель на калені, каб вызваліць месца.

Маладыя людзі прыселі і сталі абмяркоўваць нейкія свае праблемы. А я гляджу на ваду і пра сваё думаю. Але тут з новым удыхам мой нос адчувае непрыемны пах цыгарэтнага дыму. Гэта хлопец закурыў і цяпер дыміць мне ў твар...

ЧАМУ НАШЫ ЛЮДЗІ РАЗУМЕЮЦЬ, ШТО ТРЭБА ЗАПЫТАЦЬ ДАЗВОЛУ, КАБ ПРЫСЕСЦІ ПОБАЧ, АЛЕ НІКОЛІ НЕ ЗАПЫТАЮЦЦА, ЦІ МОЖНА ПОБАЧ ЗАКУРЫЦЬ?

Галіна БАГДАНАВА, пісьменніца:

— Справа ў тым, што курэнне — гэта прыкмета прыналежнасці да пэўнай зграі. На Захадзе зараз ідзе барацьба з курэннем. Там той, хто не курыць, — індывідуальны, хто курыць — чалавек зграі. А гэты малады чалавек палічыў, што і вы таксама са зграі. Ён лічыў, што сцвярджае сваю індывідуальнасць. Але насамрэч — гэта калектывісцкі пачатак, які застаўся пасля савецкіх часоў. І змагацца з гэтым у нас вельмі цяжка. Гэтае змаганне можа зацягнуцца на шмат гадоў. У нас няма пачуцця індывідуальнасці — толькі калектывізм. Вось і атрымліваецца, што цыгарэта сёння — як, напрыклад, калісьці піянерскі гальштук. У людзей не ўзнікала пытання, піянер вы ці не.

Панцялей ДЗЁМІН, эканаміст абаненцкага аддзела ЖРЭА №1 Фрунзенскага раёна г. Мінска:

— Я лічу, што за часы існавання СССР народ культурна згалеў. Вось пытанне «Ці можна прысесці?» — гэта ўжо пачатак культуры. Але далей мы пакуль не прайшлі. Напэўна, гэты хлопец падумаў, што калі дазволілі прысесці, то далей ён можа рабіць на гэтай лавачцы што заўгодна.

Іна ЧЭБ, менеджар:

— Вельмі цяжкае пытанне. Магчыма, нашы людзі не разумеюць, што пах цыгарэтнага дыму не ўсім падабаецца. Насамрэч гэта проста жахліва. Бывае, стаіш на прыпынку, а на цябе курыць. Гэтыя людзі нават не задумваюцца, што перашкаджаюць камусьці.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ ТРЭБА АЦЭНЬВАЦЬ ПА ЯКАСЦІ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Запланаваны бездэфіцытны бюджэт, дадатнае сальда знешняга гандлю. Гэта тое, за што рэальна бярэцца ўрад. У нас ёсць усе падставы сцвярджаць, што мы з гэтым справімся. Важнае пытанне — прамыя замежныя інвестыцыі. Бо асабістых рэсурсаў недастаткова. Мы павінны прыцягнуць 4,5 млрд доларaў у эканоміку для таго, каб не адставаць.

КОЖНЫ ПАВІНЕН НЕСЦІ СВОЙ КРЫЖ САМ

«Мы пераходзім ад валавых паказчыкаў да якасных, — заявіў прэм'ер-міністр. — Сёння задача не ў тым, каб вырабіць больш трактароў, а ў тым, каб вырабіць іх з мінімальнымі выдаткамі і выгадна прадаць. Я думаю, што мы выйдзем па таварах на 53 млрд доларaў экспарту. Нават Расія пачынае забяспечваць сябе многімі прадуктамі сама. Мы страчваем экспарт, расце канкурэнцыя, падаюць цэны. Неабходна шукаць выйсце». А каб была якасць, патрэбны ініцыятыўныя і сумленныя кіраўнікі, гатовыя да стварэння новага. «У эканоміцы нам трэба садзейнічаць матывацыі, — упэўнены Міхаіл Мясніковіч. — На месцах ініцыятыва проста «заглухла». Усе чакаюць дапамогі, плачуцца начальству. Кожны павінен несці свой крыж сам. Нам патрэбна эфектыўнасць вытворчасці, а без матывацыі яе не будзе. Трэба даваць працаваць адказна і ініцыятыўна. Тое, што зарабляюць, трэба пакідаць тым, хто зарабіў. Зэканомленае павінна ісці на паляпшэнне матэрыяльнай базы і заахвочванне тых, хто дапамог Зэканоміць». Побач знаходзіцца і праблема дысбалансу паміж прадукцыйнасцю працы і зарплатамі: «Для яго знікнення мы павінны вырашыць усе пытанні, звязаныя з эфектыўнасцю вытворчасці, у тым ліку пытанне залішняй колькасці работнікаў. Справа далікатная. Вось таму мы так і турбуемся аб стварэнні новых працоўных месцаў».

У БЕЛАРУСКІХ РУБЛЯХ — БОЛЬШ ВЫГАДНА

«У нас сёння па ўсіх валютах дэпазіты фізічных асоб складаюць 68 трлн рублёў (гэта амаль 1000 доларaў на чалавека). Сёлета дэпазіты павялічыліся на 18 трлн. Гэта сведчыць аб тым, што даходы насельніцтва пастаянна растуць. Па юрыдычных асобах — 57 трлн рублёў (сёлета прырост 8 трлн). А захоўваць грошы, раз яны ёсць, зараз лепш у рублях з-за вялікіх працэнтных ставак».

ЗАРПЛАТА ДОЙДЗЕ ДА 600 ДОЛАРАЎ?

«Адназначна мы выканаем устаноўку Прэзідэнта па зарплаце. І зарплата ў снежні будзе перавышаць у сярэднім па краіне 4 мільёны 100 тысяч рублёў. А ў снежні 2013 года мы будзем мець не менш за 600 доларaў па краіне, і не менш за 500 у бюджэтнікаў», — запэўніў Міхаіл Мясніковіч.

ПАСЛУГІ ЖКГ

«Мы ў бягучым годзе, хутчэй за ўсё, не выйдзем на зададзены ўзровень кампенсацыі насельніцтвам камунальных паслуг, значыць, сёлета трэба дадаткова знайсці ў бюджэце яшчэ 2 трлн рублёў», — сказаў прэм'ер-міністр і дадаў, што гэтыя грошы можна дадаткова занесці ў даходы насельніцтва.

ПРЫВАТЫЗАВАЦЬ МОЖНА ЛЮБОЕ ПРАДПРЫЕМСТВА

«Калі мы размаўляем аб адкрытай эканоміцы, — разважае Міхаіл Мясніковіч, — то яна павінна быць адкрытая і для прыватызацыі. І не абмяжоўвацца нейкім спісам, які склалі чыноўнікі альбо дрэнныя кіраўнікі прадпрыемстваў, каб пазбавіцца стратнага прадпрыемства. Няма ніякіх абмежаванняў па прыватызацыі любога прадпрыемства. Галоўная задача, якая пры гэтым ставіцца, — прамыя замежныя інвестыцыі».

ЗНЕШНІ ДОЎГ БУДЗЕ ВЫПЛАЧАНЫ

У наступным годзе Беларусь будзе павінна выплаціць шмат грошай па знешнім доўгу. Ці зможа гэта стаць прычынай новага крызісу? «Баяцца няма чаго, — адказвае Міхаіл Мясніковіч. — Так, нам сапраўды трэба ў наступным годзе выплаціць 3 млрд доларaў па старых даўгах. Гэта вялікая сума. Трэба ж улічваць і тое, што ёсць даўгавыя абавязацельствы банкаўскай сферы. Але ўсе гэтыя выплаты прадугледжаны ў бюджэце, і мы заяўляем, што крыніцы для гэтага ёсць».

СЕЛЬСКУЮ ГАСПАДАРКУ НЕ КІНУЦЬ

Аграпрамысловы комплекс будзе зноў падтрымлівацца: «Мы падтрымлівалі і будзем падтрымліваць сельскую гаспадарку. У бюджэце на наступны год прадугледжана на гэта каля 33 трлн рублёў. Гэтыя грошы пойдуць на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы сельскай гаспадаркі. Будзе праведзена мадэрнізацыя рэкорднай колькасці малочнатаварных фермаў. Запланавана пабудова і новых фермаў. Будзем асвойваць новую вытворчасць — мяса індычкі», — пералічваў прэм'ер-міністр.

НА ДЗЯЦЕЙ ДАДУЦЬ БОЛЬШ ГРОШАЙ

«Мы плануем павелічэнне памераў дапамог на дзяцей у наступным годзе. Ва ўрадзе ўжо ёсць адпаведныя напрацоўкі. У сярэднім павелічэнне складзе 1,5 раза. Але гэта ў большай ступені будзе залежыць ад складу сям'і. Большая дапамога будзе тым, хто мае больш дзяцей».

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

■ 15 верасня — Міжнародны дзень дэмакратыі

Дні адчыненых дзвярэй у парламенце

Напярэдадні Міжнароднага дня дэмакратыі, які быў усталяваны ААН у 2007 годзе, абедзве палаты беларускага парламента, падобна парламентам усяго свету, традыцыйна адчынілі свае дзверы для сустрэч, у першую чаргу — з моладдзю.

— Гэта робіцца, каб яшчэ раз расказаць, як працуе прадстаўнічая і заканадаўчая ўлада краіны, якія ёсць пытанні ў грамадзян да парламента, якім бы яны жадалі яго бачыць — патлумачыла журналістам старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Ніна МАЗАЙ. — Мы, безумоўна, яшчэ і падводзім вынікі зробленага, бо чацвёртае скліканне Савета Рэспублікі завяршае сваю працу. Больш падрабязна спыняемся на тых законах, якія датычацца моладзі, сістэмы адукацыі, развіцця прафесійных гарызонтаў для маладых.

14 верасня ў Савеце Рэспублікі сенатар Ніна Мазай сустрэлася са студэнтамі БДУ. Яна расказала ім, у чым спецыфіка працы Верхняй палаты парламента, якія яна выконвае функцыі, якімі паўнамоцтвамі надзелены яе камісіі. На працы сваёй камісіі Ніна Мазай спынілася найбольш падрабязна: дэпутаты чацвёртага склікання ратыфікавалі больш за 200 міжнародных дагавораў, усяго Савет Рэспублікі зацвердзіў больш за 600 такіх дакументаў. Сёння на стале сенатараў ляжыць праект вельмі важнага Закона аб міжнародных дагаворах Рэспублікі Беларусь. Толькі за апошні час тут былі прынятыя парадку 54 заканадаўчых актаў, якія рэгулююць дзейнасць Мытнага саюза, 17 дагавораў, якія тычацца АЭП, у працы яшчэ 4 законапраекты, прысвечаныя Адзінай эканамічнай прасторы, і каля 60 такіх рыхтуюцца...

У той жа самы час у будынку Ніжняй палаты парламента адбывалася сустрэча дэпутата Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах і сувязях з СНД Валянціны ЛУЗІНАЙ (Іўеўская выбарчая акруга №53) з членамі Моладзевай палаты Ашмянскага раённага Савета дэпутатаў. У сустрэчы ўдзельнічалі таксама старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ Аляксандр ЮШКЕВІЧ і начальнік упраўлення па справах моладзі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь Віталь БРЭЛЬ.

— Сімвалічна, што напярэдадні Міжнароднага дня дэмакратыі сустрэча ў парламенце адбываецца менавіта з дэпутатамі нядаўна выбранай Моладзевай палаты Ашмяншчыны, — звярнулася да гасцей Валянціна Лузіна. — Гэта своеасаблівая эстафета ад нас, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, да вас — нашых юных калег, якім належыць вырашаць значныя пытанні моладзі і грамадства.

Дэпутаты таксама адказалі на пытанні маладых людзей і выслухалі іх прапановы па дзейнасці парламента.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

■ Да Дня бібліятэк

КНІГА ІДЗЕ Ў «ФЭЙСБУК», альбо Чаму ў бібліятэк ёсць будучыня?

15 верасня Беларусь адзначае Дзень бібліятэк. Гэтае свята асабліва важка гучыць сёлета, у Год кнігі. Гэта проста словы, ці за імі стаяць нейкія рэальныя маленькія «кніжныя перамогі»?

Паводле статыстыкі, сёння ў Беларусі дзейнічае 3,7 тыс. публічных бібліятэк. Іх бібліятэчны фонд складае 67,7 млн экзэмпляраў кніг, часопісаў, рукапісаў і іншых крыніц інфармацыі. Шмат гэта ці не? І наогул, ці трэба сённяшняму беларускаму чытачу хадзіць у бібліятэку, каб задаволіць свае чытацкія патрэбы?

Ад спрэчак пра тое, ці саступіць папяровая кніга месца лічбавай, усе ўжо, відавочна, стаміліся. Як відавочна і тое, што ў бліжэйшай будучыні папяровая кніга, вядома ж, нікуды не знікне. Тым больш нікуды не знікнуць кнігі, якія захоўваюцца ў бібліятэках Беларусі. А «небяспечныя» сучасныя лічбавыя тэхналогіі насамрэч дапамагаюць кнізе выжыць у складаны час, калі людзі проста сталі менш чытаць. Праз «лічбу» кніга сама ідзе да людзей. Цяпер можна чытаць з экрана камп'ютара і праз электронную кнігу, можна акурат з дома з дапамогай інтэрнэту замовіць на віртуальны абанемент практычна любую кнігу ў электронным выглядзе. Такую паслугу прапаноўваюць сёння найбуйнейшыя ў Беларусі бібліятэкі — Нацыянальная бібліятэка Беларусі і Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я. Коласа НАН Беларусі.

— Тэхналогіі накіраваны не на тое, каб бібліятэка знікла ў тым выглядзе, у якім яна існуе сёння. Тэхналогіі — гэта прыдатак, — мяркуе Жанна МОЎЧАН, загадчыца аддзела праграмнага і тэхнічнага забеспячэння навуковых даследаванняў ЦНБ імя Я. Коласа НАН Беларусі. — Яны накіраваны на тое, каб з'явіліся нейкія новыя віды абслугоўвання, больш якасныя. Той жа электронны каталог, інтэрнэт-тэхналогіі. Нават тэхналогія радыёчастотнай ідэнтыфікацыі аб'ектаў, якая сёння ўкараняецца ў нашай бібліятэцы (наогул, такая тэхналогія ёсць толькі ў бібліятэцы МНС), гэта ўсё роўна прыдатак да бібліятэчнай сістэмы, якая зараз існуе. Сама па сабе гэтая тэхналогія не можа існаваць без традыцыйных кніг і чытачоў. Таму нельга казаць, што бібліятэка з традыцыйнай некалі ператворыцца ў нейкую цалкам віртуальную прастору.

Тое, што ў бібліятэк ёсць будучыня, лічыць і Іна ЮРЫК, загадчыца аддзела маркетынгавых даследаванняў ЦНБ імя Я. Коласа НАН Беларусі. У галоўнай навуковай бібліятэкі краіны наогул вельмі прагрэсіўныя падыходы. Для таго, каб быць бліжэй да чытача, супрацоўнікі бібліятэкі нават зрабілі афіцыйныя акаўнты ўстановы на «Твітары» і ў «Фэйсбуку».

— Існуе як мінімум дзве прычыны, па якіх у бібліятэкі адназначна ёсць будучыня. Гэта рэальныя трэнды сучаснай бібліятэчнай справы па ўсім свеце. Па-першае, гэта прадастаўленне легальнага кантэнту. Таму што сёння велізарная колькасць піратаў і вялікая колькасць інфармацыі, якая ёсць у інтэрнэце, не праверана. І якраз бібліятэка заўжды будзе той надзейнай установай, якая будзе забяспечваць чытача выключна легальным кантэнтам. Па-другое, перспектыўны кірунак сёння — развіццё інтэлектуальнага адпачынку ў бібліятэках. Калі ў бібліятэку ідуць дзеля прэзентацый цікавых кніг, сустрэч з пісьменнікамі і навукоўцамі. Гэта нікуды не падзенецца, таму што ніякі анлайн не зможа замяніць жывую камунікацыю.

Сапраўды, жывую кнігу нішто не заменіць. Якасць друку, пах новай кнігі, паўнавартаснае мастацкае афармленне можа быць толькі ў традыцыйнай папяровай кнігі. Акрамя таго, ёсць такія ўнікальныя старажытныя выданні, «стасункі» з якімі чытачу не заменіць ніякая электронная версія. Аляксандр СТЭФАНОВІЧ, загадчык аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў, перакананы, што бібліятэка будзе жыць яшчэ і таму, што інтарэс да рэдкіх кніг і старадрукаў ніколі не паменшыцца:

— У нашай бібліятэцы ёсць кнігі, якіх няма больш нідзе ў Беларусі. Гэта, бясспрэчна, прыцягвае чытачоў і спецыялістаў. Тая бібліятэка, дзе ёсць унікальныя выданні і людзі, якія рупяцца аб распаўсюджанні інфармацыі пра гэтыя выданні, будзе жыць. У нашай бібліятэцы, напрыклад, ёсць Брэсцкая Біблія 1563 года, рэдкія газеты-аднадзёнкі часоў Вялікай Айчыннай вайны, беларуская літаратура першай паловы XX стагоддзя, якая ў свой час актыўна знішчалася, а таму захавалася ў вельмі невялікай колькасці.

Наогул, колькасць бібліятэк у краіне, як і колькасць іх наведнікаў, яскрава сведчыць пра агульны ўзровень культуры ў дзяржаве. Вядома, на чытанне ў сучаснага чалавека сёння проста нестае часу. Але таму новыя тэхналогіі і спяшаюцца нам на дапамогу. Каб праз інтэрнэт з мабільнага тэлефона мы маглі замовіць кнігу хаця б у электронным выглядзе. А калі-небудзь, падчас адпачынку, дабрацца калі не да бібліятэкі, то хаця б да бацькоўскай паліцы са старымі добрымі папяровымі кнігамі.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

«Скураны мяч» разыгралі ў Магілёве

14 верасня ў Магілёве завяршыліся фінальныя рэспубліканскія спаборніцтвы па футболе «Скураны мяч» на прызы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба.

Іх пераможцам стала футбольная каманда «Вымпел» з Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Другое і трэцяе месцы занялі адпаведна «Падлетак» са Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці і «Атлант» з Мёрскага раёна Віцебскай вобласці.

Усяго ў турніры бралі ўдзел 7 камандаў: дзве сталічныя і 5 з рэгіёнаў Беларусі, якія перамаглі ў занальных спаборніцтвах. У футбол гулялі падлеткі 11-12 гадоў — гэта сярэдняя група «Скуранога мяча».

Спаборніцтвы пачаліся ў Магілёве 11 верасня: штодня матчы праходзілі на стадыёне са штучным пакрыццём Дзіцячай юнацкай школы алімпійскага рэзерву № 7 па футболе, на вуліцы Якубоўскага. Гулялі з азартам, а гледачы падтрымлівалі каманды.

На ўрачыстым закрыцці спаборніцтваў каманда-пераможца «Вымпел» атрымала кубак ад Прэзідэнцкага спартыўнага клуба. Былі ўручаны і іншыя прызы ад Міністэрства спорту і Федэрацыі футбола.

— Усё прайшло паспяхова, — падвяла вынік галоўны сакратар спаборніцтваў, суддзя нацыянальнай катэгорыі Святлана Горкая. — Дзеці адгулялі, абышлося без траўмаў. І вельмі прыемна, што кожны ўдзельнік «Скуранога мяча» паехаў дадому з памятнымі прызамі ад Прэзідэнцкага спартыўнага клуба.

Ілона ІВАНОВА.

ЖНІВЕНЬ — САМЫ АВАРЫЙНЫ МЕСЯЦ У МІНСКУ

У жніўні гэтага года супрацоўнікі сталічнай Дзяржаўтаінспекцыі зафіксавалі найбольшую колькасць дарожна-транспартных здарэнняў, у якіх загінулі людзі.

Як паведамілі ва ўпраўленні ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, на працягу жніўня на вуліцах сталіцы ў выніку ДТЗ загінулі 13 і атрымалі траўмы 74 чалавекі. Для параўнання: у маі ў Мінску здарылася ўсяго адна трагедыя, а траўмы ў аварыях атрымалі 66 кіроўцаў і пешаходаў.

Усяго за 8 месяцаў 2012 года ў выніку ДТЗ у Мінску загінулі 46 і атрымаў траўмы 521 чалавек.

«Мінск-Навіны».

АКЦЭНТЫ ТЫДНЯ з Вадзімам Гігіным

У НАС. Хто галоўны палітык краіны? Калі дзесьці такое пытанне выклікае гарачыя спрэчкі, то у Беларусі адказ на яго відавочны. Прэзідэнт не толькі ў адпаведнасці з Канстытуцыяй, але і фактычна вырашае і накіроўвае курс дзяржавы. Гэтая аксіёма айчыннай палітычнай рэчаіснасці пацвердзілася 11 жніўня, у аўторак, калі кіраўнік дзяржавы прымаў урад з дакладам аб выніках працы эканомікі ў 2012 годзе і праектам бюджэту на год наступны.

Агонь па штабах — так кароткa і зразумела можна вызначыць настрой Аляксандра Лукашэнкі падчас нарады, якая, без перабольшвання, стала адной з самых важных падзей не толькі эканамічнага, але і палітычнага жыцця. Ніякай самазаспакоенасці, толькі праца і адказнасць перад людзьмі — вось патрабаванне Прэзідэнта да ўсіх службовых асоб. Ён ужыў нават такое жорсткае азначэнне, як «татальная мабілізацыя кадраў». Але наўрад ці з ім паспрачаешся, бо менавіта адданай працы і выканання сваіх абавязкаў чакаюць ад чыноўнікаў грамадзяне.

Ніякага прыхавання недахопаў — яшчэ адзін тэзіс той надзвычай адкрытай гаворкі, што ішла ў рэзідэнцыі Прэзідэнта. Гэта, дарэчы, заклік і да нас, журналістаў. Не трэба баяцца смела і шчыра выкрываць тое, што не зроблена ці марнуецца, недабудавана альбо робіцца не на поўную моц. Кожны зварот нашага чытача павінен быць успрыняты як сігнал да дзеяння. Прынамсі менавіта так я разумею словы Прэзідэнта.

Адкрытасць перад грамадствам азначае не толькі справаздачу чыноўнікаў, але і патрабаванні да саміх грамадзян. І першае з іх — праца. Так, у Беларусі захаваецца сацыяльна арыентаваны курс, будзе выконвацца намечаны план росту заробкаў, але толькі пры адной умове — росце вытворчасці працы. Калі мы хочам зарабляць больш, то і працаваць давядзецца больш — спрадвечны закон дабрабыту і поспеху.

Інавацыйнасць, працаздольнасць і адказнасць — верставыя слупы развіцця беларускай эканомікі, думаецца, не толькі ў 2013 годзе. Так, пагроз стабільнасці ў нашай краіне шмат (уласныя недапрацоўкі і памылкі, сусветны эканамічны крызіс, розныя тэмпы інтэграцыі ў міжнародныя эканамічныя арганізацыі Беларусі, Расіі і Казахстана, нядобразычлівае стаўленне некаторых знешніх сіл), аднак не пасаваць перад выклікамі — фірмовы стыль і самога Аляксандра Лукашэнкі, і беларускага грамадства ўвогуле, рыса нашага нацыянальнага характару. Таму і амбіцыйныя задачы, пастаўленыя на нарадзе, упэўнены, будуць выкананы.

У СВЕЦЕ. Здавалася, што галоўнай навіной апошніх дзён стане форум арганізацыі Азіяцка-Ціхаакіянскага супрацоўніцтва (АЦЭС) ва Уладзівастоку. Тым больш што Расія выдаткавала на яго падрыхтоўку фантастычную суму — 20 мільярдаў доларaў, а гэта амаль у тысячу раз болей, чым ЗША на арганізацыю такой жа сустрэчы летась. Нечакана ўсе сусветныя падзеі, нават вайну ў Сірыі, засланіла забойства амерыканскага пасла ў Лівіі Крыстафера Стывенса і яшчэ трох дыпламатаў.

Трагічныя падзеі адбыліся падчас нападзення раз'юшаных ісламістаў на консульства ЗША ў Бенгазі. Як вядома, нагодай для масавых пратэстаў, што ідуць зараз па ўсім мусульманскім свеце, стаў фільм «Невінаватасць мусульман», размешчаны ў інтэрнэце. У ім аўтары здзекуюцца з рэлігійных каштоўнасцяў ісламу. Але талерантнасць мусульман, рост ісламісцкага экстрэмізму — гэта асобныя тэмы. У справе забойства амерыканскіх дыпламатаў існуе іншы цікавы падтэкст.

Па-першае, прадстаўнікам Злучаных Штатаў у Лівіі хранічна не шанцуе. Яшчэ ў 1801 годзе трыпалійскі паша ссек флагшток з «зорна-паласатым» сцягам над амерыканскім пасольствам, што азначала страшэнную абразу і выклікала т.зв. «Першую берберыйскую вайну» — першую вайну маладой краіны, што ўзнікла ў Паўночнай Амерыцы, пасля набыцця незалежнасці.

Па-другое, забойства пасла ЗША адбылося па іроніі лёсу менавіта ў Бенгазі — калыскі «лівійскай рэвалюцыі», што звергла Муамара Кадафі! Усе добра памятаюць, як Вашынгтон падтрымліваў лівійскіх паўстанцаў. Зараз няма сумненняў, што спецслужбы ЗША прыклалі руку і да зверскага забойства былога лідара Лівіі. Т.зв. «арабская вясна» — серыя масавых выступленняў у Егіпце, Лівіі, Тунісе, Сірыі, Бахрэйне — падавалася Белым домам як нейкая новая ліберальная, дэмакратычная хваля. На Захадзе нараджаліся новыя канцэпцыі, у адпаведнасці з якімі стаўленне да саміх Злучаных Штатаў у арабскім свеце значна палепшацца. Трагічная смерць Крыстафера Стывенса і трох яго супрацоўнікаў паставілі крыж на гэтых ружовых марах. Захад арабы па-ранейшаму ненавідзяць, самі ЗША застаюцца для іх сімвалам распусты і сусветнай пагрозы, а «дэмакраты-рэвалюцыянеры» аказаліся самымі заўзятымі рэлігійнымі фанатыкамі.

Зараз ЗША ўпарта змагаюцца з Іранам, але тым часам, здаецца, уласнымі рукамі нарадзілі адразу некалькі новых Іранаў.

З ГІСТОРЫІ. Неяк незаўважана прайшла адна з важных дат айчыннай гісторыі. 9 верасня споўнілася роўна 70 гадоў з дня стварэння Беларускага штаба партызанскага руху. Узначальваў яго Петр Захаравіч Калінін, дзеяч Кампартыі Беларусі. БШПР адыграў надзвычай важную ролю ў арганізацыі антыгітлераўскага супраціву ў нашай краіне, арганізацыі партызанскіх атрадаў, падпольных груп. Таму не зусім зразумела, чаму гэтаму юбілею не надалі шырокага значэння. Можа, таму, што апошнім часам мы занадта захапіліся больш ранняй гісторыяй і за шляхецкімі балямі і рыцарскімі турнірамі сталі быццам забывацца пра слаўную старонку нашай гісторыі — партызанскі рух?

Таму самы час згадаць 9 верасня, калі, адпаведна з рашэннем Дзяржаўнага камітэта абароны СССР быў створаны БШПР.

У спрэчках вакол праблемных пытанняў нашай мінуўшчыны не трэба адсоўваць на другі план тыя падзеі і нават цэлыя гістарычныя перыяды, якімі можа ганарыцца Беларусь. Партызанскі і падпольны рух з'яўляецца менавіта такім. І таму я, унук партызанаў, выказваюся рашуча за тое, каб да 70-годдзя з Дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў мы нарэшце ў нашым дзяржаўным календары асобна, ганарова і пачэсна ўшанавалі памяць тых, хто змагаўся за існаванне Беларусі.

Каментарыі дасылайце на адрасы:

gigin@belta.by
і info@zvyazda. minsk.by

СООО «Барпромэкс» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже имущества, принадлежащего СООО «Барпромэкс»

№ лота	Наименование имущества	Начальная цена лота, без НДС, руб.	Задаток 5%, 10% без НДС, руб.
1	2	3	4
1	Трехэтажное кирпичное здание цеха №22, инв. №310/с-14880, общей площадью 2502 кв. м, год постройки 1985 г. – 4 512 467 700 рублей Здание механизированного склада металла, инв. №350/С-76751, общей площадью 378,8 кв. м, год постройки 1985 г. – 511 123 500 рублей Пилорама, инв. №310/С-27623, общей площадью 180,4 кв. м, год постройки 2004 г. – 231 162 300 рублей Пилорама, инв. №350/С-75609, общей площадью 154,2 кв. м, год постройки 1996 г. – 231 387 300 рублей Открытая площадка лесосклада площадью 2069,6 кв. м, год постройки н/у – 114 558 300 рублей Здание склада СТАС №350/С-76752, общей площадью 912,2 кв. м, год постройки н/у – 1 308 348 000 рублей Складские помещения, инв. №310/С-27624, общей площадью 613,9 кв. м, год постройки 2004 г. – 845 946 900 рублей Асфальтовое покрытие площадью 1658,7 кв. м, год постройки н/у – 92 519 100 рублей Ворота металлические с 2-мя мех. открываниями ворот – 17,5 кв.м – 4 473 900 рублей Ворота металлические с 2-мя мех. открываниями ворот – 21,0 кв.м – 5 270 400 рублей Ограждение из ж/б плит (47 шт.) площадью 1054,4 кв.м – 75 412 800 рублей ЛЭП ААБС – 400,0 м – 4 550 400 рублей Пункт распределительный, инв. №215 – 347 400 рублей Пункт распределительный ПР 24, инв. №213 – 531 000 рублей Пункт распределительный ПР 24, инв. №214 – 531 000 рублей Пункт распределительный ПР 9522, инв. №216 – 456 300 рублей Пункт распределительный ПР 9000, инв. №10631 – 2 970 000 рублей Пункт распределительный ПР 9000, инв. №10138 – 2 970 000 рублей Пункт распределительный ПР 9000, инв. №10137 – 3 150 000 рублей Конденсаторная установка БСК – 240 квар., инв. №10669 – 8 460 000 рублей Станок отрезной, инв. №1/01 – 2 970 000 рублей Станок отрезной, инв. №1/02 – 4 950 000 рублей Станок отрезной, инв. №1/12 – 27 900 000 рублей Станок отрезной, инв. №1/13 – 1/18 (6 шт.) – общая стоимость – 17 550 000 рублей Станок фрезерный для фрезерования отверстий инв. №1/24 – 1/33 (10 шт.) – общая стоимость – 53 910 000 рублей Стеллаж для хранения пиломатериалов, инв. №217 – 243 (27 шт.) – общая стоимость – 31 410 000 рублей Транспортер ленточный, инв. №1/19 – 1/23 (5 шт.) – общая стоимость – 34 830 000 рублей Трансформаторная подстанция КТП 1000V, инв. №10258 – 25 740 000 рублей Станок сверлильно-клеймовый, инв. №1/34 – 34 470 000 рублей Линия по производству кабельных барабанов, инв. №1 – 908 190 000 рублей Станок многопильный GABBIANI SA350, инв. №1/03 – 36 810 000 рублей Котел отопительный КВ 80, инв. №4 – 8 190 000 рублей Котел отопительный КВ 80, инв. №4.1 – 8 010 000 рублей Циклон с бункером ОЭ КДМ, инв. №211 – 13 320 000 рублей Электроталь 2 т, инв. №209 – 6 210 000 рублей Электротельфер 2 т, инв. №210 – 4 500 000 рублей Стружкоотсос с пылеулавливателем, инв. №1/04 – 615 600 рублей Кран козловой КК-К-20А, инв. №212 – 231 840 000 рублей Бункер для сбора отходов древесины, инв. №64-001 – 5 850 000 рублей Бункер циклон ограждения, инв. №6Н-3 – 13 320 000 рублей Циклон вытяжки с виброопорами, инв. № 2-25 – 13 320 000 рублей Циклон с бункером, инв. №64-023 – 13 320 000 рублей Циклон с реперами и стропами, инв. №22-64 – 13 320 000 рублей Электроталь 1 т, инв. №1109 – 5 580 000 рублей Электроталь 1 т, инв. №53 – 5 580 000 рублей Кран-балка 1 т, инв. №1787 – 21 960 000 рублей Кран-балка 2 т, инв. №1804 – 24 390 000 рублей Кран-балка 3,2 т, инв. №1217 – 27 090 000 рублей Кран-балка 3,2 т, инв. №2105 – 27 090 000 рублей Электросчетчик ЦЭ 6850М, инв. №5 – 1 350 000 рублей Электронный измеритель влажности МГ 4Д, инв. № 2909 – 3 060 000 рублей Сушильный комплекс TERMOLEGNO CSD-50 – 412 712 508 рублей Трансформатор ТМЗ 1000/10-72У1, инв. №11019 – 25 470 000 рублей Трансформатор тока ТОЛ -10-1-2-0,5S/10Р-150/5, инв. №11020-11022 (3 шт.) – общая стоимость – 2 970 000 рублей Щепкодробильная установка, инв. №1/07 – 45 540 000 рублей Пилорама РК 3217 (линия по распиловке древесины), инв. №2809 – 61 920 000 рублей Станок заточной, инв. №1/05 – 8 010 000 рублей Станок заточной, инв. №1/06 – 8 010 000 рублей Станок лентопильный 1/09-1/11 (3 шт.) – общая стоимость – 42 120 000 рублей Гидравлический пресс гибки барабанов, инв. №1/08 – 630 000 рублей Компрессор, инв. №1/35-1/36 (2 шт.) – общая стоимость – 3 960 000 рублей Штамп 00-001 Фланец – 450 000 рублей Штамп 00-002 Фланец – 450 000 рублей Тележка трековая (линия по распиловке древесины), инв. № 205-208 (4 шт.) – общая стоимость – 2 520 000 рублей Окорочный станок с расклинивающими ножами и подающий транспортер (линия по распиловке древесины) – 88 470 000 рублей Рольганг (7 п.м), инв. №2/02 – 12 960 000 рублей	10 299 474 408	514 973 720
2	Автопогрузчик «Komatsy» вилочный, грузоподъемность 4 т, год выпуска 1986, цвет желтый	50 400 000	5 040 000
3	Прицеп ПСЕ-Ф – 12,5	6 570 000	657 000
4	Пневмогвоздобой С33/90-А-2	4 140 000	414 000
5	Пневмопистолет ПП – 8/45	540 000	54 000
6	Пневмопистолет ПП – 8/45	540 000	54 000
7	Пресс Кд-2322	29 700 000	2 970 000
8	Станок вертикально-сверлильный 2А-135	10 980 000	1 098 000
9	Станок настольно-сверлильный 2М-112	4 320 000	432 000
10	Станок такарно-винтовой МК 60-56	38 700 000	38 70 000
11	Станок универсальный фрезерный 67К 25ПР	19 350 000	1 935 000
12	Зигмашина ИВ 2714, инв. №15	30 870 000	3 087 000

Организатор торгов: управляющий в деле о банкротстве ООО «Диспонент»: г. Гомель, ул. Молодости, 5, тел. моб. (8029) 684-94-62, тел.моб. (8029)621-22-36.

Продавец: СООО «Барпромэкс», г. Гомель, ул. Объездная, д. 9, к. 7.

Задаток перечисляется до 03.10.2012 г. (включительно) на р/с 3012132179001 в ОАО «Банк БелВЭБ» ГРО № 530 г. Минск, МФО 153001226, УНП 490317170.

Условия продажи – без условий.

Шаг аукциона в размере 5% от начальной цены.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 дней после подписания протокола. Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

В случае признания торгов несостоявшимися, в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, возможна продажа лота этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

Затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, возмещаются победителем торгов.

Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление установленной формы (подробности по тел.) с приложением: копии платежного поручения о внесении суммы задатка, для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лиц – копия паспорта либо иного документа удостоверяющего личность.

Срок подачи заявления: с момента выхода настоящего объявления до 16:00 03.10.2012 года по адресу: г. Гомель, ул. Молодости, 5.

Дата, время, место проведения открытого аукциона: 05.10.2012 года в 12:00, г. Гомель, ул. Молодости, 5.

По вопросам участия в аукционе и приобретения имущества должника обращаться по телефонам: (8-029) 621-22-36, (8-029) 684-94-62 или тел./факс 8-0232-65-25-50.

Дополнительная информация: www.disponent.by.

ЯК БУДУЦЬ МЯНЯЦЦА ТАРЫФЫ НА ЭЛЕКТРАЭНЕРГІЮ ДЛЯ НАСЕЛЬНІЦТВА?

Укараненне дыферэнцыяванай аплаты адбудзецца не раней, чым з першых дзён 2013 года

ПРАПАНУЮЦЦА ДВА ВАРЫЯНТЫ

Спачатку трэба адзначыць, што за апошні час больш чым у 4 разы павялічыліся цэны на паліўна-энергетычныя рэсурсы для арганізацый, якія аказваюць жыллёва-камунальныя паслугі насельніцтву. Разам з тым, тарыфы на гэтыя паслугі за некалькі апошніх гадоў павялічваліся толькі ледзь-ледзь. Гэта тлумачыцца сацыяльна арыентаванай палітыкай дзяржавы.

Як паведамілі рэдакцыі ў Міністэрстве энергетыкі РБ, згодна з існуючымі тарыфамі на электраэнергію (290 руб./кВт·гадз.) насельніцтва зараз кампенсуе нават менш за 35% затрат адпаведных арганізацый на яе вытворчасць і дастаўку спажыўцу. За год страты энергетыкаў па аказанні такой паслугі насельніцтву складаюць каля 500 млн долараў.

Для ліквідавання такіх цэнавых дыспрапорцый былі распрацаваны і прапануюцца да грамадскага абмеркавання два варыянты фарміравання дзяржаўнай тарыфнай палітыкі ў галіне электразабеспячэння насельніцтва. Па кожным з варыянтаў прагназуецца да 2015 года павялічваць тарыфы на электраэнергію да таго ўзроўню, які будзе адпавядаць поўнаму пакрыццю эканамічна абгрунтаваных затрат на аказанне такіх паслуг.

У чым сутнасць гэтых варыянтаў, растлумачыў намеснік начальніка ўпраўлення эканамічнага аналізу і прагназавання галоўнага эканамічнага ўпраўлення Міністэрства энергетыкі Беларусі Канстанцін Аношанка.

Першы варыянт тычыцца ўкаранення дыферэнцыяванай аплаты насельніцтвам паслуг электразабеспячэння ў залежнасці ад аб'ёмаў спажывання. Гэты механізм аплаты прапануецца ажыццяўляць разам з паэтапным павялічэннем узроўню «базавага» тарыфу на электраэнергію ў звязцы з тэмпамі росту заробкаў і іншых даходаў насельніцтва. Распрацоўшчыкамі былі вызначаны льготныя аб'ёмы спажывання электраэнергіі на сям'ю ў залежнасці ад колькасці зарэгістраваных у жылым памяшканні чалавек, ад сезона і пліты (электрычная ці газавая). Такія льготныя аб'ёмы электраэнергіі будуць аплачвацца па «базавым» тарыфе.

Так, па стане на 1 верасня базавы тарыф для памяшканняў з электраплітой складае 250,6 руб. за 1 кВт·г, з газавай плітой — 295 руб. за 1 кВт·г.

ПРАПАНАВАНЫЯ ЛЬГОТНЫЯ АБ'ЁМЫ ЭЛЕКТРАСПАЖЫВАННЯ

Склад сям'і	Ільготны аб'ём на сям'ю за месяц, у кватэры (жылым доме) з электраплітой, кВт·г		Ільготны аб'ём на сям'ю ў месяц, у кватэры (жылым доме) з газавай плітой, кВт·г	
	з 1 красавіка па 30 верасня	з 1 кастрычніка па 31 сакавіка	з 1 красавіка па 30 верасня	з 1 кастрычніка па 31 сакавіка
1 чал.	120	135	70	80
2 чал.	140	155	85	95
3 чал.	160	175	100	110
4 чал.	180	195	115	125
5 чал.	200	215	130	140
6 чал.	220	235	145	155
7 чал. і больш	240	255	160	170

Электраэнергію звыш такіх ільготных аб'ёмаў прапануецца аплачваць па больш высокім тарыфе, які на 1 верасня складае 595 руб./кВт·г. Прагназуецца, што да 2015 года вялікі тарыф будзе цалкам пакрываць эканамічна абгрунтаваныя затраты на аказанне паслуг электразабеспячэння. Мяркуецца, што па больш высокім тарыфе будзе аплачвацца электраэнергія і ў жылых памяшканнях, дзе адсутнічаюць зарэгістраваныя грамадзяне.

ЯК ХУТКА ПАЧНЕ ДЗЕЙНІЧАЦЬ МЕХАНІЗМ ДЫФЕРЭНЦЫЯВАНАЙ АПЛАТЫ ЗА ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЬ?

Эксперты Мінэнерга падлічылі, што па гэтым варыянце неабходна ажыццявіць маштабны збор інфармацыі аб колькасці зарэгістраваных у жылых дамах (кватэрах) грамадзян, таму ўкараненне дыферэнцыяванай аплаты адбудзецца не раней, чым з першых дзён 2013 года. Каб новы механізм аплаты запрацаваў як гадзіннік, трэба правесці дадатковыя зверкі паказчыкаў прыбораў уліку электраэнергіі ў спажыўцоў, праверку плацяжоў, кантроль і актуалізацыю баз звестак па абанентах. Як гэты механізм будзе выкарыстоўвацца на практыцы?

Напрыклад, што будзе плаціць сям'я з трох чалавек у кватэры з электраплітой? Дапусцім, што гэтая сям'я ў студзені «спаліла» 200 кВт·г электрычнасці. Згодна з табліцай, для гэтай сям'і з кастрычніка па сакавік уключна вызначаны льготны аб'ём электраспажывання 175 кВт·г. Тады за студзень сям'я плаціць за 175 кВт·г па базавым тарыфе, а 25 кВт·г — па больш высокім тарыфе. У выніку кошт аплаты за электрычнасць складзе 58 тысяч 750 рублёў (175 х 250,6 + 25х595,9 = 58750). У параўнанні з дзейнай сістэмай аплаты паслуг за электрычнасць расходы такой сям'і павялічацца на 8 тысяч 630 рублёў (175 х 250,6 + 25 х 595,9 — 200 х 250,6 = 8 630).

Мяркуецца, што гэтая сям'я пачне больш рацыянальна спажываць электрычнасць, што дазволіць знізіць іх электраспажыванне на гэтыя 25 кВт·г. Пасля гэтага сям'я не будзе пераплочваць, а нават зэканоміць свае выдаткі на электрычнасць на 6 тысяч 270 рублёў.

❑ ❑ ❑

Сістэма дыферэнцыяванай аплаты за электрычнасць не будзе распаўсюджвацца на:

— сем'і, дзе ёсць ільготнікі па аплаце электраэнергіі;

— шматдзетныя сем'і і дзіцячыя дамы сямейнага тыпу;

— сем'і, што жывуць у жылых дамах ведамаснага жылога фонду, інтэрнатах;

— членаў садаводчых таварыстваў, дачных і гаражных кааператываў.

❑ ❑ ❑

Згодна з другім варыянтам, захоўваецца дзейная сістэма разлікаў з паэтапным больш інтэнсіўным павелічэннем да 2015 года тарыфаў на электрычную энергію для насельніцтва. Такая сістэма з'яўляецца больш простай і не патрабуе вызначэння гранічных аб'ёмаў электраспажывання, звыш якіх будзе ўжывацца павышаны тарыф.

Па пытаннях аплаты насельніцтвам паслуг электразабеспячэння ў Мінэнерга працуе «гарачая лінія» па тэлефоне: +375 (17) 218 29 96 у працоўныя дні з 8.30 да 12.30 і з 13.30 да 17.30. «Прамая тэлефонная лінія» па асобных пытаннях дыферэнцыяванай аплаты за электраэнергію запланавана 28 верасня па тэлефоне: +375 (17) 218 23 95 з 15 да 16 гадзін.

Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.

СЯБАР МОЙ, ЛІФТ

Чаму некаторыя людзі ставяцца да ліфта, як дзікуны?

Высотны дом нельга ўявіць без ліфта. Асабліва гэта адчуваецца тады, калі пад'ёмная машына чамусьці не працуе, і даводзіцца паднімацца па лесвіцы пешшу. Калі да ліфта ставіцца з пашанай — то ён і праслужыць доўгія гады. Але, на жаль, існуюць людзі, для якіх гэтае правіла — пусты гук. І няма розніцы, хто тут «пастараўся», хуліган-падлетак альбо дарослы чалавек, бо вынік адзін — ліфт псуецца. Вандал заўсёды разумее, на што ён ідзе і якія будуць наступствы.

Яшчэ адно набалелае пытанне — замена старых зношаных ліфтаў. У рознай ступені яно датычыцца шматпавярховак, пабудаваных да 1987 года ўключна. Пра гэта карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з намеснікам начальніка вытворчага аддзела ААТ «Ліфтсэрвіс» Віталём РУСЕЦКІМ.

— Ліфтавая гаспадарка ў сталіцы і вобласці падзелена паміж дзвюма арганізацыямі: нашай і ААТ «Белліфт». У Мінску мы абслугоўваем ліфты, якія знаходзяцца ў Маскоўскім, Кастрычніцкім і Фрунзенскім раёнах. Па Мінскай вобласці — 29 населеных пунктаў, сярод якіх такія буйныя гарады, як Слуцк, Маладзечна, Салігорск.

— Сапраўдны біч для ліфтаў — гэта вандалізм. Наколькі востра зараз стаіць гэта праблема?

— Мы працуем у цесным кантакце з органамі ўнутраных спраў. Напрыклад, быў выпадак, калі ў ліфце засела п'яная кампанія. Дзверы кабіны адчынялі ў прысутнасці міліцыі — ці мала што яны маглі ўтварыць у кабіне. За час працы давялося шмат чаго пабачыць — і адарваныя «з мясам» панелі, і падпаленыя плафоны, і размаляваныя сцены... Але так і не зразумеў аднаго: чаму ж некаторыя людзі ставяцца да ліфта, як дзікуны? Яны быццам жывуць па прынцыпе: калі не маё — то магу рабіць, што хачу. Але ж потым самі і ездзяць на ліфтах з такой «наскальнай творчасцю». За 8 месяцаў 2012 года ўжо зарэгістравана 40 выпадкаў вандалізму.

Некалькі гадоў таму, калі я працаваў прарабам у Маскоўскім раёне сталіцы, невядомыя абдзіралі з дзвярэй ліфтаў у жылых дамах алюмініевыя пласціны. У выніку ўтвараліся велізарныя дзіркі і эксплуатаваць пад'ёмныя машыны было нельга. І вось аднойчы паступіў сігнал ад прыбіральшчыцы дома што ў кабіне ліфта раздаюцца гукі, быццам нехта штосьці спрабуе ададраць. Адразу на месца падзей выехала міліцыя. Аказалася, што кабіну спрабавалі раскурочыць некалькі няпоўнагадовых. У выніку іх бацькі заплацілі буйны штраф.

У пазамінулым дзесяцігоддзі масавыя крадзяжы абсталявання адбываліся таму, што ліфты былі падключаны да састарэлай сістэмы дыспетчарскага кантролю. Не падаваўся сігнал аб несанкцыянаваным пранікненні пабочных асоб у машыннае аддзяленне. Гэтыя хібы выпраўлены на новых ліфтах, а на старых пад'ёмніках паступова выпраўляюцца. Да таго ж старыя паступова адпраўляюцца на замену. На гэтым шляху ёсць толькі адна перашкода — недахоп сродкаў. Але мы робім усё магчымае, каб зладзеі беспакарана не квапіліся на абсталяванне.

— Вы ўзгадалі пра замену. Нарматыўны тэрмін службы ліфта — 25 гадоў. Што адбываецца з машынай, калі яна дасягнула гэтага ўзросту?

— Ліфт чакае тэхнічнае дыягнаставанне. Дазвол на яго далейшую эксплуатацыю выдае незалежны эксперт. Але гэты дазвол дзейнічае не больш за тры гады — у залежнасці ад стану ліфта. Пасля працэдура паўтараецца. Калі ж эксперт выносіць рэкамендацыю аб замене ліфта — эксплуатацыя адразу ж спыняецца. Але баяцца старой машыны не трэба, таму што арганізацыя, якая яе абслугоўвае, робіць усё, каб забяспечваць бяспечную эксплуатацыю. Каб паездка была менавіта такой, трэба выконваць простыя правілы карыстання. Калі ж адбылася нейкая няштатная сітуацыя — трэба звязацца з дыспетчарам...

— І як доўга працягваецца замена?

— Па-першае, гэта залежыць ад спецыфікі ліфта. Па-другое, на тэрмін замены ўплывае колькасць паверхаў. Як правіла, звычайна ліфт мяняюць на працягу ад аднаго да двух месяцаў. Пры гэтым жылыя дамы маюць прыярытэт.

— А як дорага замена абыходзіцца?

— Гэтая сума вызначаецца ў час правядзення тэндара. Яго выйграе тая арганізацыя, якая прапануе найменшыя выдаткі. Стандартны пасажырскі ліфт, які разлічаны на 9 паверхаў, каштуе 140-150 мільёнаў рублёў. Але да гэтай сумы неабходна дадаць кошт мантажных работ. Ён вагаецца ў гэтых жа межах. Дарэчы, работы выконваюцца з мінімальнай рэнтабельнасцю.

— Што хутчэй: тэмпы замены ліфтаў альбо тэмпы старэння?

— На сёння хуткасць старэння ліфтаў вышэйшая. Гэта звязана з тым, што 25 гадоў таму актыўна забудоўваліся вялізныя мікрараёны Кунцаўшчына, Захад, Паўднёвы Захад, Малінаўка. Некалькі лічбаў — усяго мы абслугоўваем 8887 ліфтаў, з якіх 7510 — пасажырскія. З іх больш за 25 гадоў адпрацавала 2081 машына, у тым ліку тэрмін эксплуатацыі 760 пераваліў за 30 гадоў.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

ІНФАРМАЦЫЯ ДЛЯ РОЗДУМУ:

Закон не прадугледжвае літасці да вандалаў. Артыкул 10.9 Кодэкса аб адміністратыўных правапарушэннях прадугледжвае штраф памерам да 50 базавых велічынь. На сёння гэтая сума складае 5 млн рублёў. Куды больш жорсткі артыкул 218 Крымінальнага Кодэкса. Калі шкода прычынена ў буйных памерах, то вандал рызыкуе пазбавіцца волі на тэрмін ад 3 да 10 гадоў.

ЦІКАВА:

✓Самы стары пасажырскі ліфт, які знаходзіцца на абслугоўванні ААТ «Ліфтсэрвіс», размешчаны па вуліцы Данілы Сердзіча, 3. Ён пачаў вазіць людзей яшчэ ў далёкім 1971 годзе. Але, па словах Віталя Русецкага, у ліставпадзе пад'ёмную машыну чакае тэхнічнае дыягнаставанне, таму далейшы лёс «рэкардсмена» пакуль невядомы.

✓Самыя высотныя пасажырскія ліфты ўсталяваны ў дамах 82 і 84 па праспекце Дзяржынскага. Яны давязуць да 25 паверха.

✓А самая мініяцюрная пад'ёмная машына знаходзіцца на вуліцы Кірава, 1 — у доме з гадзіннікам насупраць чыгуначнага вакзала. Яна здольна падняць за раз не больш за трох чалавек.

НА ЧЫМ ЭКАНОМІЦЬ БЕЗ СТРАТЫ КАМФОРТУ



Як адзначаюць энергетыкі, дыферэнцыяваная аплата за электраэнергію, магчыма, пачне дзейнічаць не раней, чым у наступным годзе. Аднак ужо зараз больш клапатлівыя сем'і могуць вызначыць пэўныя пазіцыі бытавых прыбораў, на якіх можна дасягнуць сур'ёзнай эканоміі спажывання электрычнасці.

Напрыклад, я днямі правёў «грамадскае» міні-абмеркаванне ў сваёй сям'і, калі і высветліў некалькі слабых пазіцый па «з'яданні» электрычнасці.

У першую чаргу я пачаў разбірацца з дзецьмі наконт камп'ютара. Звычайна ў працоўныя дні гэты «сябар» маіх дачок функцыянуе не больш за адну-дзве гадзіны, аднак у выхадныя на працягу сутак ён свеціцца ўжо каля 5—6 гадзін. Атрымліваецца, што камп'ютар магутнасцю 0,4 кВт·г толькі за выхадныя спажывае амаль 5 кВт·г. Час такой забаўляльнай праграмы ля камп'ютара мы вырашылі ў выхадныя скараціць амаль удвая.

Самым «пражэрлівым» прыборам у нашай сям'і з'яўляецца пральная машына з магутнасцю 2,3 кВт·г. Паколькі ў сям'і трое дзетак, то мы ўключаем яе амаль штодзённа па 1,5 гадзіны. А гэта ўжо 3,45 кВт·г за суткі, але бывае нават больш, калі старэйшая дачка вырашыць памыць у паўпустой машыне толькі некалькі сваіх рэчаў. Ад гэтай практыкі таксама вырашылі адмовіцца.

Балючай тэмай, ужо для мяне, стала работа тэлевізара. У выхадныя, калі на двары дрэннае надвор'е, гэты «блакітны» таварыш свеціць амаль увесь час, пакуль я дома. Ён з'яўляецца нейкім абавязковым фонам нават тады, калі яго ніхто не глядзіць. І ад гэтай дрэннай звычкі нам неабходна будзе адмовіцца, бо... Тэлевізар цягне ўсяго 0,3 кВт·г, але калі ён працуе 12 гадзін на суткі, то «з'ядае» ўжо амаль 4 кВт·г.

Недзе каля 2 кВт.г забіраюць электрачайнік, прас і мікрахвалёўка, але карыстаемся мы гэтымі прыборамі вельмі кароткі час і выключна раніцай, калі без іх аніяк.

Пэўныя спрэчкі былі ў нас вакол халадзільніка. Магутнасць яго толькі 0,5 кВт·г і дзейнічае гэты прыбор у актыўным рэжыме каля 1,4 гадзіны на суткі. Аднак трэба ўлічваць, што столькі ён працуе толькі па тэхпашпарце. А вось калі адчыняць халадзільнік праз кожную гадзіну або працяглы час выбіраць сабе там нешта тое, чаго і сам яшчэ не ведаеш... У гэтым выпадку халадзільнік пачне «паліць» электрычнасць ужо значна мацней.

Сяргей ПАЛІНІН.

Як рыбаловам-аматарам пазбегнуць ненаўмыснага браканьерства?

У гэтым ім дапаможа даведнік «Рыбачым па правілах». Як вядома, аматарскае рыбалоўства ў Беларусі рэгулюецца Правіламі вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства, зацверджанымі Указам Прэзідэнта ад 8 снежня 2005 года. Правілы ўяўляюць сабой даволі аб'ёмны дакумент, арыентаваны ў першую чаргу на спецыялістаў. Таму для зручнасці звычайных рыбаловаў выдалі даведнік «Рыбачым па правілах».

У ім сістэматызаваны тыя палажэнні Правілаў, якія непасрэдна датычацца аматарскай рыбнай лоўлі. Даведнік таксама мае за мэту і павышэнне экалагічнай свядомасці і адукаванасці, і захаванне правілаў рыбалоўства. Гэтае папулярнае выданне падрыхтавана ў рамках сумеснага праекта Праграмы развіцця ААН і Глабальнага экалагічнага фонду пад скарочанай назвай «Біяразнастайнасць». У ролі нацыянальнага выканаўчага агенцтва праекта выступае Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

Менеджар праекта «Біяразнастайнасць» Уладзімір Калтуноў заўважае: «Колькасць аматараў рыбалкі няўхільна расце з кожным годам. Аднак далёка не ўсе рыбакі з вялікім стажам змогуць адрозніць, напрыклад, «чырвонакніжную» рыбу кумжу, якая адносіцца да самай высокай катэгорыі аховы, ад чужароднай стронгі вясёлкавай. Таму адна з задач даведніка нагадаць рыбаловам-аматарам пра тыя віды рыб, якія ўключаны ў Чырвоную кнігу Беларусі і павінны быць неадкладна выпушчаны ў вадаём у выпадку іх вылаву.

Аўтар даведніка, загадчык лабараторыі іхтыялогіі Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па біярэсурсах Віктар Рызеўскі, гаворыць, што згодна з заканадаўствам любое парушэнне Правілаў з'яўляецца браканьерствам. З іншага боку, каб бездакорна выконваць Правілы, трэба іх дакладна ведаць. У гэтым сэнсе выданне «Рыбачым па правілах» дапаможа рыбаловам-аматарам выконваць прыродаахоўнае заканадаўства».

Леанід ТУГАРЫН.

■ Здарэнні

ДЗІК НАПАЎ НА ЧАЛАВЕКА

Няшчасце прыйшло ў вёску Маладзельчыцы Пінскага раёна з лесу. У чацвер апоўдні 75-гадовая Любоў Лосіч займалася ў двары па гаспадарцы, калі да яе на падворак забег вялікі дзік.

Жывёліна выскачыла з кукурузы, якая расце праз дарогу. На кукурузнае поле зайшла тэхніка. Магчыма, гул матораў напалохаў ляснога прышэльца, і ён пабег, куды вочы глядзяць, расказала па тэлефоне пенсіянерка. Любоў Фёдараўна перапужалася і ўскочыла ва ўласны хлеў, а дзік пачаў бегаць па агародзе і падворку. Жанчына паклікала на дапамогу...

Калі прыйшлі людзі, дзікі кабан праламаў плот, выскачыў да суседа, там таксама праламаў плот і пабег далей. Пазней Любоў Лосіч даведалася, што праз два дамы жывёліна напала на аднавяскоўца, 74-гадовага Канстанціна Лосіча, і моцна яго параніла. Пенсіянера забрала «хуткая», яго давялося шпіталізаваць. А Любоў Фёдараўна, паводле яе слоў, пакуль не здолела поўнасцю адысці ад шоку...

Як паведамілі ў Брэсцкай абласной інспекцыі па ахове раслінага і жывёльнага свету, прычынай такіх паводзін дзікай жывёліны стаў няправільны падыход да ўборкі асобна ўзятага поля. Кукурузны клін трэба дзяліць на дзве паловы, а не ўбіраць па крузе, каб не даць тым самым магчымасці дзікім жывёлам уцячы. Прынамсі, пачынаць уборку варта ад населенага пункта, а не ад лесу. Дзік проста шукаў выхад і, спалоханы тэхнікай і людзьмі, праявіў агрэсію.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ВЫБУХ НА БУДАЎНІЧАЙ ПЛЯЦОЎЦЫ

У Полацку на тэрыторыі новабудоўлі шматкватэрнага жылога дома на вуліцы Іаана Дойліда ў выніку выбуху загінуў 22-гадовы зваршчык замежнага прыватнага ўнітарнага будаўнічага прадпрыемства, яшчэ адзін рабочы быў паранены.

— А першай гадзіне дня ў службу выратавання паступіла паведамленне пра выбух на будаўнічай пляцоўцы невядомага прадмета. Мяркуецца, выбухнула граната часоў Вялікай Айчыннай вайны, — паведамляюць у Віцебскім абласным управленні па надзвычайных сітуацыях. — У выніку выбуху загінуў грамадзянін 1990 года нараджэння, зваршчык прадпрыемства «Натурыба-Полацк». Пацярпеў грамадзянін 1964 года нараджэння, мантажнік будаўніча-мантажнага трэста № 22, які з траўмамі рознай ступені цяжару шпіталізаваны. Канкрэтная прычына выбуху высвятляецца.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

НЕ ЎЗЛЮБІЎ «ФОРДЫ»

Знаходзячыся пад уздзеяннем наркотыку, 27-гадовы непрацуючы здзейсніў за ноч серыю злачынстваў: сагнаў два «Форды», з трэцяга скраў магнітолу.

— Спачатку на вуліцы Цікоцкага маладзёну «прыглянуўся» мікрааўтобус «Форд-Транзіт». Пры дапамозе адвёрткі ён выцяснуў шкло пасажырскіх дзвярэй, дастаў аўтамагнітолу, а з бардачка — ключы. Падсілкаваўшыся знойдзенай там жа цукеркай, хлопец вырашыў аднесці магнітолу дадому, — расказала прэс-афіцэр Першамайскага РУУС г.Мінска Вольга Куцько. — Аднак каля суседняга дома грамадзянін звярнуў увагу на ўніверсал «Форд-Сьера». Выкарыстаўшы скрадзеныя з «Транзіта» ключы, ён ускрыў вадзіцельскія дзверы і сагнаў машыну. Яе хлопец вырашыў схаваць на дачы ў Астрашыцкім гарадку, аднак на паўдарозе падумаў, што не будзе на чым вярнуцца назад, таму зноў паехаў у горад. Аўтамабіль ён пакінуў на вуліцы непадалёку ад дома, але, сыходзячы, дастаў з салона акустычную калонку. Занёс яе і магнітолу з «Транзіта» ў кватэру, пасля чаго зноў спусціўся на вуліцу. Праходзячы ўздоўж бліжэйшай аўтастаянкі, маладзён звярнуў увагу яшчэ на адзін універсал «Форд». Зноў узламаў замкі, завёў рухавік і перагнаў машыну ў суседні двор. Пасля зняў з двух скрадзеных аўтамабіляў рэгістрацыйныя нумары і схаваў іх пад сядзеннямі. Ранкам уладальнікі машын звярнуліся ў міліцыю. Неўзабаве падазроны ва ўчыненні згонаў быў затрыманы. Хлопец расказаў, што скрадзеныя аўто, калі б іх не знайшлі, планаваў разабраць і прадаць па запчастках.

Сяргей РАСОЛЬКА

■ Кватэрнае пытанне

КАЛІ ДОМ ПАДАРЫЦЬ ВЫГАДНА

Мы, сям'я з чатырох чалавек (сужэнцы і двое непаўналетніх дзяцей), жывём у ведамасным інтэрнаце, знаходзімся на ўліку асоб з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў. І нават мяркуем, што ў хуткім часе нас могуць уключыць у склад ЖБК, які фарміруецца з выкарыстаннем ільготнага крэдыту. Ці паўплывае на яго памеры тое, што ў спадчыну ад бацькоў нам дастаўся стары драўляны дом (яго знос у 2011 годзе складаў 67%)?

Л. ЕРМАЛОВІЧ, *г. Баранавічы.*

Неабходна мець на ўвазе, што пры будаўніцтве жылля ў складзе ЖБК з выкарыстаннем ільготнага крэдыту будзе ўлічвацца прадугледжанае падп. 1.6 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 6 студзеня 2012 г. № 13 правіла па ўліку агульнай плошчы жылога памяшкання, якая знаходзіцца ва ўласнасці крэдытаатрымальніка (а таксама і адчужанай крэдытаатрымальнікам і (або) членамі яго сям'і на працягу 3 гадоў да заключэння крэдытнага дагавора), пры вызначэнні памеру крэдыту, які выдзяляецца.

Агульная плошча жылога памяшкання, што прымаецца ў разлік пры вызначэнні велічыні ільготнага крэдыту (так званы «нармаваны памер агульнай плошчы жылога памяшкання»), вызначаецца з улікам устаноўленых у падп. 1.5 Указа № 13 нарматываў і агульнай плошчы жылых памяшканняў, якія знаходзяцца (знаходзіліся) ва ўласнасці ў крэдытаатрымальніка і (або) членаў яго сям'і (у тым ліку агульнай плошчы жылых памяшканняў, якая прыпадае на долі ў праве агульнай уласнасці на жылыя памяшканні, якія належаць (належалі) грамадзяніну і (або) членам яго сям'і), размешчаных у любых населеных пунктах Рэспублікі Беларусь.

У выпадку бязвыплатнай перадачы па дагаворы дарэння крэдытаатрымальнікамі і (або) членамі іх сем'яў жылых памяшканняў (доляў у праве агульнай уласнасці на жылыя памяшканні), у тым ліку прызнаных у вызначаным парадку непрыдатнымі для пражывання, мясцоваму выканаўчаму або распарадчаму органу, нармаваныя памеры агульнай плошчы жылога памяшкання для вызначэння велічыні ільготнага крэдыту прымаюцца ў разлік у вызначаным парадку без уліку плошчы перададзеных жылых памяшканняў (плошчы жылых памяшканняў, якая прыпадае на перададзеныя долі ў праве агульнай уласнасці на жылыя памяшканні).

Віктар САВІЦКІ

■ Наваселле

ПЫТАННЕ З ЧАРГОЙ ЗАКРЫТА

Дзіцячы садок для Лінова — амаль што стратэгічны аб'ект

У суботу ў вёсцы Лінова Пружанскага раёна адбудзецца свята — афіцыйнае адкрыццё дзіцячага садка. Гэтай падзеі тут асабліва чакалі: стары садок даўно не ўмяшчае ўсіх сельскіх дзяцей. Дашкольным выхаваннем ахоплены прыкладна паўсотні малых, яшчэ столькі стаялі ў чарзе на месца.

Будоўля на месцы былога поля сельгаспрадпрыемства пачалася ў 2010 годзе. А праз год вёска літаральна пяражыла бум нараджальнасці. У 2011 годзе на свет з'явілася 53 немаўляці. Для параўнання: з пачатку сёлетняга года нарадзілася толькі 15 дзетак, гэта сярэдняя за апошнія пяць гадоў лічба. Старшыня сельсавета Людміла Жогал тлумачыць леташні ўсплеск нараджальнасці вельмі проста: «Паглядзелі нашы матулькі, што на будоўлі закіпела работа, вось і адважыліся павялічыць сям'ю».

Ну і праўда, у такі садок грэх не прывесці дачку ці сына. Многім гарадскім дашкольным установам нават марыць пра падобны ўзровень не выпадае. Двухпавярховы прасторны будынак з басейнам разлічаны, паводле праекта, на 95 месцаў. Для знаходжання, выхавання, развіцця дзяцей ёсць усё. Выхавацелька Ірына Патапчук, якая рыхтавала да навасельля сяроднюю групу, з задавальненнем паказала свае апартаменты. Зручная прыгожая мэбля, мноства цацак, матэрыял для заняткаў — усё знаходзілася ў групе, трэба было толькі астатняе расставіць на паліцах. У вочы кінуўся мініяцюрны мяккі гарнітур, на якім важна сядзелі прыбраныя лялькі. Аказалася, Пружанскі КБА вырабляе такую арыгінальную мэблю. На канапе, у крэслах, вядома, змогуць пасядзець не толькі лялькі, але і дзеці.

Памочніца выхавальніка тым часам засцілала ложкі і наводзіла апошні бляск у спальні. Тут нават посцілкі і бялізна падабраны з густам і ў тон дыванам, якія ляжаць на падлозе.

Загадчыца ясляў-садка Святлана Гардзіеўская расказала, што ў панядзелак сюды прыйдуць роўна сто дзяцей. І пытанне з чаргой у яслі альбо сад для Лінова будзе закрыта. Усе бацькі змогуць атрымаць месца свайму дашкольніку. І Святлана Міхайлаўна, і старшыня сельсавета Людміла Канстанцінаўна дапамагалі рабочым наносіць апошнія штрыхі добраўпарадкавання. Рукі па локаць у пяску, але твары свецяцца радасцю.

— Мы столькі чакалі гэтага сада, — гаворыць Людміла Жогал. — Гэта ж для нас амаль стратэгічны аб'ект. Лінова паспяхова развіваецца як аграгарадок. Тут шмат прадпрыемстваў: Аранчыцкая птушкафабрыка, хлебапрыёмнае прадпрыемства, чыгуначная станцыя, база райсельгасагразабеспячэння, лясніцтва, сельгаспрадпрыемства, у нас больш за дзясятак розных крам і пунктаў харчавання. Маладыя сем'і актыўна купляюць і будуюць жыллё. Праца ёсць, але некаторыя матулі вымушаны былі сядзець дома, бо не было куды дзець дзіця. А цяпер, як бачыце, пытанне вырашана.

Грошы на фінансаванне будаўніцтва выдаткаваны з абласнога бюджэту. У вёсцы чакаюць, што перарэзаць сімвалічную стужку прыедзе губернатар вобласці Канстанцін Сумар.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота аўтара.

Пружанскі раён

Загадчыца Святлана ГАРДЗІЕЎСКАЯ вешае шыльду.

Навагрудскія вышыні

УСЕ прывыклі згадваць пра багатую гістарычную спадчыну Навагрудчыны. Навагрудак, які некалі быў сталіцай Вялікага Княства Літоўскага, надзвычай прывабны для турыстаў горад. Аднак у гэтым матэрыяле мы хочам расказаць пра сучасную Навагрудчыну, край, у якім паспяхова вырашаюцца шматлікія пытанні развіцця прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, сацыяльнай сферы, надаецца пільная ўвага добраўпарадкаванню населеных пунктаў.



Навагрудская зямля ўзгадавала 8 Герояў Сацыялістычнай Працы, вялікую кагорту перадавікоў сельскагаспадарчай вытворчасці, якія за сваю самаадданую працу ўдастоены высокіх узнагарод Радзімы.

Ужо ў цяперашнім, XXI стагоддзі неаднойчы пераможцамі рэспубліканскага спаборніцтва на жніве станавіліся іх перадавыя камбайнеры Генадзь Клімко і Леанід Дарашкевіч.

Навагрудскі раённы выканаўчы камітэт.

Менавіта Навагрудскаму раёну даверана правесці сёлета свята працаўнікоў вёскі Прынёманскага краю.

Старшыня Навагрудскага райвыканкама Анатоль Маркевіч упэўнены, што ***сельскагаспадарчая галіна*** на Навагрудчыне мае добрыя перспектывы для далейшага развіцця.

Развіццё аграрнага сектара — адзін з найбольш важных кірункаў у дзейнасці мясцовых органаў улады раёна. Традыцыі дасягнення высокіх паказчыкаў у галіне сельгасвытворчасці на Навагрудчыне закладзены працаўнікамі вёскі мінулых пакаленняў.

Сёння сельскагаспадарчая вытворчасць на аснове ўкаранення сучасных тэхналогій выходзіць на новы якасны ўзровень.

Разам з тым, вельмі важна не толькі ўкараняць новую тэхніку, але і на поўную моц задзейнічаць чалавечы фактар, забяспечыць умелае гаспадаранне, аб'яднаць арганізатарскія здольнасці кіраўнікоў, прафесійныя веды спецыялістаў, добрасумленную працу работнікаў масавых прафесій.

Будаўніцтва новых і тэхнічнае перааснашчэнне існуючых фермаў, стварэнне трывалай кармавой базы, памножанае на старанную працу жывёлаводаў, дапамагае зрабіць жывёлагадоўчую галіну больш эфектыўнай і прыбытковай.

Сёння грашовыя паступленні ад жывёлагадоўлі складаюць 65% ад прыбытку ўсёй сельскагаспадарчай галіны раёна.

На думку старшыні райвыканкама, асаблівым гонарам Навагрудчыны з'яўляюцца ***прамысловыя прадпрыемствы.*** Некаторыя з іх добра вядомыя не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Навагрудскі завод газавай апаратуры займае лідзіруючыя пазіцыі на прасторах СНД.

Прамысловы комплекс раёна паспяхова выконвае планавыя паказчыкі.

Сёння прадпрыемствы ўзначальваюць сур'ёзныя, кампетэнтныя кіраўнікі, якія думаюць не толькі пра сённяшні дзень, але і пра перспектыву развіцця калектываў. Гэта найперш датычыцца заводаў газавай апаратуры і металавырабаў, прадпрыемстваў «БелКрэда» і «Правіт-Бел», хлебазавода, завода па вытворчасці вінаў і іншых.

Каля 43% паступленняў у раённы бюджэт — гэта падаткі прамысловых прадпрыемстваў.

Ёсць перспектыва, як адзначыў Анатоль Мечыслававіч, і ў развіцці ***будаўнічага комплексу.***

У раёне працуюць тры будаўнічыя арганізацыі, якія маюць шматгадовы вопыт узвядзення значных аб'ектаў і добрую вытворчую базу.

Ёсць таксама чатыры прыватныя будаўнічыя арганізацыі, якія з'явіліся ў апошія гады, але ўжо здольныя спраўляцца са значнымі аб'ёмамі работ.

Сёння ў Навагрудку выконваецца вялікі аб'ём работ па добраўпарадкаванні і рэканструкцыі вуліц, дваровых тэрыторый, асобных будынкаў. Пасля іх завяршэння Навагрудак не толькі ў цэнтральнай частцы, але і ў некаторых аддаленых ад цэнтра мікрараёнах набудзе новы, больш прывабны выгляд.

Вельмі актуальнай для Навагрудка з'яўляецца рэканструкцыя раённага Дома культуры.

Начальнік управўлення капітальнага будаўніцтва Навагрудскага райвыканкама Кацярына Кузьміч адзначыла, што Навагрудскі раённы Дом культуры з'яўляецца помнікам архітэктуры і занесены ў адпаведны рэестр Міністэрства культуры.

Яго рэканструкцыя вядзецца згодна з праектнай дакументацыяй, якая была распрацавана ў 2010 годзе бюро ТДА «Відзіарх».

Дакументацыя на рэстаўрацыю фасада падрыхтавана ў ААТ «Праектрэстаўрацыя». Правядзенне работ па рэстаўрацыі фасада ўзгоднена з упраўленнем па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры. Па здымках пачатку XX ст. вызначалася сапраўднае месца знаходжання вокнаў на фасадзе, бо апошнім часам яны размяшчаліся не адпаведна першапачатковаму выгляду. Гістарычная каштоўнасць помніка пры рэканструкцыі захаваецца.

На другім паверсе будзе размяшчацца актавая зала, а на першым — танцавальная зала і памяшканні для работы гурткоў.

Вядуцца работы па рамонце і рэканструкцыі гарадскога кінатэатра. Плануецца ўстанавіць сучасную апаратуру, зрабіць у памяшканні кінатэатра кавярню.

Ёсць таксама ідэя пабудаваць дзіцячую кавярню ля гандлёвага цэнтра «Поні».

Вельмі сур'ёзнай і адказнай для горада справай, на думку Маркевіча, з'яўляецца рэканструкцыя вуліц. У папярэднія гады былі выкананы работы па рэканструкцыі вуліц Міцкевіча, Мінскай, часткова Савецкай. Але ўсё ж у такіх аб'ёмах, як цяпер, работы раней не вяліся.

Як адзначыла Кацярына Кузьміч, у час рэканструкцыі перакладваюцца ўсе інжынерныя камунікацыі, што знаходзяцца ў зямлі: ліўнёўка, вадаправод, фекальная каналізацыя, кабелі, электраасвятленне. Усе работы выконваюцца згодна з сучаснымі стандартамі. З улікам прыродных асаблівасцяў горада, іншы парадак правядзення работ па добраўпарадкаванні быў бы марнаваннем сродкаў.



Вялікі аб'ём работ выконваецца на вуліцах Валчэцкага, Савецкай, Спартыўнай, Юбілейнай, Паштовай, Скарыны. Значны аб'ём работ робіцца сіламі раённых арганізацый.

Падчас правядзення работ па добраўпарадкаванні дваровых тэрыторый на дзіцячых пляцоўках з'яўляецца новае абсталяванне: сёлета будзе ўстаноўлена дзесяць камплектаў каруселяў.

Адноўлены харчблок у 1-й гарадской школе.

Вядзецца работа па зносе старых запушчаных дамоў і гаспадарчых пабудоў.

У Навагрудку не забываюць і пра новабудоўлі. Сёлета ўжо здадзены тры 40-кватэрныя жылыя дамы і адзін 20-кватэрны. Да канца года плануецца здаць яшчэ адзін 40-кватэрны дом.

Асаблівы гонар Навагрудка — дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці №1. У верасні ў ім запрацаваў уласны адноўлены басейн, на рамонт якога патрачана звыш 750 млн руб.

Загадчыца дашкольнага цэнтра развіцця дзіцяці №1 Надзея Сцяфюк падкрэсліла, што менавіта гэтая дашкольная ўстанова карыстаецца асаблівым попытам у бацькоў. Зараз тут выхоўваецца 230 дзяцей, адробяць масаж, прадастаўляюць фітатэрапію, даюць вітаміны. Працуе пункт карэкцыйна-педагагічнай дапамогі. Адкрыццё басейна дазволіць яшчэ больш умацаваць здароўе дзяцей. Усе выхаванцы дашкольнай установы будуць умець плаваць. Выхаванцы цэнтра, на думку Надзеі Рыгораўны, смелыя і адкрытыя. Яны з лёгкасцю наладжваюць зносіны з іншымі, імкнуцца сябе праявіць.

Варта ўзгадаць, што Навагрудак — самы «высокі» населены пункт у Беларусі: Замкавая гара «ўзнялася» на вышыню 323 метраў над узроўнем мора.

Старшыня райвыканкама Анатолій Мечыслававіч Маркевіч лічыць, што такое выгаднае геаграфічнае становішча нельга пакінуць без увагі. Яго плануецца выкарыстоўваць для атрымання альтэрнатыўных крыніц энергіі. Ужо дзейнічае адна ветраэнергетычная ўстаноўка. Сёлета плануецца ўступленне ў Пакт мэраў. Гэтая сусветная арганізацыя якраз займаецца менавіта пытаннямі ўзнаўляльных крыніц энергіі. У Навагрудку прымалі італьянскіх прадстаўнікоў, пачулі іх уражанні, думкі. Стала зразумела, што гэта таксама эфектыўны кірунак у працы.

Можна яшчэ шмат расказваць пра ўсё тое, што ёсць ці хутка з'явіцца ў Навагрудку. Але, як той казаў, лепш адзін раз убачыць, чым сто разоў пачуць. Таму правядзенне ў гэтым годзе ў Навагрудку абласнога свята працаўнікоў вёскі Прынёманскага краю — добрая нагода яшчэ раз пабываць у гэтым слынным горадзе.

Памятны знак, установлены ў гонар 500-годдзя атрыманням Навагрудкам Магдэбурскага права (аўтар Генадзь Буралкін).

Сыр, масла, смятана — усё з Навагрудка: самыя смачныя, самыя любімыя

Натуральныя прадукты без фарбавальнікаў, стабілізатараў, прыемныя на смак, з максімальным для іх тэрмінам прыдатнасці. Думаеце, такое бывае толькі на падворку ўласнай бабулі? Аказваецца, не. Навагрудскі масларобчы камбінат выпускае высакаякасную натуральную прадукцыю, да таго ж і вельмі смачную. Ніякіх дабавак і такі прыемны, амаль забыты хатні смак. Гэта вялікая нечаканасць, калі на паліцах крам раптам знаходзіш тое, што нагадвае «сваё». «Навагрудскімі дарамі» ласавацца можна бясконца, і пры гэтым быць упэўненым, што малако застаецца малаком, а не вадой, а тварог, акрамя адпаведнай тлустасці, змяшчае яшчэ і вугляводы, і карысныя мінералы. А шырокая лінейка сыроў Навагрудскага масларобчага не пакіне абыякавым ніводнага гурмана.

Сырная палітра

Пад маркай «Навагрудскія дары» выходзіць ажно 25 розных гатункаў сыроў. Побач з сырам «Галандскі прэміум», што даўно палюбіўся пакупнікам, з'явіўся «Галандскі Экстра». Сыры спеюць у спецыяльных трохслойных пакетах, што выпускаюць вуглякіслы газ на паверхню, аднак не дазваляюць паветру трапляць унутр. Гэта захоўвае сыр, за ім трэба менш даглядаць — усушка амаль не адбываецца, цвіль не з'яўляецца. Такі сыр пасля не трэба ні мыць, ні ўпакоўваць — ён адразу захаваны, таму застаецца сапраўдным сырам.

Цвёрдыя сычужныя сыры традыцыйна маюць сваіх прыхільнікаў. У Навагрудку яны вырабляюцца на сучаснай аўтаматызаванай лініі, запушчанай некалькі гадоў таму. Прымяненне ручной працы стала мінімальным, зараз майстар-сыradзел, сырасол і прэсоўшчык за адну змену могуць вырабляць да 10 тон прадукту.

Сыры «Любчанскі», «Паўночны» маюць асаблівы смак, карыстаюцца попытам і «Эдам Навагрудскі», «Гаўда-Бел», «Сметанковы асаблівы».

З выкарыстаннем прапіёнава-кіслых бактэрый вырабляецца «Мантэрэй». Яшчэ адна яго асаблівасць — такія апетытна-запамінальныя дзірачкі.

Знакамітая саломка сырная да піва — таксама натуральны прадукт. У ёй няма канцэрагенаў, таму яе можна лічыць годнай альтэрнатывай шкодным для здароўя чыпсам. Першымі ў Беларусі навагрудчане сталі вырабляць сыр з чэдарызацыяй сырнай масы — «Чэддзербел». Дакумент на яго распрацаваў Інстытут мяса-малочнай прамысловасці. Гэты сыр даражэйшы за іншыя, бо з'яўляецца высакатлустым вытрыманым сырам і мае спецыфічны смак з кіслінкай.

Усур'ёз думалі на прадпрыемстве і пра вытворчасць сыру з цвіллю — мелі і распрацаваныя дакументы, і фірму-пастаўшчыка абсталявання, і назву. Аднак пакуль з-за адсутнасці крэдыту і свабодных уласных сродкаў ажыццяўленне ідэі застаецца ў перспектыве.

Дарэчы, тэрмін прыдатнасці сыроў, дзякуючы выкарыстанню найноўшага абсталявання, падоўжаны да шасці месяцаў, што робіць іх канкурэнтаздольнымі на рынку аналагічнай прадукцыі.

Тэрмін прыдатнасці — справа гонару

Масла «Крестьянское» і салодкавяршковае знайсці можна нават на паліцах сталічных крам. Здаецца, смачнейшым масла быць і не можа. А вялікая колькасць узнагарод на многіх конкурсах пацвярджае яшчэ і добрую якасць. Узнагароды маюць і батончыкі «Маркіз», і сыркі нятлустыя.

Ёгурты «Навагрудскіх дароў» з'яўляюцца «жывымі», бо, як і належыць сапраўдным ёгуртам, каб не ахвяраваць карыснымі рэчывамі, захоўваюцца да 10 сутак; малако — да 5 сутак. Тэрмін прыдатнасці прадуктаў — справа гонару для Навагрудскага масларобчага». Яны ніколі не дазволяць сабе падмануць пакупніка, працягнуўшы тэрмін рэалізацыі, пры гэтым пазбавіўшы малочную прадукцыю яе прыродных карысных уласцівасцяў. Зразумела, што наладзіць шырокі продаж такіх тавараў больш складана, чым тых, што маюць працяглы тэрмін захоўвання. Аднак разумны пакупнік, што дбае пра здароўе сабе і сваёй сям'і, ніколі не адмовіцца ад якаснага і натуральнага прадукту.

У пакоі цэнтральнага пульта кіравання аператар Зоя ШОЎК (злева) і масладзел-майстар Наталля ДЭНІС (справа).

Сакрэты лабараторый і бытавых памяшканняў

З чаго пачынаецца карысны і смачны прадукт? Зразумела, з натуральнай сыравіны. А ёй на камбінаце ўдзяляецца асаблівая ўвага. Некалькі гадоў таму на прадпрыемстве з'явілася спецыяльная прыёмная лабараторыя, на якой цалкам праводзяцца даследаванні. «Уся сыравіна на 100% правяраецца на паказчыкі бяспекі, — распавядае **галоўны тэхнолаг Алена Галімава** і дадае: — Маецца ўвесь комплекс вытворчых лабараторый: фізіка-хімічная, таксама мікрабіялагічная, у якой стаіць прыбор для вызначэння антыбіётыкаў у малацэ. У гэтых лабараторыях праводзяцца ўсе даследаванні: як па прыёме сыравіны, па ходзе вытворчасці, так і гатовай прадукцыі».

Аднак абсалютная чысціня і бездакорнасць павінны быць усюды, упэўнены на камбінаце, бо прадпрыемствы гэтай галіны жывуць па сваіх асаблівых законах — Санітарных правілах і нормах Рэспублікі Беларусь. За іх выкананнем асабліва сочыць **дырэктар Аляксандр Бір,** які ўпэўнены, што камбінат павінен быць адным з вядучых прадпрыемстваў не толькі ў плане мадэрнізацыі вытворчасці, але і арганізацыі належных умоў працы, што адпавядаюць сучасным патрабаванням. Таму пад яго кіраўніцтвам адрамантаваны адміністрацыйныя і вытворчыя карпусы, бытавыя памяшканні, установлена сучаснае камп'ютарнае абсталяванне, праведзена сістэма кандыцыянавання, прыведзены ў парадак гардэробныя памяшканні, заменены дзверы, вокны. Цяпер, калі супрацоўнікі могуць з камфортам не толькі пераапрануцца, правесці перапынак, але і прыняць цёплы душ, гэта не можа не адлюстравацца на якасці вытворчасці. Бо стравы, што зроблены з добрым настроем, маюць зусім іншы смак.

Месцы, «намоленыя» для сыроў

Навагрудскі масларобчы камбінат зараз з'яўляецца філіялам Лідскага малочнакансервавага камбіната, аднак сам таксама мае філіялы: Карэліцкі маслацэх і Любчанскі сырцэх. Рэканструкцыя апошніх — асобная справа асобных вялізных сродкаў. У Карэлічах пабудаваны новы вытворчы комплекс, туды плануецца перавесці ўсю пераапрацоўку малака, што куплена ў насельніцтва. У Любчы ўжо набыта частка неабходнага абсталявання, каб працягваць выпускаць сыры «Любчанскі» і «Паўночны». Будуецца новая кацельня на цвёрдым паліве, якая адначасова будзе і прахадной з камп'ютарным пропускам. Гэта вельмі зручна, бо дазволіць сумясціць пасады супрацоўніка бяспекі і таго, хто падтрымлівае тэмпературу ў трубах. Поўнасцю памяняецца

Наталля КАЧАН – майстар цэха сухога абястлушчанага малака.

Сырцэх.

Апаратчыкі ўпарвання і згушчэння Аляксандр ЛОЖАЧНІК і Марына НАВАГРАН.

дах, паставяцца новыя камеры для саспявання і захоўвання гатовай прадукцыі. Ужо набыта тры ліфты, каб дастаўляць сыр з першага паверха, дзе размяшчаецца вытворчасць, у склеп, дзе сыр будзе саспяваць і захоўвацца.

Кажуць, Любча — месца для сыра намоленае. Там рабілі сыр яшчэ ў панскім маёнтку. Разваліны панскай сядзібы захаваліся і сёння. Аляксандр Бір нават мае намер яе аднавіць: «Ёсць ідэя зрабіць з Любчы месца, прывабнае для турыстаў. Гэта ўнікальная па духу і каларыту пляцоўка, што валодае не прыдуманымі, а сапраўднымі традыцыямі сыраробства».

Сёння ад авотнікаў уладкавацца на працу на Навагрудскі масларобчы камбінат няма адбою. Пра яго з павагай і гонарам адзываюцца і астатнія навагрудчане. Гэта можа сведчыць пра адно: прадпрыемства ўстойліва развіваецца і мае выдатныя перспектывы. Дырэктар Аляксандр Бір кажа, што ў кожным сваім работніку хоча выхаваць пачуццё гаспадара. А гаспадары, як вядома, для людзей усё робяць таксама добра, як і для сябе. Таму, дзякуючы «Навагрудскім дарам», на нашых сталах не перастануць з'яўляцца натуральныя і смачныя малочныя прадукты.

АДРАС І ТЭЛЕФОН:
вул. 1-га Мая, 59, 231400
г. Навагрудак, Гродзенская вобласць,
тэл.: (+375 1597) 2-33-58, факс: 2-69-02
e-mail: Novogrudok_MDK@mail.ru.
УНП 500837869

NOVOGAS — лідар на постсавецкай прасторы:

ШЫРОКІ СПЕКТР ГАЗАВАЙ АПАРАТУРЫ І МАШТАБНАЕ ТЭХНІЧНАЕ ПЕРАЎЗБРАЕННЕ

Дырэктар ААТ «Навагрудскі завод газавай апаратуры» Віктар Турлюк працуе на прадпрыемстве ўсё жыццё. У 1979 годзе пачынаў у якасці эканаміста, з 1981-га стаў намеснікам дырэктара па камерцыйнай частцы. У 2008-м быў прызначаны на пасаду дырэктара, якую займае і сёння. У яго працоўнай кніжцы ўсяго адзін запіс, бо 33 гады працоўнага стажу прыпадае на гэта прадпрыемства. Віктар Іосіфавіч праявіў сябе як прадпрымальны кіраўнік, ён не баіцца рызыкаваць, каб упэўнена ісці наперад. Дзякуючы намаганням Віктара Турлюка, у мадэрнізацыю прадпрыемства ўкладаюцца вялізныя сродкі. Пад яго кіраўніцтвам Novogas праводзіць маштабнае тэхнічнае пераўзбраенне. І, як бачна, спыняцца дырэктар не збіраецца. Тым больш што аналагічных заводаў па вырабе газавай апаратуры з такім спектрам прадукцыі, што выпускаецца, на прасторах СНД няма. Упэўнена адчуваюць сябе навагрудчане і на рынках Еўропы, дзе атрымалі адпаведныя сертыфікаты якасці на прадукцыю. Што яшчэ ўражвае, дык гэта спакой Віктара Іосіфавіча: ён ведае ўсё пра вытворчасць і сваіх супрацоўнікаў, узважана аддае загады. Кіраўнік на сваім месцы — залог поспеху прадпрыемства. І ў гэтым Навагрудскаму заводу газавай апаратуры моцна пашанцавала.



ЗНАКАВЫЯ ПАДЗЕІ:

Віктар Турлюк распавёў пра найбольш важныя вехі ў развіцці завода, якому сёння 52 гады:

І. 1966. Структурна завод уваходзіў у Міністэрства газавай прамысловасці СССР і падпарадкоўваўся наўпрост Маскве. У 1978 быў здадзены ў эксплуатацыю цэх па вытворчасці камплектуючых для брэсцкай газавай пліты. І зараз уся камплектацыя (краны, ручкі, гарэлачная група) размяшчаецца на заводзе ў Навагрудку.

ІІ. 1983. Па заданні Газпрама асвойваецца вытворчасць вогнетушыцеляў 50-літровай ёмістасці для газавых кампрэсарных станцый.

ІІІ. 1988. Першымі ў СССР тут асвойваюць вытворчасць газабалоннай сістэмы для пераводу легкавых аўтамабіляў на газ, чым займаюцца і дагэтуль, выпускаючы вялікі спектр прадукцыі (летась было выпушчана каля 500 тыс. балонаў, сёлета плануецца зрабіць ад 600 да 700 тыс. балонаў).

У кожным цэху — новае абсталяванне

Зараз прадпрыемства знаходзіцца на стадыі тэхнічнага пераўзбраення. Летась закуплена абсталяванне на 15 млрд рублёў. За час мадэрнізацыі на заводзе з'явілася шмат найноўшага абсталявання замежнай вытворчасці: шведскі робатызаваны зборазварачны комплекс, італьянскі прэс і зіговачныя машыны, турэцкая газаплазменная ўстаноўка, фарбовачная лінія польскай вытворчасці, печ абпальвання балонаў з Нідэрландаў, сучасныя цэнтры для апрацоўкі і такарныя аўтаматы вытворчасці Германіі, Тайвані, тэрмапласт-аўтаматы вытворчасці Германіі і сучасныя тэрмапласты айчыннай вытворчасці «Атлант», шротакідальная ўстаноўка з Італіі і інш.

У цэху аўтаматыкі, што ўведзены ў эксплуатацыю ў 1978 годзе, з мэтай выпуску прадукцыі для імпартазамяшчэння (Італія, Іспанія) асвоена вытворчасць прынцыпова новага тэрмарэгулятара і гарэлачнай групы серыі 5 для пліт новага пакалення GEFEST вытворчасці СП ААТ «Брэстгазаапарат», а таксама рэгулятары ціску газу камбінаванага тыпу КРДГ-10/6, КРДГ-20/6, якія прызначаны для зніжэння ціску прыроднага газу з высокага ціску на нізкі з працоўным дыяпазонам 0,005МПа да 0,6МПа і падтрымкі яго ў аўтаматычным рэжыме (выкарыстоўваюцца ў прамысловым і камунальна-бытавым газазабеспячэнні).

Цэх газабалонных сістэм пацвярджае агульную тэндэнцыю ў пытанні набыцця сучаснага абсталявання. **Уладзімір КОТ** распавёў, што працуе начальнікам гэтага цэха з 1996 года, і тады над апрацоўкай аднаго корпуса рэдуктара працавала адразу 10 чалавек. Зараз жа на адным новым станку тры такія корпусы апрацоўваюцца ўсяго за 24 хвіліны.

— Мы вырабляем два тыпы лічыльнікаў: Ж-2,5, Ж-4 і Ж-6 — першы для звычайных кватэр, другі — для дамоў з вялікім расходам газу, напрыклад, катэджаў.

Лічыльнікі газу, што выпускаюцца на прадпрыемстве, — дыяфрагменнага (мембраннага) тыпу. Усе лічыльнікі ўнесены ў рэестр сродкаў вымярэння Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. У вытворчасць лічыльнікаў укаранёная сістэма менеджменту якасці ISO 9001. У лічыльніках прымяняюцца мембраны і палімерныя матэрыялы вядомых сусветных брэндаў: «Кавакамі», G-flex, Efbe, DuPont. Гэта забяспечвае тэрмін прыдатнасці лічыльнікаў не менш за 16 гадоў.

Канталёр выхадных параметраў бытавых лічыльнікаў Эвеліна МАЛІНОЎСКАЯ на заводзе ўжо 20 гадоў. Праца на Novogas у яе дынастычная: маці была тут намеснікам галоўнага бухгалтара, бацька — загадчыкам цэха.

Кожны лічыльнік праходзіць прыёмку супрацоўнікамі Цэнтра стандартызацыі метралогіі і сертыфікацыі.

Начальнік цэха газабалонных сістэм Уладзімір КОТ распавядае, як на адным станку апрацоўваецца адразу тры рэдуктары.

Зараз завод укараняе ў серыйную вытворчасць лічыльнікі газу G-4 і G-6 з электронным карэктарам, які вымярае тэмпературу газу паўправадніковым датчыкам, што мае хібнасць ±0,5°С, апрацоўку інфармацыі робіць працэсар. Выкарыстанне літыевага элемента сілкавання вядомай шведскай фірмы RENATA ў лічыльніку гарантуе 12 гадоў працы пры самых неспрыяльных умовах. Магчыма функцыянальнае расшырэнне лічбавага карэктара па тэхнічным заданні спажыўца (арганізацыі газазабеспячэння):

• знешні інтэрфейс для доступу да карэктара спецыялістаў арганізацый газазабеспячэння;

• увядзенне ў разлік аб'ёму вымеранага газу, параметры ціску;

• арганізацыі сістэмы ўліку аб'ёмаў спажывання прыроднага газу, што пастаўляецца вытворцамі, з дыстанцыйным зняццем і перадачай паказчыкаў лічыльнікаў па радыёканале на цэнтральны дыспетчарскі пункт прадпрыемства па газазабеспячэнні.

Праводзіцца падрыхтоўка вытворчасці кватэрнага лічыльніка G-1,6, з электронным здыманнем паказчыкаў.

Участак зборкі і паверкі лічыльнікаў газу таксама перажыў мадэрнізацыю. У маі цэх пераехаў у новае памяшканне.

Робаты замест людзей

Для вытворчасці балонаў на 5,12 і 27 літраў у верасні мінулага года ўсталявана шведская робатызаваная лінія «Матаман». Зварка балонаў выконваецца цалкам робатамі, без прысутнасці чалавека.

На гэтай лініі распрацавана сучасная сістэма бяспекі з фотаэлементам, каб рабочы не трапіў у зону працы робата.

Сёлета плануецца аб'явіць тэндар на яшчэ адну робатызаваную лінію, да другога квартала наступнага года ўсталяваць яе і запусціць у эксплуатацыю.

Сёння прадпрыемства мае высокі інжынерны і вытворчы патэнцыял, можа выконваць сучасныя тэхналагічныя працы:

- халодная і гарачая штампоўка;
- ліццё пад ціскам алюмініевых і латунных сплаваў;
- ліццё пластмас;
- механічная апрацоўка;
- вытворчасць рызінатэхнічных вырабаў;
- зварка пад флюсам і ў зрэзе ахоўных газаў (CO^2);
- афарбоўка ў электрастатычным полі;
- палімерная афарбоўка парашковымі і эмалевымі фарбамі;
- плазменная рэзка;
- лінія па вытворчасці аўтамабільных грузавых балонаў і тараідальных балонаў;
- лініі па вытворчасці бытавых і легкавых аўтамабільных балонаў;
- ахоўныя і дэкаратыўныя гальванічныя пакрыцці (цынкаванне, храміраванне, нікеляванне, аксідаванне сталёвых, латунных і алюмініевых дэталяў);
- тэрмічная апрацоўка сталёвых дэталяў;
- выраб дакладнай і складанай аснасткі і прылад;
- выраб стальных тросаў і чалаў для перамяшчэння грузаў.

СЕРТЫФІКАТЫ ЯКАСЦІ:

Прадукцыя прадпрыемства сертыфікавана па патрабаваннях Міжнароднага стандарту СТБ ISO 9001-2009. На ўсю прадукцыю маюцца сертыфікаты якасці Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. Аўтамабільныя цыліндрычныя і тараідальныя балоны сертыфікаваны ў адпаведнасці з патрабаваннямі еўрапейскіх правілаў R 67/01 ЕЭК ААН. Аўтамабільныя газавыя балоны маюць дазвол транспартнага тэхнічнага дазору Рэспублікі Польша (ТДТ) і дапушчаны да выкарыстання як у Польшчы, так і іншых краінах Еўрасаюза.

Андрэй АСТАПКЕВІЧ (злева) і Барыс ЧУБРЫК (справа) — маляры газавых балонаў.

Прапан еўрапейскай якасці

Начальнік цэха газавых балонаў Генадзь БУКРЭЙ.

Асаблівы гонар завода — іх газавыя балоны. Па аб'ёмах вытворчасці гэтых тавараў прадпрыемства з'яўляецца адным з буйнейшых у СНД і Еўропе.

У чым жа сакрэт такой запатрабаванасці прадукцыі? Аказваецца, выпуск газавых балонаў высокай якасці і надзейнасці забяспечваецца выкарыстаннем сучаснага высокаэфектыўнага абсталявання для кантролю якасці зварных швоў балонаў. Для гэтага прымяняюцца ўстаноўкі рэнтгенаграфавання нямецкай фірмы «Філіпс», што і гарантуе стабільнасць якасці. Зварка газавых балонаў ажыццяўляецца высокамеханізаванымі апаратамі як пад слоем флюсу, так і ў асяроддзі ахоўных газаў. Зварачны дрот, зварачныя флюсы і зварачныя газавыя сумесі закупляюцца заводам за мяжой, у вытворцаў, што маюць шматгадовы вопыт іх вырабу і гарантуюць еўрапейскую якасць.

Зборка і зварка бытавых газавых балонаў ажыццяўляецца на робатызаванай лініі, амаль без удзелу чалавека. Выкрабленыя балоны адпавядаюць патрабаванням Еўрастандартаў. Выпрабаванні балонаў ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з еўранормамі гідрастатычным метадам. Канчатковая аддзелка паверхні балонаў праводзіцца на аўтаматызаванай лініі шротакідальнай апрацоўкі і палімернай афарбоўкі. Па завяршэнні працэсу афарбоўкі на балон наносіцца надпіс «ПРАПАН» на аўтаматызаванай установе метадам шаўкаграфіі.

ПРАДУКЦЫЯ Навагрудскага завода газавай апаратуры:

- апаратура для пераводу легкавых і грузавых аўтамабіляў на звадкаваны і сціснуты газ;
- бытавыя газавыя балоны;
- тараідальныя і цыліндрычныя балоны для аўтамабіляў;
- запорна-рэдуцыруючая апаратура: вентылі вады, вентылі і клапаны газу; рэгулятары ціску газу; дамавыя рэгулятары з высокага на сярэдні і нізкі ціскі газу, краны шаравыя поўнапраходныя і няпоўнапраходныя; фільтры сеткавыя для ачысткі вады, вадаправодныя далучальныя вузлы;
- аўтаматыка бяспекі;
- лічыльнікі газу;
- парашковыя вогнетушыцелі;
- тавары народнага попыту.

Газ для свайго аўтамабіля

На прадпрыемстве выпускаецца абсталяванне для пераводу легкавых і грузавых аўтамабіляў на газ (ГБА).

У вузлах ГБА выкарыстоўваюцца самыя якасныя рызінатэхнічныя вырабы вядомых еўрапейскіх вытворцаў (G-FLEX Чэхія, TUMEDEI Італія). Для ліцця корпусных дэталяў выкарыстоўваюцца ліцейныя машыны CLH—250 вытворчасці Славакіі, ліццё пласмасавых дэталяў адбываецца на тэрмапласт-аўтаматах вытворчасці Германіі («Фераматык К75») і на сучасных тэрмапластах айчыннай вытворчасці «Атлант ТВ 125Н/450», для механічнай апрацоўкі дэталяў выкарыстаны сучасныя цэнтры апрацоўкі з ЧПУ Viktor 70 і такарныя аўтаматы GisL—20AS вытворчасці Тайвань.

Пасля зборкі ўсе вузлы праходзяць выпрабаванні на адпаведнасць патрабаванням Правілаў № 67 ЕЭК ААН.

У газабалоннай апаратуры 4-га пакалення вытворчасці завода выкарыстоўваецца газавы кантролер AGIS фірмы ACON. Балон, рэдуктар, вынасное заправачнае прыстасаванне, газавы клапан, рэгулятар ціску, фільтр тонкай ачысткі, рампа газавых фарсунак, блок арматуры, блок кіравання маюць афіцыйныя зацвярджэнні тыпу ў адпаведнасці з патрабаваннямі міжнародных Правілаў ЕЭК ААН.

Што датычыцца выбару пастаўшчыка электронікі, то ён абумоўлены некаторымі перавагамі, якія былі пацверджаны пры выпрабаваннях базавых мадэляў аўтамабіляў з 4, 6 і 8 цыліндровымі рухавікамі і пастаўцы 5000 камплектаў ГБА ў Паўднёвую Амерыку (у Венесуэлу). Па выніках пастаўкі гэтых камплектаў ГБА Венесуэла прыняла рашэнне закупіць яшчэ 11000 камплектаў ГБА і ўжо заключыла з Навагрудскім заводам газавай апаратуры кантракт на іх пастаўку.

Установка газабалоннай апаратуры завода дазволіць вам істотна зменшыць выдаткі на эксплуатацыю аўтамабіля. Павялічыць рэсурс рухавіка (за кошт зніжэння ўдарных нагрузак на крывашыпна-шатуновы механізм з-за больш высокай дэнатацыйнай устойлівасці газу, чым у бензіну). Паменшыць знос цыліндраў (газапаветраная сумесь, у адрозненні ад бензінапаветранай, не змывае масла са сценак цыліндраў), павялічыць тэрмін прыдатнасці маторнага масла (пары газу, у адрозненні ад пароў бензіну, не акісляюць масла, і яно не так хутка губляе свае працоўныя якасці). Газавае паліва, у адрозненне ад бензіну, практычна немагчыма падрабіць.

Асаблівую цікавасць выклікаюць аўтамабільныя газавыя балоны тараідальнай формы, бо па знешнім выглядзе і памерах яны адпавядаюць запасному колу. Гэта дазваляе ўсталяваць газавы балон у спецыяльную нішу замест кола ў багажніку. Такія газавыя балоны адрозніваюцца па даўжыні, вышыні, аб'ёму, а таксама ўнутранай або знешняй гарлавіне.

На заводзе ёсць спецыяльны ўчастак, які займаецца мантажом. Тую ж паслугу аказваюць і на кожным падраздзяленні газавай службы ў абласцях нашай краіны, куды можна звярнуцца, калі ёсць жаданне перавесці сваё аўто на газ.

Novogas мае і ўласную газавую запраўку на 4 калонкі.

Ліцейшчыца пластмас Тамара ЛУКОШКА.

Выгоды для супрацоўнікаў

Дбае Novogas не толькі пра выдатныя паказчыкі вытворчасці. Добрыя ўмовы жыцця і адпачынку людзей — таксама клопат прадпрыемства, што ўсімі сіламі імкнецца падтрымліваць сваіх рабочых і дапамагаць ім. На балансе ў завода знаходзяцца два інтэрнаты ў Навагрудку, у якіх жывуць супрацоўнікі. А ў адным з іх нядаўна створаны сучасны гатэль на 23 месцы для замежных кліентаў і партнёраў, што часта прыязджаюць на Novogas. Прыгожы інтэр'ер, добрыя бытавыя ўмовы — усё, зразумела, зроблена на вышэйшым узроўні.

Адзіны ў горадзе басейн даўжынёй у 25 метраў — таксама ўласнасць завода.

На сённяшні дзень на прадпрыемстве працуе каля 1500 супрацоўнікаў, з іх каля 500 — жанчыны. Многія рабочыя прыходзяць без адукацыі і новую прафесію асвойваюць на заводзе пад кіраўніцтвам вопытных майстроў. Практыка паказала, што некаторыя з іх застаюцца на прадпрыемстве на ўсё жыццё, мяняючы пасаду і пастаянна рухаючыся ўгору па кар'ернай лесвіцы. Іх прафесійнае жыццё набірае абароты разам з самім заводам — надзейна і зладжана.

З увядзеннем лініі робатаў, з'яўленнем іншай найноўшай тэхнікі, якая патрабуе добрага валодання камп'ютарам, на завод сталі часцей прыходзіць маладыя дыпламаваныя спецыялісты.

Сярэдняя заработная плата складае больш за 3 млн руб. Згодна з калектыўным дагаворам, прадастаўляецца поўны сацыяльны пакет. Акрамя распаўсюджаных сацыяльных паслуг, што аказваюцца на большасці прадпрыемстваў, Novogas дапамагае сваім супрацоўнікам пры ўступленні ў шлюб, пры нараджэнні дзіцяці, пры арганізацыі пахаванняў, у тым ліку 50% кошту на выраб магільных агароджаў з матэрыялаў, што выкарыстоўваюцца на заводзе. Са зніжкай супрацоўнікам прадастаўляецца сталовая для правядзення розных мерапрыемстваў, харчавацца і набываць прадукты ў буфеце яны могуць у крэдыт, у беспрацэнтны крэдыт таксама можна набываць тавары ў фірмовых магазінах прадпрыемства.

Зразумела, што пры такім стаўленні ўсе рабочыя завода адчуваюць сябе абароненымі і ўпэўненымі ў заўтрашнім дні.

АДРАС І ТЭЛЕФОН:
231400, Рэспубліка Беларусь,
г. Навагрудак, вул. Міцкевіча, 109
тэл. (+375 1597) 3-42-98, 2-13-32, 2-33-23
факсы 2-43-42, 2-17-42.
e-mail: INFO@NOVOGAS.COM
WWW.NOVOGAS.COM
УНП 500235715

***

Маштабная тэхнічная мадэрнізацыя, пастаяннае пашырэнне асартыменту — Novogas смела набірае абароты і ўпэўнена вытрымлівае канкурэнцыю на няпростым насычаным рынку адзінай Еўразійскай эканамічнай прасторы. Аналагі ёсць толькі на асобныя віды прадукцыі, а такі поўны спектр газавай апаратуры ў іншых адшукаць складана.

Кажуць, хто не рызыкуе, той не п'е шампанскага. Дырэктар жа Навагрудскага завода газавай апаратуры Віктар Турлюк, усё пралічыўшы, згаджаецца на рызыку, каб пасля мець вялікі прыбытак для свайго завода. Можна дакладна прадбачыць, што сродкі, якія ўкладаюцца ў завод, вернуцца ў неаднаразовым аб'ёме і падымуць Novogas на яшчэ большыя вышыні. Хоць ён і зараз у плюсе. А іначай быць і не можа, калі ў вытворчасць укладзены і душа, і ўсё жыццё таленавітых людзей — спецыялістаў, кіраўнікоў, рабочых.

Кажуць, каб застацца на месцы, трэба ісці, а каб вырвацца наперад — хутка бегчы. Пэўна, Novogas, што стаў на імклівы шлях самаўдасканалення і пастаяннага абнаўлення, канкурэнтам дагнаць будзе вельмі складана.

Матэрыялы падрыхтавалі Аксана МІСЕЛЯ, Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ. Фота Ніны ШЧАРБАЧЭВІЧ і з архіва прадпрыемства.

Тонкасці Танка

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

І гатовы быў проста радавацца жыццю, калі знікла неабходнасць змагання. Калі больш не трэба было адстойваць сваю мову (пішы на ёй, калі хочаш), беларускасць (якую прызналі і нават дэкларавалі дзяржаўнасць). Ён з тых людзей, для якіх разуменне сваёй прыналежнасці да пэўнага народу (асабліва тады, калі гавораць, што такога народу няма і паціху прывучаюць да іншай мовы) стала своеасаблівай мерай годнасці: з'явілася звышкаштоўнасць, якая выклікала звышахвярнасць дзеля звышмэты. І калі галоўны момант напружання адпаў, можна было больш лагодна ставіцца да рэчаіснасці. Заходнікі ж за сваё стаяць гатовы ўпарта, а калі іх інтарэсы задаволены, то прынцыповасць з упартасцю, можна, у прынцыпе, сцішыць. Максім Танк, змагар-заходнік, пасля вайны быў нават старшынёй Беларускага аддзялення савецка-польскай дружбы, разумеючы: стасункі паміж людзьмі — адно, а загады кіраўнікоў — зусім іншае...

Калі жыццё пасля ўсіх войнаў пакрысе наладжвалася, Яўген Скурко жыў спакойна, рабіў тое, што ўмеў: пісаў і выдаваў кнігі, рэдагаваў часопісы. Карыстаўся ўсімі радасцямі мірнага жыцця, якія мог тады мець чалавек яго ўзроўню, які заслужыў: аддаў радзіме маладосць, а на гэта здольны далёка не кожны. Псеўданім зэдаецца «ненахіляльным». Але калі хто ведае японскую паэзію, то найперш узгадае тонкія лірычныя песні танка, якія пайшлі з народнай традыцыі...

На словы Максіма Танка было створана шмат песень — лірычных, пранікнёных, якія станавіліся папулярнымі ў народзе. За савецкім часам яны былі сапраўднымі «хітамі» — «Авэ Марыя» ці «Завушніцы», ды і на думку сённяшніх музыкаў гучаць сучасна — як «Вецер радзімы». І калі пачытаць Танка — не як савецкага, а як беларускага паэта — то разумееш, што «беларускасць» у яго варыянце можа быць актуальнай і яшчэ стагоддзе... Бо ёсць адзіная для ўсіх існасць, не важна, заходнік ты ці ўсходнік, правы ці левы, вялікі ці малы чалавек: нацярпеўшыся і заслужыўшы, не супакоіцца і не згубіць. Бо немагчыма памераць, хто больш беларускі, хто менш; палічыць, хто больш гатовы страціць, хто менш; ці ўзважваць, хто больш церпіць дзеля радзімы, хто менш. Мерка патрыятызму ў розныя эпохі розная. Важна, каб было паняцце самой радзімы, з чаго яна складаецца, на чым трымаецца. Максім Танк бачыў, што ідэі ажыццяўляюцца ці мяняюцца з часам, а роднае застаецца родным...

Пры ўсім пры тым, што паэт за савецкім часам карыстаўся ўвагай (Герой Сацыялістычнай Працы, уладальнік ордэнаў і медалёў, лаўрэат Ленінскай прэміі СССР), аказалася, што гэтыя лаўры — не такі ўжо і важны для яго зямны скарб. Танк нават захацеў быць пахаваным вельмі сціпла, без ордэнаў і каравулаў — у роднай вёсцы, побач з бацькамі, у адной магіле з Любоўю, каханай жонкай. Гэта не па-савецку, гэта па-беларуску...

Ларыса ЦІМОШЫК.

Вершы пра перажытае

...змагаром

СПАТКАННЕ

— Ну што ж, кажы, што ў вас чуваць? —
Пачаў стары пра сенажаць,
Успомніў жыта і авёс...
А вочы... мокрыя ад слёз...

А потым я загаварыў:
— Нічога, год я перажыў.
Ды не адзін — сядзіць нас шмат, —
Прывыклі трохі і да крат...

Ну, як там мама і сястра?
Пара ўжо на зіму араць.
І як там кратаецца дзед?
Ім занясі ад нас прывет!

— Нічога, мы-то жыць жывём, —
Вось ты тут сохнеш за муром...
Я ў торбе сухароў прынёс, —
А вочы мокрыя ад слёз...

— Не плач! Мы вернемся вясной
І ў поле выйдзем грамадой,
Сустрэнем новы ўсход зары, —
Не плач і не бядуй, стары!

Вясною светлаю з-за крат
З сяўнёю, поўнаю зярнят,
Нас выйдзе шмат, як цёмны бор,
На скібы чорныя разор...

Стары, я знаю, верыць мне
І сам гаворыць аб вясне,
Здаецца, падужэў, падрос,
Хоць вочы мокрыя ад слёз...
1936 г.

...чалавекам

Адны гавораць:
Жыццё — поўнае спрэчных пытаньняў.
Трэба раз дзесяць адмераць, узважыць.

Другія:
Нічога новага не скажаш...
Быццам яны кнігі ўсе прачыталі.

Трэція:
Паглядзім, што з гэтага выйдзе.
Мо лепш, каб не памыліцца...

А я не знаю нічога больш агіднага,
Як маўчанне.
1963 г.

...грамадзянінам

Аслепшы,
Яшчэ можна з кульбакай
Дарогу дадому знайсьці.

Аглухшы,
Яшчэ будзеш чуць
Скрып дзвярэй сваёй хаты.

Анямеўшы,
З сябрамі бяседу вясці
Ва ўспамінах.

Толькі страціўшы Радзіму,
Будзеш, як камень,
Сляпы, і глухі, і нямы.
1974 г.

...закаханым

Думкі пра цябе
Я пастараўся выкінуць з галавы.
Але яны перабраліся ў рукі,
Якія ўначы цябе часта шукаюць
І не знаходзяць.
Я выкінуў з рук —
Перабраліся ў ногі,
Якія — куды б я ні йшоў —
Вядуць мяне зноў
Да хаціны тваёй.
Можа, адсекчы іх?
Але я не ўпэўнен,
Што гэтыя думкі
Не пераселяцца
І ў мае мыліцы.
1967 г.

«Я СЭРЦАМ ПІСАЎ СВАЮ КОЖНУЮ ПЕСНЮ...»

На радзіме Танка — свята. Паэзіі і песні

Сёння паэтычная сталіца пераедзе ў Мядзел: да 100-годдзя народнага паэта Беларусі Максіма Танка праводзіцца рэспубліканскае свята паэзіі і песні. Адзін чалавек нарадзіўся і пражыў — а добра ўсім! Няма яго — а ўспамінаюць: напісаў шмат, цяпер толькі чытаць...

Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

І гэта будзе, бо як жа гаварыць пра паэта без яго радкоў? Нават для свята назва з іх узятая. І для кожнай з частачак свята — ёсць радочак Танка. Каб напоўніць і звязаць часткі свята адзіным сэнсам — безліч вершаў. І для паэта была б радасць адно толькі ведаць: створанае жыве.

І можа, ён пачуе. Таму што ўсё пачнецца з яго праслаўлення: а 10-й раніцы 15 верасня ў госці да паэта прыйдуць людзі з кветкамі — да яго магілы ў вёсцы Новікі. Ад яго вітаннем будуць вершы — і завяжацца гаворка... А потым у яе ўцягнецца і горад: у Мядзеле будзе адкрыты камень у гонар 100-годдзя нараджэння Максіма Танка — на вуліцы 17 верасня. Выбар месца дакладна невыпадковы — гэты дзень для паэта быў двайным святам. Чаму? Паразважайце разам з творчай групай хранікальна-дакументальнага фільма «Максім Танк», якая чакае на сустрэчу ў Мядзельскім гарадскім доме культуры. Пра ўсе падзеі ў яго жыцці даведаецеся, і пра ўсе шляхі-дарогі, якія ён прайшоў. Нам, можа, іх цяпер і ўявіць не проста. Затое можна пабачыць у развіцці: дапамогуць удзельнікі фотапленэра «Дарогамі Максіма Танка». Яшчэ ў чэрвені сабраліся на яго Надзея Дзегцярова, Віталь Раковіч, Сяргей Плыткевіч, Валерый Сібрыкаў і праехалі з фотакамерамі па маршруце: Мінск — Пількаўшчына — Мядзел — Вілейка — Радашковічы — Вільнюс — Мінск. Усе мясціны — Танка, тыя, дзе выспявала яго свядомасць. І дзе дагэтуль багата вобразаў для паэзіі. Проста камусьці яна прыходзяць у словах, а хтосьці яе адчувае ў выявах.

Між іншым, праз радкі Танка выявы самі нібыта прарываюцца: у карцінках, у дэталях, у адчуваннях — таго ж Нарачанскага краю, пра які паэт заўсёды пісаў з любоўю. Дык ці дзіва, што яго землякі-сучаснікі, якія валодаюць нейкім талентам, майстэрствам, сваю выставу-кірмаш праводзяць пад назвай, для якой узялі радок з верша: «Калі вобраз загаворыць моваю жывой...» Як гэта насамрэч бывае, раскажуць тыя, хто добра ведае паэзію Танка. А яшчэ цікавіцца сучаснай літаратурай. У Год кнігі на радзіме народнага паэта з гэтым праблем не будзе: наведайце кніжную выставу на гарадской плошчы. Ці літаратурна-мастацкую гасцёўню «Шчаслівы, што пяю цябе, Радзіма...», дзе адбудуцца сустрэчы з сучаснымі пісьменнікамі, якія збяруцца на свята паэзіі і песні. Песні аддадзены гарадскі Амфітэатр, які чакае слухачоў а 14-й гадзіне.

Можа, тады і прыйдзе разуменне, чаму ў рамках свята ў гонар Танка асобна прэзентавалі кнігу з красамоўнай назвай: «Усё жыццё я не любіў расстанняў...»

Ларыса ЦІМОШЫК.

ПРОСТАЕ ШЧАСЦЕ ЛЮДСКОЕ...


Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

ЖЫЦЦЁ СЛАВУТАГА ЧАЛАВЕКА

У Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры 18 верасня адбудзецца прэзентацыя кнігі «Максім Танк. На камні, жалезе і золаце» (успаміны, эсэ, прысвячэнні), выхад якой прымеркаваны да 100-годдзя з дня нараджэння народнага паэта Беларусі.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» працягвае выпуск бібліяграфічных кніг у папулярнай і прэстыжнай серыі «Жыццё знакамітых людзей Беларусі». Чарговы том пад выдавецкім грыфам «ЖЗЛБ» прысвечаны памяці Максіма Танка (1912--1995), народнага паэта Беларусі, акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Героя Сацыялістычнай Працы, лаўрэата шматлікіх дзяржаўных прэмій і ўзнагарод.

Праз успаміны сяброў, пісьменнікаў паўстане вобраз Мастака і Чалавека ва ўсёй філасофскай велічы і прыгажосці. Абаяльны, добры чалавек, таленавіты творца, глыбокі філосаф, ён жыве ў сэрцах беларусаў. Вершы-прысвячэнні вядомых пісьменнікаў сплятаюць вянок любові Максіму Танку.

Падчас прэзентацыі кнігі прагучаць успаміны вядомых беларускіх паэтаў, даследчыкаў творчасці Максіма Танка, а таксама тых, хто спрычыніўся да выдання кнігі «Максім Танк. На камні, жалезе і золаце»: галоўнага рэдактара выдавецтва «Мастацкая літаратура», паэта Віктара Шніпа, рэдактара выдавецтва «Мастацкая літаратура» Аксаны Спрынчан, пісьменніцы, паэткі Людмілы Рублеўскай.

Прагучаць вершы і сугучныя ім музычныя творы.

ТВОРЧЫ ПАРТФЕЛЬ

Ці мог бы ўмясціцца ў яго 13-томнік паэта?

Збор твораў Максіма Танка быў прадстаўлены ў Дзяржаўным музеі беларускай літаратуры: выданне ажыццяўлялася з 1996 года, першыя тамы выйшлі ў 2006 годзе, апошні — у 2012-м. Ацаніць новае выданне можна на фоне кніг Танка, якія выдаваліся пры яго жыцці, пры яго непасрэдным клопаце: у музеі адразу сустракае невялікая выстава, прысвечаная 100-годдзю народнага паэта. Кніжкі, якія паўплывалі на яго, кніжкі, над якімі працаваў ён, нават газеты, у якіх працаваў, напрыклад, падчас вайны. Адна паліца глядзіцца вельмі трывала, «па-танкаўску»: кнігі, складзеныя ў стос на фоне яго любімага партфеля з рудой скуры — ну нібыта самі просяцца ў яго. А хто ведае, можа, у ім гаспадар і насіў свае рукапісы, з якіх потым складваў кніжкі? Таму гармонія паміж рэчамі і сутнасцю рэчаў атрымалася.

Рэчы заўсёды цікавяць. Любімыя рэчы людзей, якіх ведаюць усе, нібыта захоўваюць іх цеплыню характар і звычкі іх нясуць далей — і ёсць адчуванне жывога чалавека.

І ёсць адчуванне чалавека на гэтай выставе ў музеі. Медаль за абарону Масквы — такую ж атрымаў Яўген Скурко. Кавалак руды, якую Танк прывёз з Чылі, драўляная трэсачка — з Англіі, калі хацеў (і была магчымасць) трапіць у музей Уільяма Шэкспіра, але там якраз ішла рэстаўрацыя. Дык хоць трэска ад Шэкспіра... З Кітая — дык наогул цэлы альбом, афармлены з адмысловым каларытам. Фотаздымкі адлюстравалі тую вандроўку, але пададзены яны разам з выразкамі з газет, сярод іерогліфаў. Цікавае было жыццё, насычанае...

Гэтыя рэчы, сувеніры, прывезеныя з розных краін, у музей перадаў сын паэта Максім. Як і частку сямейных фотаздымкаў. Цікава на іх глядзець. Асабліва на старыя, маленькія фотакарткі 1930-х гадоў глядзіш і спрабуеш пазнаць людзей, якія разам з маладымі Танкам на іх... Сямейныя фотаздымкі, з дзеткамі, з нашчадкамі: Танк з унукам-немаўлём на руках — шчаслівы дзед. Ёсць здымкі з сябрамі-пісьменнікамі: з Лужаніным, Брылём, якія былі ў яго ў гасцях, нагол шмат хто на Нарачы ў яго бываў. Фота з апошняй вандроўкі на радзіму 28 кастрычніка 1994 года, больш ён на Мядзельшчыну ўжо не прыязджаў. І цудоўны здымак: дарога на Пількаўшчыну, да бацькоўскай хаты. Аўтар — вядомы фотамайстар Уладзімір Крук. Яго дочкі, разбіраючы архіў бацькі, вырашылі перадаць у літаратурны музей вялікую частку здымкаў — асобная серыя, прысвечаная Быкаву, і серыя, прысвечаная творчасці Танка. Да юбілею паэта — шыкоўны набытак музея, і галоўнае — своечасовы, ёсць што паказаць наведнікам.

Справа ў тым, што Дзяржаўны літаратурны музей — даволі малады, яму 25 гадоў. А беларуская літаратура — сталая. Усе архівы пісьменнікаў XX стагоддзя захоўваюцца ў Дзяржаўным архіве літаратуры і мастацтва — дзеля гісторыі, каб уся спадчына зберагалася, рукапісы, дакументы, каб іх потым было зручна вывучаць даследчыкам. Таму ў музеі лічаць, што ім вельмі пашанцавала атрымаць здымкі і некаторыя рэчы Максіма Танка. Таму што, акрамя таго, што творчую спадчыну літаратара вывучаюць даследчыкі, у яго чытачоў, простых людзей, павінна быць магчымасць дакрануцца, пазнаёміцца з тым, што мае дачыненне да творцы. Асабліва, калі творца — народны паэт. У музей прыходзяць людзі і праз гэтыя рэчы, сведчанні жыцця таленавітых людзей, яны іх лепш адчуваюць.

Могуць адчуць, напрыклад, як Яўген Скурко аднойчы зразумеў, што можна пісаць па-беларуску! Ён жа польскую мову ў школе вывучаў, але аднойчы яму ў рукі трапіла дзіўнае выданне «Беларускі летапіс». Здзівіўся: пішуць жа на той мове, на якой ён гаворыць! Мова прыйшла аднойчы і прайшла праз жыццё: пра гэта сведчаць яго кніжкі. І нават рукапісы апошніх гадоў. Аркуш з радкамі, пазначаны 1994 годам, — гэта ж рука Танка!

Радкі Танка, думкі, артыкулы, выступленні — усё разам цяпер таксама даступнае чытачам праз Збор твораў у 13-ці тамах. Праца над ім ажыццяўлялася Інстытутам мовы і літаратуры імя Янкі Купалы і Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, выдавецтвам «Беларуская навука». Канцэпцыю выдання распрацаваў літаратуразнаўца Уладзімір Мархель. У прадмове крытык і літаратуразнаўца Мікола Мікуліч дае аналіз творчасці паэта. Выданне ўключае ўсе вядомыя вершы і паэмы Максіма Танка — практычна храналогію выхаду зборнікаў можна прасачыць. Можна прачытаць апавяданні і нататкі, пераклады паэзіі і прозы з 40 моў свету. Але не толькі творы зацікавіць сённяшняга чытача. Таму што заўсёды хочацца лепш пазнаць самога чалавека, якога больш няма. Але распавядуць пра яго, напрыклад, лісты да жонкі, бацькоў, дзяцей, да тых блізкіх людзей, з якімі можна было абсалютна шчыра пра ўсё казаць, давяраючы свае спадзяванні і сумненні. І нават самі імёны сяброў і калег-пісьменнікаў, вядомых творцаў, з якімі Танк ліставаўся, скажуць пра яго як пра чалавека шмат. Ал

е ж можна яшчэ прачытаць і самі лісты. У збор уключана перапіска розных гадоў, і гэта таксама дае магчымасць адчуваць, як час уплываў на чалавека і як творчы чалавек мог (ці не мог) упісвацца ў рамкі, якія выстаўляў час у сувязі са зменай павеваў у грамадстве. Асобныя лісты Танка друкаваліся ў перыёдыцы, але цяпер яны прадстаўлены больш поўна. Пра тое, чым паэт жыў штодня, распавядуць яго дзённікі. Упершыню прадстаўлены архіўныя дакументы, якія захоўваюцца не толькі ў Беларусі, але і ў Польшчы, Літве, Расіі...

Ларыса ЦІМОШЫК.

Арсень ЛІС, доктар філалагічных навук:

— Прыемна бачыць 13-томнік нашага выдатнага паэта, еўрапейскага паэта. Я меў дачыненне да працы над выданнем, быў запрошаны як чалавек, які ведае Заходнюю Беларусь. Я каментаваў дзённікі «Лісткі календара». Надзвычай цікавая кніжка, бо якраз ахоплівае той перыяд жыцця Танка, калі ён складваўся і фарміраваўся як чалавек і асоба, у падполлі Заходняй Беларусі, калі ён складваўся і фарміраваўся як паэтычная асоба. У гісторыі нашай літаратуры гэта ці не адзіны выпадак, калі пісьменнік на працягу ўсяго некароткага жыцця вёў дзённікавыя запісы. Яны раскрываюць працэс творчасці, раскрываюць эпоху, раскрываюць чалавека, час, у якім жыў пісьменнік. Я апошнія гады даволі шчыльна працаваў з паэтам, бываў у яго дома, размаўлялі, нешта запісваў з гэтага. Гэта дало мне магчымасць пракаментаваць яго дзённік «Лісткі календара» і ўвогуле лепш разумець яго як творцу, як чалавека, тое, як ён успрымаў час, асабліва апошнія гады, калі яго жыццё аказалася на зломе эпох.

Вячаслаў РАГОЙША, прафесар:

— Гэта скарб — 13 залатых тамоў. Вядома, далёка не ўсё ў гэтай скарбонцы сабрана. Магло б быць і 15 тамоў... Нездарма ж апошнія тамы атрымаліся тоўстымі, калі шмат што хацелася змясціць. Але цяпер, адштурхоўваючыся ад гэтых тамоў, мы можам глядзець: што ж яшчэ не ўвайшло? Будзе крытыка, але ж цяпер усё роўна гэтае выданне апынецца ў цэнтры ўвагі, а не папярэдні шасцітомнік. Ёсць цэлы том лістоў, і калі яго ўбачаць тыя, у каго захоўваюцца лісты, то пачнуць дасылаць — і гэта можа быць грунт ужо для новых тамоў. У нас ёсць добрая аснова. Хачу заклікаць: давайце будзем далей даследаваць, вывучаць, прапагандаваць творчасць Максіма Танка і шукаць новыя творы, новыя тэксты для новых тамоў, а потым, можа, і для поўнага збору твораў.

Анатоль ВЕРАБЕЙ, кандыдат філалагічных навук:

— Я з'яўляюся рэдактарам першага тома, куды ўвайшла лірыка Максіма Танка 1930-х гадоў, ёсць творы, якія не ўключаліся ў папярэднія выданні, у паэтычныя зборнікі. Гаворачы пра заходнебеларускі перыяд, хачу сказаць, што 1930-я гады — гэта матрыца будучай творчасці Максіма Танка. Крыніца яго творчасці — заходнебеларускае жыццё і традыцыі сусветнай літаратуры. Перад ім, як і перад яго папярэднікамі і калегамі — Купалам і Коласам — побач з пытаннямі сацыяльнага плана стаяла нацыянальная адраджэнская задача. І ён яе вельмі дасканала ўвасобіў у сваёй творчасці. Ёсць савецкая літаратура, ёсць заходнебеларуская. Але гэта наша адна літаратура. І мне думаецца, што ў 1930-я гады Танк выратаваў беларускую літаратуру: ён — адна з самых яркіх постацяў беларускай літаратуры 1930-х гадоў. Гэта вялікі еўрапейскі паэт, яго трэба разглядаць у кантэксце таго ж Поля Элюара...

ДЗЕ НАРАДЗІЎСЯ МАКСІМ ТАНК?

Падчас вучобы на факультэце журналістыкі Вышэйшага ваенна-палітычнага вучылішча ў Львове ў мяне была магчымасць пасля самападрыхтоўкі атрымаць адпускную запіску і ажно да адбою працаваць у бібліятэках, архівах. У спецсховы мяне дапускалі нават з фотаапаратам. А ў фондах Алаізы Пашкевіч (Цёткі) за падзяку перакладалі з нямецкай мовы «аўстра-венгерскія» тэксты пра яе вучобу ў Львоўскім універсітэце.

У 1966 годзе збіраліся на сяброўскія сустрэчы Беларускага земляцтва курсанты і студэнты пяці вузаў Львова. На вечарынах гаварылі пра Цётку і Багдановіча, Скарыну і Свянціцкага, гістарычныя і літаратурныя сувязі на заходніх абшарах Украіны і Беларусі. Спрыялі нашаму ўздыму пісьменнікі Уладзімір Лучук і Аксана Сенатовіч, Раман Лубкіўскі і Мікола Пятрэнка, навукоўцы Рыгор Нудзьга, Іван Дзенісюк, Мікола Ільніцкі... Знайшлася ва ўніверсітэцкіх келлях Валя Коўтун.

На падсветку сваіх выступленняў я паказваў новыя архіўныя здабыткі: пераздымкі зачытаных скарынаўскіх кніг, Статута ВКЛ, экспанатаў так званага «Беларускага аддзела», заснаванага ў 1905 годзе Іларыёнам Свянціцкім пры Нацыянальным музеі (сёння гэта Музей украінскага мастацтва). Напрыклад, сярод рарытэтаў там знаходзіліся 23 слуцкія паясы, 12 кніг Скарыны... «Беларускі аддзел» на той час захоўваўся ў падвале, але дачка Свянціцкага — Вера Іларыёнаўна — дазваляла сціпла агледзець набытыя па ўсёй Беларусі скарбы. І па сёння гэты аддзел рупліўца Свянціцкага не вынесены на прастору, нібыта замоўчваецца. Але ж трэба рупіцца пра вяртанне яго на пачэснае месца.

Згадалі мы і 35-годдзе выхаду з друкарні Стаўрапігійскага інстытута аднадзёнкі «Беларускае жыццё» (7 красавіка 1932 г.). Віленская матрыца была выраблена стараннямі аднадумцаў Максіма Танка, бо сам ён у гэты час сядзеў за кратамі Лукішак. Але 1500 асобнікаў заходнебеларускага выдання былі канфіскаваны. У Дзяржаўным архіве Львоўскай вобласці (фонд № 11, вопіс № 29, адзінка захавання № 6348) мне перанеслі на фотастужку старонкі «Беларускага жыцця». І вось я чытаю першы надрукаваны тэкст паэта Яўгена Скурко, падпісаны псеўданімам Максім Танк. Верш «Заштрайкавалі гіганты-коміны» быў напісаны як водгук чалавека-змагара на забастоўку ў Дамброве.

Jedzednіǔka Białoruskie Życie
БЕЛАРУСКАЕ ЖЫЦЬЦЁ
АДНАДНЁЎНА
АД РЭДАКЦЫІ На абарону Т Б ШІ

12 ліпеня 1932 года ў Львове выйшла яшчэ адна аднадзёнка — «Жыццё», дзе сярод публікацый я прачытаў і верш Янкі Купалы «Настане такая часіна». На жаль, іводны асобнік і гэтай газеты не трапіў па прызначэнні: мясцовая цэнзура была такой жа пільнай, як і ў Вільні.

Каб расшыфраваць імёны, пазнаць гісторыю львоўскіх выпрабаванняў, я напісаў ліст Яўгену Іванавічу і 4.10.1966 г. атрымаў ад яго паважлівы адказ.

Былі мае публікацыі ў мінскай перыёдыцы на гэтую тэму.

Вершы Максіма Танка ў перакладзе на ўкраінскую мову можна адшукаць у Львове — у часопісах «Обрії» (1936, №12; «Назустріч»(1936, №7-8). Але больш пашчасціла Яўгену Іванавічу з польскамоўным выданнем дэмакратычнага накірунку — часопісам «Sygnały», які выходзіў у Львове з 1933-га па 1939 год.

Засняты мною «беларускі» нумар № 37 ад 15 жніўня 1939 года, у якім пра Максіма Танка піша Севярын Сасноўскі. З адной са старонак глядзіць на чытача сам Максім Танк у далікатнай вышыванцы. У фотаархіве часопіса знайшоў арыгінал здымка. Уразіла! Ведаў пра яго, угнаравананага афіцыйнымі прэміямі, галоўнага рэдактара часопіса «Полымя», а тут з карткі паглядае — такі лагодны, прытульны, свой... У гэты час у Мінску рыхтаваўся да друку мой першы зборнік «Кастры Купалля». Загарэўся: чаму б не прапанаваць туды свой здымак у вышыванцы, каб хоць бы такім чынам выявіць сваю прыязнасць, прыхінуцца да яго вобраза?

Зборнік мой у вучылішчы ўбачылі незадоўга перад выпускнымі экзаменамі. Некурсанцкая форма мо й падзейнічала, бо я атрымаў накіраванне служыць у чыгуначных войсках ажно на «лукішках» — у Забайкальскай ваеннай акрузе.

У роспачы зноў звярнуўся да Максіма Танка. Як бы там ні было, але перад выпускным балем мне паведамілі, што еду служыць у 120-ю гвардзейскую Рагачоўскую дывізію, што ва Уруччы пад Мінскам.

Свой апошні зборнік Максім Танк назваў словам Errata. У ім — аўтарская спроба на паэтычных агледзінах жыцця заўважыць пралікі і хібы. Ды й ці былі яны на апантаным Шляху выпрабаванняў у моцнага духам чалавека і творцы?

Танкаўскім азначэннем назваў і я адзін са сваіх вершаў:

Словы паэтаў гучалі з-за кратаў,
З вежы прарока,
з гулагаўскіх ссылак...
Сёння ж усіх нас
чакае э р а т а —
Час выпраўлення
гаротных памылак.
Мы пралічыліся,
скрыўдзілі брата,
Крокі стуманілі
ў скрыўленай спешцы...
Сэрца заўважыць і —
дзея: э р а т а
Зноў нас паставіць
на праведнай сцежцы (...)

І замест пасляслоўя. Калі я расказваю сябрам пра свае львоўскія знаходкі, то, згадваючы пра «гіганты-коміны», амаль сур'ёзна сцвярджаю: вы добра ведаеце, што Яўген Іванавіч Скурко нарадзіўся ў Пількаўшчыне.

А вось Максім Танк нарадзіўся — у Львове!

Сяргей ПАНІЗЬНІК.

ПРАЗ 4 КРАІНЫ ДА ЯДРАНСКАГА МОРА

ЧАСТКА ДРУГАЯ

Горад Котар з вышыні крапасных сцен.

Адрыятычнае мора па-чарнагорску гучыць як «Ядранска», пра што мы даведаліся, як толькі купілі ў Сербіі мапу Чарнагорыі. Праўда, з мовамі там такая блытаніна, што звычайнаму турысту не разабрацца. Напрыклад, выдадзены ў Маскве сербска-харвацкі размоўнік запэўнівае, што менавіта на гэтай агульнай мове — кайнэ — і размаўляюць у Чарнагорыі. Аднак у 2007 годзе чарнагорская мова (якую яшчэ называюць адной з гаворак сербскай) набыла афіцыйны статус, а падчас леташняга перапісу насельніцтва ужо 37% жыхароў Чарнагорыі назвалі яе роднай (супраць 22% у 2003 годзе). Разам з тым, розніца з сербскай сапраўды неістотная. Наўрад ці турыст увогуле распазнае, ці пачуў ён яе ў Чарнагорыі. Напрыклад, мужчына з прыдарожнай вёскі, які прадаў нам мясцовую гарэлку — вінаградную ракію, рэкламаваў свой прадукт як «Екстра квалітэт!» Што на сербскай мове азначае «найвышэйшая якасць», па-чарнагорску было б: «экстра квалатада». Ракія і сапраўды аказалася вельмі добрай.

Зоран

Не ведаю дакладна, у які момант палюбіла гэту краіну. Зрэшты, палюбіліся ўсе краіны, якія мы пабачылі падчас вандроўкі, кожная па-свойму. Нас, напрыклад, папярэджвалі пра Румынію, маўляў, там з машыны колы знімуць, варта яе пакінуць без нагляду. Нічога такога. Хаця быў эпізод на зваротным шляху, калі ў чарзе да абменніка ў мястэчку Бран, што на мяжы Мунтэніі і Трансільваніі, майму мужу падалі яго ўласныя правы кіроўцы разам з усімі дакументамі на машыну, паказаўшы знакам, што падабралі іх з зямлі. І гэта пры тым, што дакументы ляжалі асобна ад грошай і ўпусціць іх муж не мог. Да канца таго дня мы ледзь не кожныя чвэрць гадзіны то грошы пералічвалі, то правяралі змесціва сумкі. Аднак абышлося. Нічога кепскага з намі ні ў адной краіне не адбылося. У Румыніі было настолькі добра, што мы паабяцалі сабе абавязкова прыехаць туды яшчэ раз і на больш працяглы тэрмін, але пра гэта — напарадзе.

Чарнагорыі папярэднічала паўтарагадзінная чарга на мяжы ў паўдзённую спёку. Потым — тыя ж горы, тунелі, віядукі, каньёны і старажытныя манастыры, што і ў Сербіі. Толькі больш скал, мінарэтаў, і ўжо за еўра можна было набыць ля дарогі жоўтую смокву або духмяную медавуху.

Самае вялікае на Балканскім паўвостраве возера пачалося з вялізнай плантацыі гарлачыкаў. Спачатку мы не маглі зразумець, што гэта за поле з дзіўнымі раслінамі, а потым не верылі сваім вачам: справа бязмежнае мора гарлачыкаў, злева — шэрыя сярдзітыя хвалі да самага гарызонту. Гэта і ёсць Скадарскае возера.

Зачараваныя відовішчам, мы праскочылі паркінг побач з вялікім рэстаранам і спыніліся на ўзбочыне амаль напрыканцы моста, каб хаця б хвілінку пастаяць на беразе. І тут я заўважыла самаробную шыльду, на якой было напісана «riba». З боку дарогі бачны толькі дах, які можна прыняць за невялікую лодачную станцыю. Аднак, калі мы спусціліся па прыступках уніз, то аказаліся ў прыватным вельмі сімпатычным рыбным рэстаранчыку, гаспадар якога Зоран сустрэў нас з радаснай усмешкай і на рускай мове прапанаваў даверыць яму выбар стравы. Праз 30 хвілін на стале перад намі стаялі дзве вялікія талеркі з трыма відамі на нашых вачах злоўленай, разабранай і засмажанай на грылі рыбы: вугор, карп і фарэль. А таксама хатнія сыр, аліўкавы алей, масліны, хлеб, гародніна і віно. Гэта было незвычайна смачна! Каштавала 66,5 еўра. Тое, што не змаглі даесці, жонка Зорана запакавала нам з сабой. Гэта быў адзін з самых дарагіх абедаў у Чарнагорыі, але за такую смакату тых грошай было не шкада. Звычайна ж мы маглі наесціся ўсёй сям'ёй (з віном ці півам) за 30 еўра.

Побач з намі сядзелі дзве дзяўчыны перад такой жа рыбнай талеркай, якія глядзелі алімпійскі матч па водным пола паміж камандамі Сербіі і Чарнагорыі. Яны крычалі і плакалі, ускоквалі з месца і закрывалі твары рукамі, хутка да іх далучыўся ўвесь рэстаранчык... Сербы выйгралі з лікам 12:11 і сталі бронзавымі прызёрамі Алімпіяды. Але для нас Чарнагорыя па-сапраўднаму пачалася менавіта з гэтага матча ў рыбным рэстаранчыку Зорана. Праз паўгадзіны мы ўбачылі мора.

Сана і Альё

Я ўжо пісала, што гаспадарамі нашых апартаментаў аказаліся вядомы ў Чарнагорыі мастак Альё Смайлэгіч і тэлежурналістка на пенсіі Садэта Сана. Альё калісьці разам з сябрам пабудаваў гэты дом. Нядаўна першы паверх выкупіў расіянін, і цяпер там з вясны па восень жыве яго маці. Падумвае прадаць свае апартаменты і Сана. Яна кажа, што ёй ужо цяжка прымаць турыстаў, прыбіраць за імі і даглядаць 2 кватэры. Падчас вайны яна жыла ў Сараеве і пашкодзіла сабе спіну, цяпер ёй цяжка хадзіць. Аднак, нягледзячы на ўзрост і перажытае, Сана і Альё — вельмі яшчэ радасныя, энергічныя і добразычлівыя людзі.

У нас склалася адчуванне, што гасцюем у сваякоў, і гэта пры тым, што Альё зусім не размаўляе па-руску, і абое яны выхадцы з мусульманскіх родаў. Кожную раніцу 79-гадовы мастак ідзе на мора і даплывае да вядомага вострава-гатэля Свеці-Стэфан, па дарозе ён сардэчна вітаецца з кіроўцам рэйсавага аўтобуса, прадаўцом крамы і знаёмымі турыстамі. Потым працуе ў сваёй майстэрні. Ён актыўна ўдзельнічае ў выставах па ўсёй краіне і за яе межамі. Яго работы ні на што не падобныя, яны адлюстроўваюць яго паэтычную і сонечную душу, падобна таму, таксама як зменлівая паверхня Ядранскага мора адлюстроўвае неба і сонца і хавае бяздонную глыбіню пад тоўшчай блакітнай вады.

У рыбным рэстаранчыку на Скадарскім возеры.

Так што Чарнагорыя для нас — гэта яшчэ і Сана з Альё, яго карціны і яе пірожныя, цудадзейная мазь ад сонечных апёкаў з іх радзімы і проста задавальненне ад стасункаў з гэтымі людзьмі. Адну са сваіх работ Альё падарыў нам на памяць.

Мора

Я шмат разоў бачыла і люблю мора. Люблю плыць адна і адчуваць еднасць з Сусветам. Такое магчыма толькі ў моры, калі вакол бязмежнасць і бясконцасць, і сам ты — частка гэтай бясконцасці. Але калі я ўвайшла ў Адрыятычнае мора, то ўголас закрычала: «Гэта немагчыма! Яно празрыстае!» Яно было празрыстым, нібы працятае сонцам шкло на любой глыбіні: ля берага і ля буйкоў, дзе пад нагамі яшчэ некалькі метраў. Яно бірузовае і цёплае. Вельмі салёнае. І вельмі прыгожае.

Мы не шукалі іншых пляжаў. Бясплатны гарадскі, на які нас прывёў Альё, нас цалкам задавальняў. Буйная галька, дастаткова месца, душ, кавярні, пункт пракату, чысціня... Па суседстве — пляж для гасцей вострава-гатэля, на якім адпачываюць сусветныя зоркі і мільярдэры. Для старонніх карыстанне на ім парасонамі і лежакамі каштуе 50 еўра з чалавека, ад нашага ён адрозніваўся толькі больш дробнай галькай і меншай колькасцю адпачывальнікаў.

Часцей за ўсё мы плавалі з маскай альбо акулярамі, бо назіраць за падводным светам бясконца цікава. Мы бачылі камбалу і васьміног («хобатніца» па-сербску), безліч невялікіх прыгожых рыбак, падобных да ракавін раслін і марскіх вожыкаў...

З вожыкамі выйшла гісторыя. Мы спецыяльна купілі ў Мінску плавальныя тапачкі з тоўстай падэшвай, бо прачыталі, што тут могуць сустрэцца гэтыя прадстаўнікі ігласкурых. Насамрэч на пляжы вожыкаў не было, але яны былі на камянях ля вострава-гатэля, куды мы аднойчы выправіліся ўсёй сям'ёй. І вось калі мы ўжо даплылі, дачка, убачыўшы безліч вожыкаў пад вадой, ад страху... упала на іх. Так што тапачкі не памаглі. Сана дала нейкі лекавы алей, і праз некалькі дзён усе 20 іголак выйшлі вонкі.

Іаана і Марыус

Дзякуючы наяўнасці ўласнага аўтамабіля, мы не куплялі экскурсіі і ездзілі, куды жадалі і калі жадалі. Мы пабачылі тры сярэднявечныя гарады: Будву, Котар і Бар. І кожны быў адкрыццём, кожны ўражваў па-свойму. На руінах Старога Бара нас заспеў бурштынавы захад сонца і прыгожая музыка — у летнія месяцы там праходзіць фестываль — і пачуццё рэальнасці пакінула нас. Дзіўна было стаяць побач са сценамі, якім паўтысячы гадоў, бачыць пад нагамі вялікі сучасны горад і раптам пачуць заклік мулы на малітву, а потым — звон хрысціянскіх храмаў...

Дарэчы, у Бары яшчэ 9 стагоддзяў таму ў храмах усталёўвалі як праваслаўны, так і каталіцкі алтары і вялі набажэнствы па абодвух абрадах, а некаторыя цэрквы дзейнічаюць так да сёння. Не дзіўна, што тут мірна суседнічаюць манастыры і мячэці. Дарэчы, Сана сказала, што ў іх з Альё родзе 16 змешаных шлюбаў.

І вось нашы 10 начэй і 9 дзён у Чарнагорыі скончыліся, і мы адправіліся ў адваротны шлях, дзе нас чакала яшчэ адна незабыўная сустрэча. Спыніцца ў Трансільваніі мы вырашылі, калі афармлялі транзітную візу ў румынскім пасольстве. Там убачылі рэкламны праспект пра самую прыгожую ў Еўропе горную дарогу, пачулі ад іншых людзей захопленыя водгукі пра замкі і краявіды горнай Румыніі. Тады нам яшчэ хацелася неяк кампенсаваць няўдалую спробу наведаць гэтым летам Заходнюю Еўропу, мы яшчэ не ведалі, што аўтамабільнай вандроўкі ў Чарнагорыю нам будзе цалкам дастаткова, каб ні пра што не шкадаваць і быць перапоўненымі ўражаннямі. Аднак гатэлі ўжо былі забраніраваны, маршрут складзены, сілы і грошы яшчэ заставаліся, і мы адправіліся па слядах графа Дракулы.

Горны серпанцін у Чарнагорыі і Сербіі не ідзе ні ў якое параўнанне з дарогамі ў самым сэрцы Румыніі. Аднак мы ўжо прызвычаіліся і амаль не здзіўляліся ні «поршэ», якія праносіліся на вялікай хуткасці, ні фурам, бакавыя колы якіх на адным з паваротаў саслізгвалі ў водаадводныя каналы... Нас вельмі ўразіў замак XIV стагоддзя ў Бране і досыць малады замак Пелеш пад Сінаем, ды і сам гатычны Брашоў, у якім мы спыніліся, зачараваў, аднак Румынія для нас — гэта, у першую чаргу, Іаана і Марыус з іх цудоўным домам і садам.

Некалькі гадоў таму гэтыя маладыя людзі, узяўшы вялікі крэдыт, пабудавалі на ўскраіне горада ўласны невялікі гатэль. Атрымаўся не проста гатэль, але ўвасабленне самых прыгожых мар. Усё ў гэтым доме зроблена з любоўю і густам: ад драўляных паліц у ванным пакоі да дзіцячай пляцоўкі з унікальнымі арэлямі-конікам.

Але галоўнае не гэта. Яны забылі папярэдзіць сайт па браніраванні гатэляў пра тое, што самі ў апошнія дні жніўня збіраюцца адпачыць з дзецьмі-школьнікамі і ўжо замовілі пакоі ў Грэцыі, калі атрымалі ад нас заяўку. Каб не псаваць сваю рэпутацыю, яны вырашылі нас прыняць. Мы былі ў гэты час адзінымі іх гасцямі, і з'язджалі яны амаль адначасова з намі. Тым не менш, яны сустрэлі нас так, быццам мы — першыя і самыя дарагія іх госці. Я сапраўды некаторы час думала, што іх гатэль толькі адкрыўся і мы — першыя. Яны кармілі нас шыкоўнымі сняданкамі з добрага дзясятка хатніх страў, частавалі ўласнай ракіяй, дзеля большага камфорту прапанавалі замест аднаго нумара — два, за тую ж цану... У дарогу сабралі пакет з пячывам і яблыкамі.

Вось так, з любоўю у сэрцы, мы вярталіся ў сваю Беларусь. Камп'ютар на машыне паказаў, што мы праехалі 4540 км, сярэдняя хуткасць — 52 км/г, сярэдні расход паліва — 6,9 л/100 км, час у дарозе — 86 гадзін, або 7 дзён. Нас ніводнага разу не аштрафавалі дарожныя паліцэйскія, хаця аднойчы ў Чарнагорыі спыніліся за перавышэнне хуткасці на 22 км/г і чамусьці, паглядзеўшы дакументы, адпусцілі. Мы 8 разоў перасеклі межы розных краін, прайшлі 16 памежных кардонаў і толькі двойчы патрапілі там у чэргі. Мы яшчэ не палічылі, у колькі грошай нам абышлася паездка — галоўнае, хапіла тых, на якія мы разлічвалі. Затое фотаздымкаў мы прывезлі дакладна больш за 8 тысяч. Усе яшчэ не пераглядзелі.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

■ Песню бярыце з сабой

ЗАЯЧЫ ДОМ

Максім Танк успрымаецца найперш як паэт-трыбун, паэт-філосаф, разважлівы лірык. Але ж ён напісаў шмат твораў для дзяцей. Для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў пісьменнік выдаў шэраг кніг вершаў і казак. Сярод іх — «Галінка і верабей» (1946), «Казка пра мядзведзя» (1947), «Сярод лясоў прынёманскіх» (1951), «Ехаў казачнік Бай» (1955), «Казкі. Легенды» (1960), «Светлячок» (1970), «Лемантар» (1943) і іншыя.

Фальклорная вобразнасць паэтычных тэкстаў, іх арганічная сувязь з народнымі традыцыямі прыцягнулі ўвагу кампазітара Уладзіміра Будніка, у творчасці якога адлюстраваліся нацыянальныя адметнасці духоўнай культуры.

Гэта таленавітая перададзена ў песні «Заячы дом». Яе выконваюць не толькі дзіцячыя хоры. Гумарыстычным настроем, лёгкай іроніяй яна падабаецца моладзі і дарослым і весела, нават забаўна гучыць у сямейным коле.

ВЕРШ МАКСІМА ТАНКА
МУЗЫКА УЛАДЗІМІРА БУДНІКА



Пад ракітавым кустом
Заяц збудаваў свой дом.
Ну і майстра, ну і дом —
Вецер ходзіць там кругом.

Вокны мохам залажыў,
Дзверы шышкамі прыкрыў.
Ну і заячы палац —
Лес наўкол з яго відаць!

2 р.
ПРЫПЕЎ:
Каб ад сцюжы не сканаць,
Мусіць заяц ноч скакаць.
Ну і заяц, ну і дом
Пад ракітавым кустом!

Зверху дом накрыўся сам
Нейкім папаратнікам.
Ну і цёплая страха —
Не заснеш без кажуха.

А калі заснеш зімой,
Дык завеяю ліхой
Забярэцца ў дом мароз,
Прабярэ цябе наскрозь.

2 р.
ПРЫПЕЎ.

Падрыхтаваў
Міхась ШАВЫРКІН

Бліжэў усход паходняй смелай,
Ў нямых аблогах ноч знікала.
Чыясьці свечка дагарэла,
Чыясьці толькі запалала.
А дзе ж мая? Я столькі свечак
Спаліў за доўгую дарогу.
Багаццем не намуліў плечы,
Не стаў галотай — дзякуй Богу!
Мо гэтак трэба — ўсе часіны
Жыцьмеў надзеяй чалавека...
Гараць сузор'і у вышынях
Адлюстраваннем нашых свечак.

ЧТПУП «Сфера Сервис групп розница»
ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО ЧТПУП «Сфера сервис групп розница»

№ лота	Наименование имущества	Начальная цена лота, без НДС, руб.	Задаток 10%, без НДС, руб.
1	2	3	4
1	Детектор валют PRO CL-16CPM	200 000	20 000
2	Фискальный регистратор «Гепард-НТС МФ»	1 162 500	116 250
3	Фискальный регистратор «Гепард-НТС МФ»	1 162 500	116 250
4	Фискальный регистратор «Гепард-НТС МФ»	1 162 500	116 250
5	Фискальный регистратор «Гепард-НТС МФ»	1 162 500	116 250
6	Денежный ящик CHD8000/8500	155 000	15 500
7	Денежный ящик CHD8000/8500	155 000	15 500
8	Денежный ящик CHD8000/8500	155 000	15 500
9	Денежный ящик CHD8000/8500	155 000	15 500
10	Сканер штрих	1 150 000	115 000
11	Сканер штрих	1 150 000	115 000
12	Сканер штрих	1 150 000	115 000
13	Сканер штрих	1 150 000	115 000
14	Сканер штрих-кода МК 9590	536 666	53 666
15	Сканер штрих-кода МК 9590	536 666	53 666
16	Информационный киоск Штрих-PriceChecker	766 666	76 666
17	ККМ POS-система «Штрих-TouchPOS» 355 с дисплеем покупателя	3 066 666	306 666
18	ККМ POS-система «Штрих-TouchPOS» 355 с дисплеем покупателя	3 066 666	306 666
19	ККМ POS-система «Штрих-TouchPOS» 355 с дисплеем покупателя	3 066 666	306 666
20	ККМ POS-система «Штрих-TouchPOS» 355 с дисплеем покупателя	3 066 666	306 666
21	Весы МК-15,2 TH21 эл.торговые	395 834	39 583
22	Весы с печатью этикетки LS2615E	2 375 000	237 500
23	Весы с печатью этикетки LS2615E	2 375 000	237 500
24	Весы с печатью этикетки LS2615E	2 375 000	237 500
25	Весы с печатью этикетки LS2615E	2 375 000	237 500
26	Весы с печатью этикетки LS2615E	2 375 000	237 500
27	Приборы приемно-контрольные охранно-пожарные ППКОП 063-8-5 «Аларм-5»	3 166 666	316 666
28	Стеллаж односторонний 2235x1000 Украина	554 051	55 405
29	Стеллаж односторонний 2235x1000 Украина	554 051	55 405
30	Стеллаж односторонний 2235x1000 Украина	554 051	55 405
31	Стеллаж односторонний 2235x1000 Украина	554 051	55 405
32	Стеллаж односторонний 2235x1000 Украина	554 051	55 405
33	Стеллаж односторонний 2235x1000 Украина	554 051	55 405
34	Стеллаж односторонний 2235x1000 Украина	554 051	55 405
35	Стеллаж односторонний 2235x1000 Украина	554 051	55 405
36	Стеллаж односторонний 2235x1000 Украина	554 051	55 405
37	Стеллаж односторонний 2235x1000 Украина	554 051	55 405
38	Стеллаж односторонний 2235x1000 Украина	554 051	55 405
39	Стеллаж односторонний 2235x1250 Украина	645 637	64 563
40	Стеллаж односторонний 2235x1250 Украина	645 637	64 563
41	Стеллаж односторонний 2235x1000 доп. нога Украина	627 164	62 716
42	Стеллаж односторонний 2235x1000 доп. нога Украина	627 164	62 716
43	Стеллаж односторонний 2235x1000 доп. нога Украина	627 164	62 716
44	Стеллаж односторонний 2235x1000 доп. нога Украина	627 164	62 716
45	Стеллаж односторонний 2235x1000 доп. нога Украина	627 164	62 716
46	Стеллаж односторонний 2235x1000 доп. нога Украина	627 164	62 716
47	Стеллаж хлебный 2235x1000 Украина	1 009 487	100 948
48	Стеллаж угловой внутренний 2235 Украина	477 932	47 793
49	Витрина холодильная торговая «180 П» ВС-0,76-3,8-1-4x (sv)	16 800 000	1 680 000
50	Витрина холодильная торговая «180 П» ВС-0,76-3,8-1-4x (sv)	16 800 000	1 680 000
51	Витрина холодильная торговая «180 П» ВС-0,76-3,8-1-4x (sv)	16 800 000	1 680 000
52	Витрина холодильная торговая «180 П» ВС-0,76-3,8-1-4x (sv)	16 800 000	1 680 000
53	Витрина холодильная торговая «120 П» ВС-0,52-2,6-1-4x (sv)	13 600 000	1 360 000
54	Витрина холодильная торговая «150» ВС-1,4-3,1-1-4x	12 800 000	1 280 000
55	Камера уличного наблюдения SCP-3430HP	12 675 900	1 267 590
56	Камера уличного наблюдения SCP-3430HP	12 675 900	1 267 590
57	Видеорегистратор SRD-1670 DP	29 336 000	2 933 600
58	Монитор SMT-2231P	5 259 334	525 933
59	Шкаф серверный TWT 21	1 212 500	121 250
60	Телекамера SCC-B5366P Германия	1 337 916	133 791
61	Телекамера SCC-B5366P Германия	1 337 916	133 791
62	Телекамера SCC-B5366P Германия	1 337 916	133 791
63	Телекамера SCC-B5366P Германия	1 337 916	133 791
64	Телекамера SCC-B5366P Германия	1 337 916	133 791
65	Телекамера SCC-B5366P Германия	1 337 916	133 791
66	Телекамера SCC-B5366P Германия	1 337 916	133 791
67	Телекамера SCC-B5366P Германия	1 337 916	133 791
68	Телекамера SCC-B5366P Германия	1 337 916	133 791
69	Телекамера SCC-B5366P Германия	1 337 916	133 791
70	Телекамера SCC-B5366P Германия	1 337 916	133 791
71	Телекамера SCC-B5366P Германия	1 337 916	133 791
72	Телекамера SCC-B5366P Германия	1 337 916	133 791
73	Телекамера SCC-B5366P Германия	1 337 916	133 791
74	Микрофон AV12	51 459	5 145
75	Микрофон AV12	51 459	5 145
76	Микрофон AV12	51 459	5 145
77	Контроллер SCC-1000P	3 008 000	300 800
78	Источник питания DR-60-12	149 784	14 978
79	Источник питания DR-60-12	149 784	14 978
80	Источник питания DR-60-12	149 784	14 978
81	Источник питания DR-60-12	149 784	14 978
82	Автомат ВА 47-29 с10	11 866	1 186
83	Передатчик видеосигнала	115 584	11 558
84	Передатчик видеосигнала	115 584	11 558
85	Радиостанция motorola, xtni с зарядным устройством, блоками питания, клипсой, аккумуляторной батареей, переходники для сети	1 078 250	107 825
86	Радиостанция motorola, xtni с зарядным устройством, блоками питания, клипсой, аккумуляторной батареей, переходники для сети	1 078 250	107 825
87	Радиостанция motorola, xtni с зарядным устройством, блоками питания, клипсой, аккумуляторной батареей, переходники для сети	1 078 250	107 825
88	Радиостанция motorola, xtni с зарядным устройством, блоками питания, клипсой, аккумуляторной батареей, переходники для сети	1 078 250	107 825
89	Радиостанция motorola, xtni с зарядным устройством, блоками питания, клипсой, аккумуляторной батареей, переходники для сети	1 078 250	107 825
90	Радиостанция motorola, xtni с зарядным устройством, блоками питания, клипсой, аккумуляторной батареей, переходники для сети	1 078 250	107 825
91	Радиостанция motorola, xtni с зарядным устройством, блоками питания, клипсой, аккумуляторной батареей, переходники для сети	1 078 250	107 825
92	Патч панель 24 юнита категории 5с	94 000	9 400
93	Полка перфорированная	104 000	10 400
94	Клавиатура acme	46 000	4 600
95	Клавиатура acme	46 000	4 600
96	Клавиатура acme	46 000	4 600
97	Клавиатура acme	46 000	4 600
98	Этикет-пистолет UNO	295 166	29 516
99	Этикет-пистолет UNO	295 166	29 516
100	Кассовый бокс с ящиком и турникетом в комплекте	942 495	94 249
101	Кассовый бокс с ящиком и турникетом в комплекте	942 495	94 249
102	Кассовый бокс с ящиком и турникетом в комплекте	942 495	94 249
103	Стол разделочный 60x60 из нерж. стали	368 874	36 887
104	Стол разделочный 60x60 из нерж. стали	368 874	36 887
105	Стол разделочный 60x100 из нерж. стали	476 863	47 686
106	Стол разделочный 60x100 из нерж. стали	476 863	47 686
107	Стол разделочный 60x100 из нерж. стали	476 863	47 686
108	Стол разделочный 60x100 из нерж. стали	476 863	47 686
109	Стол разделочный 60x80 из нерж. стали	424 472	42 447
110	Стол разделочный 60x120 из нерж. стали	531 392	53 139
111	Стол разделочный 60x130 из нерж. стали	558 122	55 812
112	Банета напольная в комплекте: нижняя полка с боковыми перегородками, 2 крышки для закрытия, стеллаж с 2-мя полками 105x193	2 466 840	246 684
113	Банета напольная в комплекте: нижняя полка с боковыми перегородками, 2 крышки для закрытия, стеллаж с 2-мя полками 105x193	2 466 840	246 684
114	Банета напольная в комплекте: нижняя полка с боковыми перегородками, 2 крышки для закрытия, стеллаж с 2-мя полками 105x193	2 466 840	246 684
115	Банета напольная в комплекте: нижняя полка с боковыми перегородками, 2 крышки для закрытия, стеллаж с 2-мя полками 105x193	2 466 840	246 684
116	Ограждения ОС ½ постоянной установки	781 375	78 137
117	Ограждения ОС ½ постоянной установки	781 375	78 137
118	Ограждения ОС ½ постоянной установки	781 375	78 137
119	Ограждения ОС ½ постоянной установки	781 375	78 137
120	Ограждения ОС ½ постоянной установки	781 375	78 137
121	Ограждения ОС ½ постоянной установки	781 375	78 137
122	Ограждения ОС ½-180x постоянной установки	1 187 500	118 750
123	Ограждения ОГ2-00-01	79 166	7 916
124	Ограждения ОГ2-00-01	79 166	7 916
125	Ограждения ОГ2-00-01	79 166	7 916
126	Ограждения ОГ2-00-01	79 166	7 916
127	Ограждения ОГ2-00-08	15 834	1 583
128	Ограждения ОГ2-00-08	15 834	1 583
129	Ограждения ОГ2-00-08	15 834	1 583
130	Ограждения ОГ2-00-08	15 834	1 583
131	Ограждения ОГ2-00-08	15 834	1 583
132	Ограждения ОГ2-00-08	15 834	1 583
133	Ограждение (ОС1) К11Т	2 375 000	237 500
134	Шкаф метал. для вещей покупателей 8 ячеек 570x500x1800	1 650 000	165 000
135	Шкаф метал. для вещей покупателей 8 ячеек 570x500x1800	1 650 000	165 000
136	Шкаф метал. для вещей покупателей 8 ячеек 570x500x1800	1 650 000	165 000
137	Шкаф метал. для вещей покупателей 8 ячеек 570x500x1800	1 650 000	165 000
138	Шкаф метал. для вещей покупателей 8 ячеек 570x500x1800	1 650 000	165 000
139	Шкаф метал. для вещей покупателей 8 ячеек 570x500x1800	1 650 000	165 000
140	Товарный стеллаж металич. 7 полок	1 633 334	163 333
141	Горка тов. метал. прикассовая для мелких товаров	766 666	76 666
142	Мойка из нерж. стали 3-секционная	2 530 000	253 000
143	Шкаф мет. для одежды 60x80x180	1 650 000	165 000
144	Шкаф мет. для одежды 60x50x180	1 650 000	165 000
145	Шкаф мет. для одежды 60x50x180	1 650 000	165 000
146	Шкаф мет. для одежды 60x50x180	1 650 000	165 000
147	Шкаф мет. для одежды 60x50x180	1 650 000	165 000
148	Шкаф мет. для одежды 60x50x180	1 650 000	165 000
149	Шкаф мет. для одежды 60x50x180	1 650 000	165 000
150	Шкаф мет. для одежды 60x50x180	1 650 000	165 000
151	Шкаф мет. для одежды 60x50x180	1 650 000	165 000
152	Шкаф мет. для одежды 60x50x180	1 650 000	165 000
153	Шкаф мет. для одежды 60x50x180	1 650 000	165 000
154	Стеллаж метал. 100x60x250 (7 полок)	735 000	73 500
155	Стеллаж метал. 100x60x250 (7 полок)	735 000	73 500
156	Стеллаж метал. 70x60x250	980 000	98 000
157	Шкаф-витрина для элитного алкоголя	2 300 000	230 000
158	Весы электронные ТВ-М-600.2-А3 (07531)	2 770 834	277 083
159	Стойки ОС1 в упаковке	766 666	76 666
160	Витрина холодильная торговая «180 П» ВВ-0,62-3,1-1-4x (sv)	17 600 000	1 760 000
161	Блок питания IEK ЯТП-0,25 220/24-2 УХЛ4 IP30	351 402	35 140
162	Щит электрический IEK 500x400x12	444 620	44 462
163	Комплект акустики 5,1 для домашнего кинотеатра Hardity SP-520	732 291	73 229
164	Коммутатор D-Link DES-1210-28	1 360 582	136 058
165	Кулер Hyperline TRFA-3F-RAL9004	1 121 055	112 105
166	Блок бесперебойного питания APC Back UPS ES 525	814 310	81 431
167	Блок бесперебойного питания APC Back UPS ES 525	814 310	81 431
168	Блок бесперебойного питания APC Back UPS ES 525	814 310	81 431
169	Блок бесперебойного питания APC Back UPS ES 525	814 310	81 431
170	Блок бесперебойного питания APC Back UPS ES 525	814 310	81 431
171	Блок бесперебойного питания APC Back UPS ES 525	814 310	81 431
172	Блок бесперебойного питания APC Back UPS ES 525	814 310	81 431
173	Блок бесперебойного питания APC Back UPS ES 525	814 310	81 431
174	Блок бесперебойного питания APC Back UPS ES 525	814 310	81 431
175	Системный блок: CORE I5 650/GA-PSSA/2xDDR3 2048/ HD 5450/DVD/2xHDD 500GB/ATX 500	2 967 000	296 700
176	Системный блок: INTREL CELERON DU-AL-CORE 3400/ASUS/G31 2048 DDR2/500 SATA/DVD/ATX 500W/KMP	2 284 666	228 466
177	Системный блок: INTREL CELERON DU-AL-CORE 3400/ASUS/G31 2048 DDR2/500 SATA/DVD/ATX 500W/KMP	2 284 666	228 466
178	Системный блок: INTREL CELERON DU-AL-CORE 3400/ASUS/G31 2048 DDR2/500 SATA/DVD/ATX 500W/KMP	2 284 666	228 466
179	Системный блок: INTREL CELERON DU-AL-CORE 3400/ASUS/G31 2048 DDR2/500 SATA/DVD/ATX 500W/KMP	2 284 666	228 466
180	Телефон Panasonic KX-TS2352RU	277 871	27 787
181	Телефон Panasonic KX-TS2352RU	277 871	27 787
182	Факс Panasonic KX-FT 988RU	1 238 763	123 876
183	Чайник электрический Rotex RKT71-G	198 720	19 872
184	Чайник электрический Rotex RKT71-G	198 720	19 872
185	Монитор Samsung E1920NW	986 693	98 669
186	Монитор Samsung E1920NW	986 693	98 669
187	Монитор Samsung E1920NW	986 693	98 669
188	Монитор LG Flatron W1943SS	878 955	87 895
189	Принтер Samsung ML-1865

Рубрыку вядзе Дунька ШЫП.

МІНІЯЦЮРЫ

Сяргей ЛАПЦЁНАК

Авечка і воўк

З класічнай ведаем літаратуры:
Воўк небяспечны у авечай шкуры.
Ды будзе болей небяспечна,
Як апранецца ў шкуру воўчую авечка.

Анатоль ЦЫРКУНОЎ

Не ў імені справа

Артысту, каб зрабіў кар'еру шпарка,
Змяніць імя параіла цыганка.
І вось Антон Антоніа назваўся,
Але як бездар быў, так і застаўся.

Міхась УЛАСЕНКА

Церушынкі

Прырода не спрыяе пустаце:
Там, дзе не сеюць, дык палын расце.

❑ ❑ ❑

Тры браты жывуць у згодзе:
П'яніца, гультай і злодзей.

❑ ❑ ❑

Сціплы праўду рэзаць мусіць,
А хто божыцца — той хлусіць.

Дзмітрый ДЗЕМІДОВІЧ

Найперш — цешча!

Каб нам жылося значна лепш,
Не рвалася, дзе тонка,
Любіце цешчу вы найперш —
І добрай стане жонка!

Малюнак Леаніда ГАДУНА.


Малюнак Андрэя ПУЧКАНЁВА.

Малюнак Паўла ГАРАДЦОВА.

З натуры

Трапілася мне аднойчы на вочы цікавае выданне пад назваю «Народны лячэбнік». Зацікавіла ж яно мяне тым, што на вокладцы буйнымі літарамі значылася: «Парада нумара: не блытайце гемарой з гаймарытам — гэта палепшыць ваша лячэнне». Я ўсміхнуўся і падумаў: «Відаць, маецца на ўвазе самалячэнне. Бо доктар гемарой ад гаймарыту адрозніць з ходу. Ды і сам чалавек усё ж адчувае, у якім месцы яму баліць...» Але дзеля цікаўнасці пачаў чытаць далей.

«Як вылечыць страўнік?» Сваімі парадамі дзеліцца мужчына, які памятае іх са слоў сваёй бабкі. Бабулі, на жаль, ужо даўно няма на гэтым свеце, але такім чынам яна лячыла ўсё наваколле і ніхто не скардзіўся. Вядома, каму ж тады было скардзіцца?.. Другі ж «лекар» раіць ужываць ад болю ў страўніку ракавыя шыйкі. Толькі ракаў трэба лавіць пад раніцу і абавязкова самак, інакш намаганні вылечыцца будуць марнымі. Праўда, не ўдакладняе, хвораму трэба лавіць самому ці можа дапамагчы нехта іншы? Метад, з дапамогай якога можна адрозніць самак ад самцоў, таксама чамусьці не называецца...

«Жадаеце пахудзець? Вельмі проста: калі п'яце — ужывайце адну гарэлку, без закускі...» Ага, а ў наступным нумары чытайце парады, як выйсці з запою.

«Ад грыпу засцерагае часнок. Дзве галоўкі нанач і тры раніцай. Можна заядаць іх хрэнам. Грып абыдзе вас бокам». Але, бокам вас абыдуць і ўсе родныя, калегі па працы, знаёмыя, сябры, прахожыя...

«Пры стрэсах і неўрозах дапамагае сырая бульба. Перад сном трэба пакласці на падаконнік у спальні абабраны клубень і назіраць, як ён чарнее. Гэта супакойвае». На мой густ, лепш той клубень пасмажыць і з'есці. Асабіста мяне смажаная бульба супакойвае на ўсю ноч.

«Пры спазмах стрававода на нервовай глебе рэкамендавана ўжываць вугаль драўнінны». Праўда, не ўдакладняецца, вугаль трэба растаўчы ці можна проста грызці галавешку?

«Умацаванню палавога стану ў мужчын садзейнічае абціранне халоднай вадой. Пажадана нанач і на адкрытым паветры». А цяпер, паважаныя мужчыны, уявіце сябе вечарам голым на вуліцы, з вядром вады і мачалкай у руках. Не ведаю, як гэта працэдура паўплывае на ваш палавы стан, але на сэксуальнага маньяка будзеце падобны на сто працэнтаў!..

Словам, не «Народны лячэбнік», а «Народны капуснік»! Тым не менш, я сумленна прачытаў усе сорак старонак «выратавальных» рэцэптаў, але так і не ўбачыў ніводнай парады звярнуцца да ўрача-спецыяліста. І гэта, дальбог, зусім не смешна...

Віталь ЖУРАЎСКІ,
г. Жодзіна.

КАБ І ХАЦЕЎ — НЕ ПРЫДУМАЕШ...

«У полі ў гэтыя дні працуюць трынаццаць трактароў, а таксама іншыя работнікі. Усе яны, занятыя на сяўбе, маюць магчымасць памыцца ў душы ў майстэрні».

«Бяром малако ад кожнай даяркі».

«Кідаюць пад ногі акуркі і залазяць у аўтобус, хоць побач стаіць урна».

(З заметак у газетах).

«Прашу аказаць дапамогу ў пошуку мабільнага тэлефона, які прапаў пры невядомых абставінах, калі знаходзіўся ў гасцях па адрасе: вуліца Першамайская, 7».

(З заявы ў міліцыю).

«Прадаецца казёл. Узрост адзін год, працаздольны».

(З аб'явы).

«Калі не выканаеце маё ўказанне, глядзіце на сябе!»

«Каток на стадыёне неабходна пачысціць ад снегу, паліваць рэгулярна, добра было б і заасфальтаваць».

(З выступленняў).

«Знішчылі дзесяць літраў самагонкі шляхам выпівання».

«Паступіла скарга ад грамадзянкі Іванавай аб тым, што муж сістэматычна б'ю па месцы пражывання, чым прычыняў жанчыне пабоі».

(З міліцэйскіх пратаколаў).

Даслаў Міхась СЛІВА,
г. Рагачоў.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. Ідэі, якія наведаюць вас на працягу ўсяго тыдня, варта адразу ж апрабаваць на практыцы. Дэталі набудуць першарадное значэнне — паспрабуйце надаваць ім належную ўвагу. У авантуры лепш не лезці і ў інтрыгах удзельнічаць не варта, усё гэта можа павярнуцца супраць вас. Свае думкі пажадана выкладаць лаканічна, а калі не будзе атрымлівацца, лепш адкласці важныя перамовы да наступнага тыдня.

ЦЯЛЕЦ. Для дасягнення жаданых вынікаў неабходна выкарыстоўваць такія якасці, як тактоўнасць, гнуткасць і ўменне ісці на разумны кампраміс. У гэтым выпадку вы з лёгкасцю пераадолееце ўсе перашкоды і апыняцеся пераможцам нават у самых гарачых бітвах. Не адмаўляйцеся ад магчымасці дапамагчы сябрам, бо ў найбліжэйшай будучыні можаце памяняцца ролямі, і аказацца ў залежнасці ад іх дапамогі.

БЛІЗНЯТЫ. З лёгкасцю вырашыце праблемы — і асабістыя, і працоўныя. Галоўнае — быць больш уважлівымі да новых ідэй, нават калі на першы погляд яны здаюцца абсурднымі. У сярэдзіне тыдня не варта займацца фінансавымі праблемамі, ім трэба даць выспець. Магчыма нечаканая, але своечасовая дапамога ад сваякоў.

РАК. Можа дабавіцца папяровай працы. Сілы будуць толькі на стваральныя мэты, так што разбурэннем займацца не варта. У першай палове тыдня будзе шмат сустрэч, зносін, тэлефонных званкоў і перамоў. Зможаце стаць пасярэднікам у важнай справе. Паспрабуйце не прымаць неабдуманых рашэнняў, прыслухоўвайцеся да голасу інтуіцыі.

ЛЕЎ. Чым менш амбіцый у кар'ерным пытанні вы праявіце, тым больш паспяховымі будуць дасягненні пры мінімальным выдатку сіл і нерваў. Давядзецца папрацаваць, але вынік акупіць расходаваныя сілы вельмі хутка. У суботу не рэкамендуецца займацца справамі, якія патрабуюць вялікай адказнасці і засяроджанасці.

ДЗЕВА. Магчыма, што на гэтым тыдні вы патраціце вялікую частку збераженняў на падарункі блізкім людзям, але затое якую радасць атрымаеце ад гэтага самі, бачачы шчаслівыя твары! Паспрабуйце прывесці думкі і пачуцці ў парадак. Гэта ўдалы перыяд для наладжвання стрэчаных сувязяў, якія спатрэбяцца ў найбліжэйшай будучыні. Не забывайцеся пра сяброў і далёкіх сваякоў, пажадана аднавіць разарваныя адносіны і з імі.

ШАЛІ. Можа паступіць інфармацыя, якая паўплывае на вашы кар'ерныя планы. Будзеце поўныя сіл і энергіі, праца закіпіць у руках. Серада можа аказацца не самым прыемным днём тыдня, вашы стройныя і паслядоўныя планы будуць парушаны. У чацвер усё зменіцца да лепшага, гэты дзень можна назваць днём выканання жаданняў.

СКАРПІЁН. Практычнасць і вытрыманасць — вось якасці, якія прывядуць да поспеху. Можаце пазнаёміцца з чалавекам, які адыграе важную ролю ў вашай далейшай кар'еры. Паспрабуйце ўлавіць вецер перамен, каб па максімуме скарыстацца спрыяльнымі магчымасцямі. Не турбуйцеся з нагоды дробных непрыемнасцяў на працы. Вашы ідэі перспектыўныя. Хай сённяшняе іх непрыманне вас не бянтэжыць, гэта пытанне часу — хутка яны будуць прыняты на ўра. Ваша схільнасць усё разабіць як мага хутчэй — пахвальная, аднак на гэтым тыдні варта памятаць, што найбольш хуткі спосаб рашэння праблемы — далёка не заўсёды самы лепшы.

СТРАЛЕЦ. Праявіце такія якасці, як рашучасць, актыўнасць і дзелавітасць, і не застаняцеся незаўважанымі. Аказвайце падтрымку толькі тым, хто для вас сапраўды важны і цікавы, паспрабуйце не распыляць сваю энергію і часавыя рэсурсы. Паспрабуйце быць уважлівымі і паблажлівымі да блізкіх людзей, прабачце ім іх маленькія недахопы і слабасці і не крыўдзіце іх.

КАЗЯРОГ. Не самы ўдалы перыяд для шырокай дэманстрацыі сваіх амбіцый. Самаўпэўненасць таксама можа аказацца лішняй, на грані самаўлюбёнасці. Не будзьце празмерна патрабавальнымі да навакольных. Паспрабуйце пазбягаць перанапружання на працы, яна, як вядома, не воўк — у лес не ўцячэ.

ВАДАЛЕЙ. Выдатны час для выканання даследчых і падрыхтоўчых работ. Самы час выкарыстоўваць сваю дзелавую хватку, падмацаваўшы дзеянні інфармаванасцю і надзейнымі сувязямі. Толькі не перашчыруйце, узяўшы ініцыятыву ў свае рукі і дыктуючы ўласныя правілы гульні, вы можаце лёгка перайсці межы дапушчальнага.

РЫБЫ. Поспех залежыць ад таго, наколькі прыемным у зносінах чалавекам вы сябе пакажаце. Паклапаціцеся пра тое, каб навакольным было спакойна і добра побач з вамі. Нічога асаблівага для гэтага рабіць не давядзецца: толькі пастаўцеся ўважліва да чужых настрояў. Спрыяльны перыяд і для кар'ернага росту, таксама з'явіцца магчымасць палепшыць сваё матэрыяльнае становішча.

Даты — Падзеі — Людзі

1929 год — нарадзіўся (Мінск) Кашкурэвіч Арлен (Арсен) Міхайлавіч, беларускі графік. Народны мастак Беларусі (1991), заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1973). У 1959-69 гадах выкладаў у Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце. Творы выкананы ў розных складаных графічных тэхніках (афорт, літаграфія, малюнак пяром). Сярод станковых работ вылучаюцца серыі «Партызаны», «Купаліяна» (за абедзве — Дзяржаўная прэмія Беларусі, 1972 год), «Блакада», «Святыя зямлі Беларускай» і іншыя. Аўтар ілюстрацый да выданняў «Курган» Я. Купалы, «Дзікае паляванне караля Стаха» і «Каласы пад сярпом тваім» У. Караткевіча, «Фаўст» І. Гётэ, «Авадзень» Э. Войніч і інш.



1890 год — нарадзілася Агата Крысці, каралева дэтэктыва, стваральніца двух славутых персанажаў — Эркюля Пуаро і міс Марпл. Пераспрабаваўшы ўсе заняткі на свеце і набыўшы сусветную славу, Агата Крысці ўсё ж працягвала пісаць у анкетнай графе «род заняткаў» — «замужняя дама», лічачы гэта самым дакладным адказам. Абсалютна шчаслівая, яна жадала ўсім жанчынам адказваць на гэтае пытанне такім жа чынам.

1947 год — нарадзіўся (Давыд-Гарадок Столінскага раёна) Вячаслаў Міхайлавіч Капцэвіч, беларускі вучоны ў галіне парашковай металургіі, доктар тэхнічных навук (1990), прафесар (1998). Аўтар навуковых прац па тэхналогіі стварэння порыстых матэрыялаў для фільтраў вадкасцяў і газаў метадамі парашковай металургіі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1980).

Было сказана

Адам МІЦКЕВІЧ (1798—1855), паэт, публіцыст:
«Наш самы высокі набытак: Айчына, навука, сумленне».

ТРАПІЎ ПАД ТРАМВАЙ І ВЫЖЫЎ

У Віцебску мужчына трапіў пад трамвай, які ехаў па вуліцы Гагарына. Інцыдэнт адбыўся а пятай гадзіне дня. Супрацоўнікі выратавальнай службы дасталі грамадзяніна з-пад трамвая. Потым высветлілася, што 30-гадовы пацярпелы знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення. З траўмамі рознай ступені цяжкасці ён быў шпіталізаваны.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

П А К А Ш Т У Й Ц Е !

Бульбяны рулет

Спатрэбіцца: *мука пшанічная — 1 шкл., бульба (сярэдняя вараная) — 3 шт., яйка (1 — у цеста; 1— для змазкі) — 2 шт., філе курынае (у начынку, варанае) — 500 гр., грыбы ў начынку (шампіньёны ці лясныя) — 500 гр., сыр сметанковы (у начынку) — 200 гр, цыбуля рэпчатая (у начынку) — 1 шт., часнок (у начынку) — 1 зуб., соль, алей.*

Грыбы рэжам і абсмажваем са здробненай цыбуляй і надзёртым на дробнай тарцы часнаком. Адваранае курынае філе таксама рэжам на дробныя кавалачкі. Злучаем грыбы, курыцу і сыр.

Вараную бульбу надзіраем на буйнай тарцы. Дадаём прасеяную муку, соль і яйка. Вымешваем цеста. Тонка раскочваем на пергаменце. На цеста выкладваем начынку і згортваем рулет. Вільготнымі рукамі падгінаем краі рулета ўсярэдзіну.

Выкладваем у форму, засланую пергаментам і змазаную алеем. Узбіваем яйка і змазваем рулет. Выпякаем у разагрэтай на 180 градусаў духоўцы 40 хвілін.

«Зімовая радасць»

Памідоры — 1,5 кг, перац балгарскі — 1,5 кг, цыбуля рэпчатая — 1 кг, морква — 1 кг, алей — 500 мл, цукар — 400 г, соль — 100 г, воцат (9%) — 50 мл.

Смак салаты моцна залежыць ад таго, як нарэзаны яе кампаненты. Цыбулю рэжам тонкімі паўкольцамі. Перац наразаем доўгімі, не вельмі шырокімі лустачкамі. Перцы лепш браць рознакаляровыя, каб салата атрымалася «вясёлая». Моркву надзіраем на буйнай тарцы ці на камбайне. Памідоры рэжам лустачкамі. Памідоры браць лепш мясістыя. Калі памідоры вадзяністыя, яны «растваряюцца» ў салаце і даюць вельмі шмат вадкасці. На дно вялікай каструлі наліваем алей, кладзем моркву, цыбулю і перац.

Насыпаем цукар і соль. Усё змешваем, даводзім да кіпення і варым 5-7 хвілін. Дадаем памідоры і воцат. Ізноў даводзім да кіпення і варым яшчэ 5-7 хвілін.

Раскладваем у стэрыльныя слоікі, закатваем, пераварочваем, ахутваем і пакідаем на ноч. Атрымліваецца 4-4,5 літра.

-2878-

Д Р У Г О Е Ж Ы Ц Ц Ё

Быў світар

У кожным гардэробе ёсць трыкатажныя рэчы, якія ўжо знасіліся, выйшлі з моды, а можа быць, проста надакучылі. Не выкідайце іх! Паглядзіце, што можна зрабіць са старога світара.

ВАРЫЯНТ 1. Нам спатрэбіцца стары світар і ўжо гатовая падушка. Выстрыгаем з пярэдняга і задняга палатна прастакутнік па памеры падушкі, пакідаючы 2 см на швы. Адзін з бакоў робім на 10-15 см даўжэй. Апрацоўваем краі. Сшываем прастакутнікі разам, як навалачку.

На адным боку робім петлі, на другім прышываем гузічкі. Устаўляем падушку. Гатова!

ВАРЫЯНТ 2. Блакітны світар да пераробкі.



А гэта пасля.
Зазірнем унутр.

Р А П Т А М С П А Т Р Э Б І Ц Ц А

Духмяная сумесь для каміна

Калі ў вашым доме ці на дачы ёсць камін, вам абавязкова варта выкарыстоўваць гэту ідэю. Спатрэбіцца невялікі ліст абгортачнай паперы — 16х20 см. Насыпце на яго высушаныя апельсінавыя лупіны, гваздзіку, карычныя палачкі, аніс ці сасновыя шышкі з размарынам. Змяшайце, зрабіце кулёчак і кіньце сумесь у падпалены камін. Водар у пакоі будзе ўзбуджальны.

-2879-

НОЧ «МАЛЕНЬКІХ ВАМПІРАЎ»

Такое мерапрыемства чакаецца 15 верасня ў Мінску. У 20.30 усе ахвотныя могуць прыйсці ў сталічны парк імя Горкага на экскурсію, прымеркаваную да Года кажана ў Беларусі, даведацца больш пра жыццё гэтых таемных істот, непасрэдна паназіраць за імі, а таксама пабачыць спецыяльную ультрагукавую тэхніку, з дапамогай якой можна вывучаць жыццё і паводзіны кажаноў. Такая ўвага да гэтых млекакормячых невыпадковая.

— Сёння пра кажаноў большасці людзей амаль нічога невядома, нягледзячы на тое, што гэтыя жывёлы складаюць 25 працэнтаў ад усёй фаўны Беларусі. Ва ўсім свеце зараз налічваецца больш за тысячу відаў кажаноў, у нашай краіне жыве 18 відаў. Усе, што сустракаюцца, напрыклад, у Еўропе, знаходзяцца пад аховай з-за пагрозы знікнення. У нас такая праблема таксама існуе, — расказаў карэспандэнту «Звязды» супрацоўнік навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па біярэсурсах Аляксей Шпак.

Ёсць шмат стэрэатыпаў, якія ідуць з даўніх часоў і прымушаюць успрымаць кажаноў як шкоднікаў. Напрыклад, нібыта яны — «вампіры», альбо разносяць розныя хваробы. Стэрэатыпы нараджаюць у людзей негатыўнае стаўленне. Праз яго калоніі кажаноў усё часцей знікаюць. Таксама шкодзіць крылатым начным жыхарам і вялікая колькасць пестыцыдаў, што выкарыстоўваюцца пры апрацоўцы палёў. Шкодныя рэчывы назапашваюць у сабе спачатку насякомыя, а пасля і кажаны, якія імі харчуюцца. Яшчэ вялікую ролю ў знікненні кажаноў адыгрывае тое, што становіцца ўсё меней месцаў, дзе яны могуць сяліцца, а таксама нізкая пладавітасць гэтых жывёл. За год самка нараджае толькі аднаго ці двух нашчадкаў.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	6.43	19.25	12.42
Віцебск	6.32	19.16	12.44
Магілёў	6.33	19.15	12.42
Гомель	6.31	19.11	12.40
Гродна	6.58	19.40	12.42
Брэст	7.00	19.40	12.40

Месяц

Маладзік 16 верасня.
Месяц у сузор'і Дзевы.

Імяніны

Пр. *Ксеніі, Багдана, Васіля, Германа, Івана, Мікалая, Міхала, Уладзіміра.*
К. *Альбіны, Кацярыны, Марыі, Мікіты.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА +15..+17°С	КІЕЎ +17..+19°С	РЫГА +16..+18°С
ВІЛЬНЮС +15..+17°С	МАСКВА +15..+17°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ +14..+16°С

УСМІХНЕМСЯ

Бландзінку будуць апытваць на дэтэктары хлусні. Папярэдне тлумачаць:

— Кажаш праўду — загараецца зялёная лямпачка, кажаш няпраўду — загараецца чырвоная. Усё зразумела?

— Зразумела.

Загарэлася чырвоная лямпачка.

— Знаёмцеся — гэта Даша! Учора мы з ёй таемна распісаліся і таму зараз яна будзе жыць з намі, у нашай кватэры. Але не хвалюйцеся, яна не п'е, не курыць і наогул сціплая, добрая і гаспадарлівая дзяўчынка!

— Добра, з ёй усё зразумела, а ты хто такі?

Мяркуючы па тым, як гарадскія ўлады «вырашаюць» праблему затораў на дарогах, з аўтаўладальнікаў ужо сёння можна браць дадатковы падатак на нерухомасць.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 26.130. Індэкс 63850. Зак. № 4150.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 14 верасня 2012 года.